*Язэп Квач*

# Квачы Квачамі



Жукоўшчына
2017

**Квач Я. – Квачы Квачамі.– Жукоўшчына, 2017 г.–104 с.**

*Аўтар распавядае пра сваю родную вёску Квачы, што на Глыбоччыне, у якой ён нарадзіўся і правёў першыя сямнаццаць гадоў свайго жыцця. У кнізе распавядаецца пра жыццё вяскоўцаў, іх быт, пра дзіцячыя забавы, цікавых людзей. Прачытаць гэты твор будзе карысна ўсім, хто цікавіцца краязнаўствам, беларускай гісторыяй, культурай, традыцыямі, адным словам, усім БЕЛАРУСАМ.*

**Падрыхтоўка да друку** Зміцер Лупач
На першай старонцы змешчаны малюнак
Язэпа Драздовіча “Пунькі”
Наклад 50 асобнікаў

# *Прадмова*

*Гэту сваю кнігу прысвячаю Роднай Зямлі, што ўзгадавала, усім землякам-квачоўцам, тым, што жывуць у роднай вёсцы і тым, што адышлі навечна. Тое, што ўвабраў у дзяцінстве з малаком маці, чым і побач з кім жыў, назаўсёды застаецца ў памяці. Ад нараджэння да заканчэння школы – усяго нейкіх сямнаццаць гадоў, але яны найлепшыя, самыя незабыўныя і хвалюючыя. Дома ты пазнаеш і адкрываеш свет, людзей і сябе між імі, выходзіш за парог бацькоўскай хаты ў нязведаны, не заўсёды прыветны да цябе свет, дзе ты сам ужо мусіш прабіваць сабе дарогу, бясконца шукаць сваё прызванне, рабіць выбар паміж дабром і злом, каб напрыканцы ізноў вярнуцца да родных вытокаў і навекі паяднацца з усім родным. Толькі не будзе ўжо ў гэтым паяднанні зямных турбот і клопатаў, а толькі вечныя цішыня і спакой.*

*Я прадставіў Квачы сваім бачаннем падзей і людзей, што тут жылі і жывуць зараз. Калі, можа, у каго закрадзецца на мяне крыўда, то наперад прашу прабачэння. Калі што і ёсць, то гэта не злая насмешка, а сяброўскі гумар ці жарт. Я хачу, каб праз гэту кнігу Квачы адчулі духоўную еднасць паміж сабой. Усе мы розныя, але наша адзінства дае незвычайны феномен, што завецца Квачы. Беражыце сябе, мае родныя! Толькі разам, мы – Квачы, мы – вялікая сіла!*

# Квачы Квачамі

У дзяцінстве ў мяне не ўзнікала ніякай асацыяцыі з тым, што азначае наша прозвішча Квач. Квач і Квач, таксама, як у суседзяў, напрыклад, Аблам, Рудак, Барыла або Радзевіч. Пра тое, што слова гэта азначае нейкае мазіла, з дапамогай якога мажуць дзёгцем калёсы, я даведаўся значна пазней. У нас слова ”квач” у гэтым значэнні ніколі не ўжываецца. А яшчэ пазней, калі я стаў вывучаць нямецкую мову, то даведаўся, што там гэта слова азначае “глупства”. Канечне, для мяне маё прозвішча ніколі не гучала абразліва. Яшчэ пра маіх аднавяскоўцаў жыхары іншых вёсак гаварылі: “Квачы Квачамі”. А вось для жонкі… Яна паходзіць з Украіны. І калі радня даведалася, якое ў яе будзе прозвішча пасля замужжа, то ўсе “круцілі насамі”. Там гэта слова і сёння ўжываецца ў сваім першародным значэнні. Вось што пра нашу вёску Квачы, а заадно і пра прозвішча, гаворыцца ў “Кароткім тапанімічным слоўніку Беларусі” Жучкевіча. Квачи – сс. Глубокского, Ивьевского и Несвижского районов. Название – кличка: квач – вздор, сплетня, болтун. В топонимии слово восходит к фамилии, указанной для Белоруссии ещё в 16-17 вв.” Знайшоўшы гэтыя звесткі, быў прыемна здзіўлены, што вёсак з такой назвай у Беларусі шмат . Хацелася б пазнаёміцца з іх жыхарамі. А тое, што прозвішча ўпамінаецца ажно ў 16 стагоддзі, дало надзею для далейшых пошукаў. А вось наконт назвы – мянушкі ніколі не пагаджуся з аўтарам. Хай сабе будзе і мазіла для дзёгця, але ўсё ж патрэбная рэч, чым нейкае там “глупства” або “балбатун”.

# Першыя ўспаміны

Кажуць, што дзіця памятае тое, што адбывалася з ім і вакол яго дзесьці з чатырох год. Свае чатыры гады я памятаю вельмі добра. А тое, што было мне тады менавіта чатыры, падцвярджае так бы мовіць дакументальная падзея. На другім канцы вёскі памёр Хвэлічка, і мая бабка ўзяла мяне разам з сабой на пахаванне. У наш час развітацца з памерлым прыходзілі, напэўна, большасць аднавяскоўцаў, а пра старых, то і казаць нечага. Для мяне ў той час гэта была першая і такая жудасная падзея. Смерць была нечым не толькі неверагодна страшным, а і такім, што ніяк не ўкладвалася ў дзіцячай галаве. У маім разуменні, чалавек нарадзіўся і павінен жыць вечна. Як гэта магло не стаць мяне? Вакол знікне ўсё, увесь свет, застанецца толькі цемра. І вось, ужо калі мне было каля пяцідзесяці, я неяк запытаў у мамы, калі памёр Хвэлічка. Яна сказала, што вельмі даўно, і я, пэўна, з некім блытаю. Але надмагільны крыж расставіў ўсё па месцах. На ім час пахавання 1969 год. Тады мне не было і чатырох, бо памятаю, што была сярэдзіна вясны, а я нарадзіўся ў верасні. Але гэта было пазней, а помніцца яшчэ ранейшае.

Раніца. Толькі развідняецца, па хаце чырвань ад узыходзячага сонца. Мама збіраецца ў калгас на работу. Нехта па яе заходзіцца, і яны, напэўна, пойдуць у ток сарціраваць лён, бо мне здаецца, што на двары позняя восень з добрым замаразкам.

І яшчэ: я адзін гуляю ў хаце, старэйшыя браты пайшлі ў школу. Бабка нешта кроіць па сваіх выкрайках, фастрыгуе і збіраецца шыць на сваім старэнькім “Singer”. Напэўна, гэта будзе новая блюзка. Я пазіраў ў акно. Там канец восені. Панадворак падмарозіла, выпала трошкі снегу.

На слівах сядзяць сытыя вераб'і і нешта падзёўбваюць, а можа, проста чысцяць свае дзюбкі. Мне аднаму маркотна, чакаю хлопцаў.

Прачынаюся раніцай, іду у тую хату, дзе бабка топіць печ. У агністым чэраве булькаюць катлы з бульбай для свіней, варыцца на абед капуста, пякуцца аладкі. Бабка дае мне адзін блін, усярэдзіну кладзе скварку, а сама зноў падмазвае кавалкам здору (нутраное сала) патэльню, налівае на яе ложкай цеста і ставіць на гарачае вуголле. Дзіўлюся, як у яе атрымліваюцца такія роўненькія, без наплываў бліны. Яна – майстрыха каля печы, ды і не толькі тут, а на ўсёй гаспадарцы, усё пад яе пільным вокам, усё зроблена ў час. Вось і тут яна спрытна выцягвае з печы на вілах паўтаравядзёрныя катлы. А каб было лягчэй, вілачнік коціцца па драўлянай качалцы. Бабка бярэ атымалкай кацёл, адцэджвае бульбу і нясе ў варыўню, а там хуценька сячэ яе секачом. Хуценька, каб не падгарэлі, чапялой дастае з печы патэльню з блінамі, далівае ў капусту вады і кідае туды свіную костку для навару. Для гэтага ў качарэжніку ў бабкі спецыяльная кансерка, што прымацавана дротам да палкі. Можна не выцягваць кацёл з печы, а даліць вады і ўкінуць мяса. І так кожны дзень каля печы, усё жыццё, мая дарагая бабка Міхаліна. А я з блінам іду дасыпаць. З'ядаю блін са скваркай, стараюся заснуць, але не атрымліваецца. На сцяне паказваюць "мульцік". Што гэта такое – не кожны і здагадаецца. Хата наша стаіць каля самага бальшака, каля асфальту, як мы яго завём. Калі ідуць машыны з уключанымі фарамі, праз вокны ў хату праходзіць святло, а перад вокнамі растуць дрэвы. І вось, прабіваючыся праз галінкі, святло пакідае на сцяне мудрагелістыя ўзоры. Калі машына яшчэ далёка, гэтыя ўзоры рухаюцца павольна, а калі блізка, то карцінкі бягуць па сцяне хутчэй. І так усю ноч. Пада мной скрыпіць

драўляны ложак, коліцца ў бок, прабіўшыся праз сяннік, цвёрдая саломіна. Але ў мяне ёсць універсальны сродак для засынання: я накрываюся “катусём”. ”Катуся” – гэта плюшавае паліто з рыжай поўстачкай, яно мне засталося ад братоў. Я заўсёды клаўся спаць, гладзіў яго, быццам кацяня, перабіраў у руцэ за край некалькі разоў і так засынаў.

А яшчэ раней, калі печ стаяла ў лепшай палове хаты, я ляжаў на ёй і глядзеў у столь. Запомніўся нейкі незвычайны узор з сучкоў на стыку габляваных дошак. Ён нечым нагадваў чалавека. І кожны раз, седзячы на печы, я стараўся адшукаць знаёмы ўзор. Печ перанеслі ў кухню, на гэтым чалавечку я затрымліваў сваю ўвагу ўсё менш і менш. Трэба паглядзець зараз, наколькі змянілася маё ўяўленне, і што ўбачу я там сёння.

# Чарцянё курносае

З перыяду жыцця да школы больш за ўсё помняцца першыя сябры. Мы іх не выбіралі, а выбіралі іх нам мамы. Чаму? Дзіцячых садкоў тады па ўсіх вёсках не было, і часам, каб мяне не пакінуць аднаго, мяне адводзілі гуляць да суседзяў. І сябравалі мы з дзецьмі тых, з чыімі бацькамі сябравалі нашы мамы. Я сябраваў з Абламавай Ясей. Гэта была мая равесніца. Я памятаю, як мы гулялі ў іх доме. Не памятаю, якія былі нашы забаўкі, напэўна, такія, як і ў іншых дзяцей. Але вось адзін выпадак прыгадваю і цяпер. Нам, мусіць, ужо ўсё добра надакучыла, і мы знайшлі сабе такі занятак. Мама мяне прывяла ў каляровым прыгожым шаліку. Напэўна, нас прывабіла вялікая разнастайнасць яго колераў, і мы не прыдумалі нічога другога, як сталі выцягваць з яго каляровыя ніткі. Выцягваліся яны не сказаць, што вельмі

лёгка, але, каб не Ясіна бабуля Аміля, то да прыходу маёй мамы ад шаліка мала чаго б засталося. Яся мне падабалася, і я яе па-дзіцячаму любіў. Яна была дзяўчына ідная, прыгожая, і мы неяк, нават не прызнаючыся адно аднаму ў каханні, лічылі пытанне нашай далейшай жаніцьбы вырашаным.

Тут мушу прывесці яшчэ адзін цікавы і кур’ёзны выпадак, які паказвае, наколькі неадэкватным можа быць у дзяцей светаўспрыманне. У нас дома быў першы том “Беларускай савецкай энцыклапедыі”. Напэўна, гэта мой старэйшы брат Толя не здаў кнігу ў бібліятэку. І мы пасвойму чыталі яе: разглядвалі ў ёй фотаздымкі. Спачатку нам дапамагалі дарослыя называць, што паказана на тых карцінках, а потым мы самі маглі хутка і беспамылкова называць малюнкі. І гэтыя малюнкі у нас, дзяцей, асацыіраваліся адпаведна з нашым светаўспрыманнем. Я добра памятаю, што ў падручніку па геаграфіі быў малюнак глобуса. Ён у мяне цвёрда значыў імя майго хроснага бацькі Клёфуса. А што тычыцца энцыклапедыі, то тут куды цікавей. Карцінак там – мора. І ёсць адна зусім не дзіцячая: расправа фашысцкіх акупантаў з савецкімі патрыётамі ў Мінску 26 кастрычніка 1941 года. На ёй немцы вешаюць дваіх юных падпольшчыкаў – хлопца і дзяўчыну. І вось я, паказваючы Ясі той фотаздымак, даў такі каментар: “І мы з табой, як будзем жаніцца, будзем таксама гэтак вешацца”. Мая сяброўка гэта ўспрыняла таксама, як і я. Для тых, хто не зразумеў, у чым прычына нашага такога “няправільнага” адзінства, тлумачу. Даўней, калі маладыя хацелі ўступіць у шлюб, яны мусілі зрабіць аб гэтым публічную заяву і павесіць яе ў людным месцы, або рабілася гэта ў касцёле. Усё гэта дзеля таго, каб выявіць, ці няма ў каго прэтэнзій да нарачоных. Пра маладых, што склалі заяву, казалі, што яны “павесіліся”.

Вось у якім "павешанні" мы былі з Ясей аднагалоснымі. Я зараз адшукаў тую кнігу. Усё, пра што я казаў, на здымку на ст.215 БСЭ т.1.

Яшчэ з часоў дзяцінства хачу ўспомніць адну прыпеўку – "Чарцянё курносае".

Яна мне не толькі падабалася, але і адпавядала майму характару. Тады я быў надзвычай смелы, рацівы (бойка гаварыў) – нікога не саромеўся, мог што хочаш сказаць і заспяваць. А яшчэ бацьку майго, Лявона, за вялікі гарбаты і зламаны нос дражнілі курносым. Не ведаю, хто мяне навучыў, можа, Геня Петрусёва, але добра памятаю, што спяваў я частушку Ясінай маме, калі тая прыйшла забіраць дачку дамоў.

*Мяне мамачка радзіла –*
*Думала харошае.*
*Развярцела, паглядзела –*
*Чарцянё курносае!*

Цёця Марыся толькі цешылася такім вясёлым "зяцем". З Ясей мы разлучыліся, калі яна пераехала жыць у Глыбокае. Хаця ўсе канікулы і лета яна праводзіла ў Квачах у бабулі з дзедам, якога ўсе дзеці звалі не Янка, а Аблам, па прозвішчы, мы з ёй аддаляліся адзін ад аднаго ўсё далей і далей. Цяпер Яся ўжо даўно не Яся, а Ніна. І хоць жыве яна ў Глыбокім, але мы не бачыліся ўжо год трыццаць. Не гледзячы на гады, я ўпэўнены, што пры сустрэчы адразу пазнаю сваё першае дзіцячае каханне.

З гэтага перыяду свайго жыцця не магу не прыгадаць брата маёй бабкі Рацька Пятра. Ён жыў у Гулідаве. З вайны вярнуўся інвалідам. Недзе наступіў на міну, і яму адарвала нагу да калена. Я памятаю, як ён кульгаў і скрыпеў сваім пратэзам. Дзед Пётра быў настолькі стары, што я яго ўжо потым лёгка вылучаў сярод старэйшых "польскіх кавалераў", накшталт Янэчыка. А выдавала яго найперш

мова. Цяпер я ведаю, што гэта была тарашкевіца. Мне, малому, тады дзіўнымі здаваліся такія яго словы, як “Амэрыка”, “пэнсія”, “бэнзын”. Дзе гэтаму вучыўся дзед Пётра, я не ведаю. Адметным быў ён таму, што з-за свайго калецтва заўсёды перамяшчаўся на інвалідным аўто. За сваё жыццё з’ездзіў Пятрусь, як мы ўсе яго называлі, напэўна, не менш за пяць “інвалідак”. Пражыў 94 гады, а нарадзіўся ў 1892 годзе. Мне запомнілася яго першая машына, такая, як капна сена, на якой ездзілі героі “Аперацыі “Ы”. Дык вось на гэтай сваёй “капне” ён аб’ехаў, як кажуць, і Крым і Рым. Прыязджаў і да нас у госці, катаў дзяцей, вазіў да сябе ў Гулідава. І часам нават на добрым падпітку спраўна давозіў пасажыраў да месца прызначэння. У Петруся была надзвычай добрая памяць. Памятаю, як ён расказваў бабулі сваю гісторыю. Казаў, калі быў малы, прыходзіла цыганка-варажбітка і па даце нараджэння прадказала яму лёс, або, як ён казаў, “планэту”. Яна наваражыла, што будзе век яго доўгі, але цяжкія выпадуць два гады, і назвала іх. І ўсё спраўдзілася: па першай даце ён страціў свае зубы. Дзесьці піў ля калодзежа з драўлянага вядра нагбом ваду, а нейкі дурань ударыў па вядры нечым цяжкім. Я памятаю, што хадзіў дзед Пётра заўсёды з “ляпкай” і праз тое меў адметны акцэнт. А другі цяжкі год – гэта, калі ён страціў нагу. І пражыў дзед дай Божа кожнаму. Вось і не вер пасля гэтага ў астралагічныя прагнозы!

Яшчэ ў гэты час якраз каля нашай хаты будавалі новую дарогу Полацк-Вільнюс. Яна перасекла вёску Квачы і праходзіла за метраў 20 ад нашага дома.

Казалі, што ў час “халоднай вайны” яе планавалі выкарыстаць падчас канфлікту як узлётную паласу для самалётаў. Мой бацька – адзін з першых трактарыстаў. Якраз тады ён працаваў у дарожнай арганізацыі, адзін

час на скрэперы, а адзін час на аўтагрэйдары. Часам на грэйдары браў і мяне пакатацца. Але казаў, што я больш аднаго круга не вытрымліваў і засынаў. Што засынаў, я не памятаю. Затое адзін выпадак на ўсё жыццё адбіўся ў маёй памяці.

Неяк я ехаў з бацькам, ён правіў грэйдарам і рабіў сваю работу, а я корпаўся ў яго скрыначцы з рознымі гаечкамі. Адна спадабалася (цяпер усведамляю, што гэта быў каўпачок, які накручваецца на залатніковы вентыль ад кола), гуляў я з ім, гуляў і ўкінуў у нейкую адтуліну у кабіне. Баяўся, хаця б тата не заўважыў і каб не сапсаваць тым самым грэйдар. Але, на шчасце, усё абышлося добра. І яшчэ з гэтага перыяду хачу прыгадаць адну падзею. Аб ёй расказваў мне бацька. Тады працаваў ён на прычапным скрэперы. У яго быў трактар “ЭС-100”, і да яго прычэплены скрэпер. Ім можна, дзе трэба на дарозе, зняць грунт, перавезці на другое месца і высыпаць. І вось у вёсцы здарылася няшчасце. У Чэсікавай Олі нехта з дзяцей (а было іх ў сям’і сямёра) зусім недалёка ад будынка падпаліў стог з сенам ці саломай. І здарылася б бяда. Але ці нехта бацьку сказаў, ці з дарогі ён пабачыў гэта сам. Чарпануў зямлі ў коўш, развярнуў гарачы стог і засыпаў яго зямлёй. На шчасце, сам трактар не загарэўся. Не хвалюся, але бацька наш быў адважны і не адзін раз рызыкаваў сабой, ды Бог яго мілаваў, і ён выходзіў сухім з вады, часам, праўда, добра падрапаны.

Успамінаюцца хрэсьбіны маіх дваюрных сясцёр – дачок дзядзькі Клёфуса і цёткі Монькі. Збіралася добрая бяседа. Шмат радні было ў дзядзькі, прыехалі і цётчыны родзічы з Шуневічаў, Падгаяў. І кожнаму тут была свая радасць: нам, дзецям, смачна паласавацца, мужыкам, хто хацеў, уволю насцябацца, каб аж “у квашаніне заснуць”, жанчынам пагаварыць з роднымі аб набалелым,

патанчыць, пасняваць. Для гэтага заводзілі дзедаў патэфон. Адна баба Анэта не цешылася папаўненню ў сям'і. Казала: “О, зрабілі…смачна, а мне няньчы.” Успамінаю Янэчкавага Юзіка. Ён, як і бацька, меў замашкі “галантнага кавалера”, ліха ўскідваў рукою ўверх свае валасы і запрашаў жанчын у танцы. Ніколі не мінаў такіх баляў Владзюк. Гэта брат нашага дзеда Ігналі. Лайдак быў заядлы, але мы яго ўспаміналі дабром, бо калі ішоў з магазіна, то, акрамя віна, купляў нам, дзецям, цукеркі. А яшчэ ў яго была мянушка Гайдук. Не ведаю, адкуль па бацькавай лініі гайдукі, але калі нарадзіўся я, трэці сын у сям'і, на пытанне суседкі: “А хто ж там у Вырусі радзіўся?” бабка Міхаліна незадаволена кінула: ”Трэці гайдук!” Часцяком пасля такой або іншай выпіўкі Владзюк мог заначаваць і ў нас дома. Што там яму снілася, па якім балоце яго чэрці вадзілі, я не ведаю, але якіх толькі слоў ад яго нельга было пачуць… Даставалася ўсім, і ў першую чаргу яго Мальвінцы.

А яшчэ, як толькі адужвала вясна, мы часцей за ўсё з бабкай ішлі па шчаўе. І калі па шчаўе, то вядома куды: да бабы Фэлі. Было яшчэ шчаўе і каля Улімы, але то вельмі далёка, за кіламетры тры, а гэта ўсяго за нейкі кіламетр, але і то для маіх малых ног было вялікае выпрабаванне. Пры мне баба Фэля ўжо перасялялася ў вёску са свайго хутара, але яшчэ стаялі нейкія будынкі, часам мы бачылі там і гаспадыню. Адметным было тое, што на сядзібе рос дуб і на ім гняздзіліся буслы. Даўно не стала бабы ”Хевы”, як яе называлі ўнучкі, адракліся ад сядзібы і буслы, але памяць цвёрда трымае нейдзе ў сваіх закутках цудоўны ўспамін пра паход з бабкай у шчаўе да бабы Фэлі.

# Наш правадыр

Зусім бесклапотнае дзяцінства незаўважна прайшло. Трэба было рыхтавацца да школы. У Квачах была пачатковая школа. На той час, калі я пайшоў у першы клас, у ёй працавалі дзве настаўніцы: Соф'я Міхайлаўна Харужонак і Паліна Казіміраўна. Акрамя Квачоў, першую чвэрць 1972 года, калі я пайшоў у школу, у нас займаліся і дзеці з Канстанцінава. Потым пабудавалі школу ў Карабах, і яны пайшлі ў новую школу. А мы, Квачы, засталіся адны з нашай Соф'яй Міхайлаўнай.

Я добра памятаю той дзень, калі мы ўпершыню прыйшлі на падрыхтоўку. Я кажу мы, бо на той час быў неразлучны са сваёй сяброўкай Ясей. Вяла нас да школы мама. Ішлі мы ў школу ў добрым настроі, радаваліся новаму. Але па-сапраўднаму радаваліся не мы. Насустрач нам са школы ішлі дзеці, для якіх вучэбны год скончыўся. І сярод іх старэйшы на год мой сусед Антусь. З яго радасць так і пёрла. Параўняўшыся разам з намі, ён высока падкінуў сумку, не памятаю, ці злавіў, і голасна крыкнуў: "Ура!" На наша пытанне, у чым прычына такой радасці, ён адказаў: "Школа закончылася! Канікулы!" І хуценька паспяшаў дамоў. Гэта была нармальная рэакцыя вучня, вучоба для якога не прыносіла вялікага задавальнення, і ён неяк датрываў да канца свой першы клас.

Мы ж адразу расселіся за партамі і пачалі знаёміцца. Я, зразумела, сядзеў з Ясей. Кожны называў сваё імя і прозвішча. Прычым не так, як былі запісаны ў метрыках, а як нас называлі дома. Натуральна, што я назваўся не Іосіфам, а Зютакам. Я быў вельмі здзіўлены, калі Яся назвала аж тры свае імёны: Яся, Ніна і Яніна. А так было ўсё звычайна: мы вучыліся пісаць палачкі і кручкі, нешта малявалі, гулялі, слухалі, аб чым распавядала

настаўніца.

Памятаю, як мы вярталіся дамоў і нас пераняла Марыся Маскалёва. Жартуючы, яна сказала: ”Першачкі-дурачкі пішуць палачкі, кручкі.”

Першай лінейкі не памятаю. Для мяне пачатак вучобы пачаўся з таго, што я не ўпадабаў школьную перакуску. На першы час нам у школе давалі папіць чаю, кампоту або кісялю з пячэннем. Гатавала нам наша ўборшчыца цёця Стася з Драздовых. І вось першы раз нам давалі кісель, ён быў не салодкі, і вада як бы нечым аддавала. Я праз сілу з ім ледзь справіўся. На другі дзень, каб не паўтараць над сабой такую экзекуцыю, я перад раздачай вышмыгнуў са школы і перачакаў абед пад школьным ганкам (прыступкі былі высокія, і пад імі можна было схавацца). І якое ж было маё расчараванне, калі сябры сказалі, што сёння давалі добры чай. Дзесьці ў другім класе сталі ўжо нас карміць лепш, а менавіта кожны дзень нам усё тая ж цёця Стася варыла то булён (суп), то малочнае. А для гэтага настаўніца кожнаму з дому загадала прынесці фарфоравую талерку і лыжку. І яшчэ пры нас было адно новаўвядзенне. На фізкультуру настаўніца сказала прынесці кеды, і каб яны былі ў торбачцы. Бабка мне пашыла торбачку з нейкага чырвонага кавалка матэрыі, і на фізкультуру мы ўжо пераабуваліся. Калі нас стала вучыць адна Соф’я Ігнацьеўна, то мы вучыліся ў дзве змены. На другую змену прыходзілі пасля двух урокаў. Не ведаю, як яна, бедная, з намі спраўлялася. Але іншага мы тады і не ўяўлялі. Канечне ж, настаўніцу слухаліся ўсе бездакорна. Другая справа, што некаму ў адно вуха ўлятала, а праз другое вылятала. Я памятаю добра ўсіх тых, хто разам са мной вучыліся на той час у Квачоўскай пачатковай школе. У трох класах вучыўся 21 квачоўскі вучань:

1 клас – Квач Міша, Квач Зютак, Пачкоўскі Эдзік,

Кабылінскі Сашка, Радзевіч Генка, Барыла Антаніна, Барыла Вінусь.

2 клас – Кабылінскі Антусь, Ермаковіч Эдзік, Ермаковіч Гуця, Маскалёнак Дануся, Барыла Оля.

3 клас – Квач Лёлька, Пачкоўская Лёлька, Квач Лена, Квач Тадзік, Рудак Марына, Барыла Каця, Кабылінская Люда, Маскалёнак Геня, Квач Алёна, Харужонак Тамара.

Перад другой зменай мы звычайна прыходзілі заранння і бавілі свой час так: гулялі на спартыўнай пляцоўцы ў футбол, бегалі, дапамагалі цётцы Стасі пілаваць дровы, таўкліся ў калідоры, калі было холадна. Настаўніца запрашала нас у клас, давала чытаць казкі і г.д. На перапынках, калі было цёпла, усе выбягалі гуляць на спартыўную пляцоўку, якраз у 1972 годзе паставілі новыя драўляныя спартыўныя снарады. Тут была палка, па якой можна было лазіць, як па канаце. А вось бум я запомніў добра. І не толькі таму, што ўсім хацелася па ім прайсці, і не толькі прайсці, але і скінуць таго, хто ідзе табе насустрач. І вось мне насустрач ішла Пачкоўская Лёлька, упэўненая ў сабе, старэйшая на два гады, у прыгожай новай школьнай форме, але малая. І як сталі мы з ёй тузацца, то я парваў ёй беленькі пярэднік. Яна заплакала і пабегла жаліцца настаўніцы. Я чакаў расплаты, якая не прымусіла сябе доўга чакаць. Яна была ў асобе Тадзіка, Лёльчынага аднакласніка, адзінага хлопца, які вылучаўся між нас ростам і сілай, хадзіў паміж сваіх дзевак, як певень між курэй. І вось ён, нібы паліцэйскі, за руку прыцягнуў мяне ў настаўніцкую. На маё здзіўленне, усё скончылася не так і страшна. Настаўніца мяне трохі паўшчувала ды і адпусціла. Горш было тое, што са мной вучыўся Лёльчын брат Эдзік. Ідучы ў школу, я заходзіўся да яго, бо нам весялей было ісці разам. Пасля гэтага зда-

рэння я стаў захадзіцца па Эдзіка мо праз які месяц, бо баяўся яшчэ і маці Лёлькі за сапсаванае адзенне. Але яны мне даравалі і нават не ўпікнулі за гэта ніколі. Разумелі, што гэта дзеці.

Дарэчы, пра дарогу ў школу і са школы. Амаль заўсёды гэта было цэлае падарожжа. Ішлі мы звычайна напрасткі: праз двор Броńкі Анцюцінага (у яго быў добры сабакаВаўчок), каля катлавана, праз калгасны двор каля канюшні, за хлевам ля Зымона, праз лужок і выхадзілі на вуліцу, што ўжо каля Калюся Фэлічкавага і Маскалёнкаў. А па дарозе ж трэба было перамераць усе лужы і гурбы, каля катлавана патрасціся па дрыгве, і каб яна цябе не засмактала, зайсціся да дубоў і набраць там у сумку жалудоў. Ды і яшчэ колькі ўсяго нечаканага чакала нас тады на такой далёкай на той час дарозе да школы. А са школы ішлі яшчэ вальней: спяшацца не было куды. Біліся ў снежкі, штурхаліся. Асабліва цікавы занятак быў, калі ўжо выпадала досыць снегу. Хлопцы прасілі ў калгаснага конюха Юзафкі вялікія конскія сані. Мы каталіся на іх з горкі за канюшняй. Хаця гара была і не высокая, але добра расслізганая, і, разагнаўшы сані, мы ўскоквалі на іх і каціліся даволі далёка, падмінаючы пад сябе лазовае кустоўе.

Пісалі мы, як я памятаю, тры чвэрці першага года чарнільнымі ручкамі. На старых школьных партах яшчэ былі прадугледжаны выемкі для чарніла, калі раней пісалі пяром. З чарнілам было гора. Ручкі то лілі, то шкраблі, то пакідалі пасля сябе кляксы ў сшытках ды на руках. Дапамагала бібула (прамакачка). А апошнюю чвэрць ужо пісалі шарыкавымі ручкамі. О, тады гэта быў прагрэс!

Успамінаю школьныя мерапрыемствы. І перш за ўсё ёлку. Рыхтаваліся сур’ёзна і доўга. Плялі рознакаляровыя ланцужкі, клеілі фанарыкі для ўпрыгожвання, рыхтавалі

нумары самадзейнасці. Помню, ставілі сцэнку пра рэпку. Дык мы перад гэтым, можа, тыдзень усё фарбавалі яе, некалькі разоў выразаную з кардона. Дзед Мароз заўсёды была цётка Стася, яна ж старалася (прыносіла) і ёлку. На свята набівалася бацькоў цэлая школа. Свята праходзіла весела для нас і для іх. Яшчэ заўсёды быў адметны адзін вясенні дзень, калі мы добраўпарадкоўвалі тэрыторыю: прыбіралі, ускапвалі градкі, садзілі кветкі. Часам рабілі экскурсіі ў лес у грыбы, а адзін раз былі нават на Гулідаўскім возеры. З якой бы вялікай ці малой вандроўкі мы не вярталіся – заўсёды прыносілі з сабой прыродны матэрыял для нашых будучых падзелак. Гэта былі шышкі, жалуды, розныя галінкі, лісточкі. Потым мы з іх майстравалі качак, буслоў, вожыкаў. Рабілі розныя кампазіцыі, дабаўляючы вырабы з пластыліну, і яны захоўваліся на палічках. У спецыяльнай шафе месцілася бібліятэка, адкуль мы бралі для сябе чытаць кнігі.

У першым класе перад “Акцябарскімі” нас урачыста прынялі ў акцябраты і прычапілі зорачкі з малым Валодзем (Леніным). А ўжо ў трэцім класе прынялі ў піянеры. Гальштукі нам завязалі ў дзень нараджэння ўсё таго ж куміра абалваненага ім народа. Хаця абалваненыя, напэўна, былі і не ўсе, бо старыя жылі пры розных уладах і ведалі ім цану. А вось з нас, школьнікаў, ляпілі, што хацелі. І мы гэта ўбіралі ў сябе, як губка. І што атрымлівалі на выхадзе? Прывяду звычайны і тыповы эпізод са школьнага жыцця. Мы яшчэ ў першым класе і палітычна непадкаваныя, а напярэдадні Акцябарскіх настаўніца “выхоўвае” нас і адначасова правярае, на што здатны яе выхаванцы. І вось яна задае пытанне: “Хто такі Ленін?” Старэйшыя вучні падымаюць рукі. Але больш за ўсё пнецца і стараецца Антусь. Ён так трасе сваёй рукой, што дацягваецца амаль што не да самага

настаўніцкага стала. Ён задаволены, што ў адрозненні ад іншых прадметаў можа хоць тут сябе праявіць і горда адказвае: “Ленін – гэта наш правадыр!” “Сядай, маладзец, правільна,” – кажа задаволеная настаўніца. Задаволены і наш Антусь, што хоць тут ён не даў маху. І гэта Антусь, які не вызначаўся ні па якіх-небудзь прадметах, ды і тое мякка сказана. Затое асноўнае ён засвоіў: хто наш правадыр, і хто вядзе нас наперад да лепшага жыцця. А потым засвоілі гэта і мы, маладзейшыя, і не толькі гэта. Засвоілі і тое, хто наш вораг, хто гатоў парушыць наша мірнае жыццё. Тады ўжо ў пачатковай школе нам “увялі ў вушы”, што наш галоўны вораг – капіталізм на чале з Амерыкай, што нашы ворагі валодаюць страшнай ядзернай зброяй. І яны гатовы яе прымяніць у любы момант. Мы добра ўсведамлялі, што пасля ўзрыву ядзернай бомбы на небе расце грыб, усё гарыць і рушыцца, гінуць людзі і ўсё жывое. І, ведаючы гэта, я памятаю, што быў такі перыяд, калі я не мог падоўгу начамі заснуць. Мне ўсё сніліся жахі ядзернага канца свету. А тады ж так хацелася жыць, гуляць, расці і радавацца жыццю! А ўсё гэта пад пагрозай ядзернага грыба.

І ўсё ж, нягледзячы, як кажуць, на перакосы ў Наркампросе, у Квачоўскай школе ўсе мы атрымлівалі першыя веды, пазнавалі свет і сябе разам з дарагой нашай настаўніцай Соф’яй Міхайлаўнай. Родам яна была з Верацей. Тут жа вучылася і яе дачка Тамара. Пасля была ў Квачах яшчэ нейкая настаўніца, але школа ўжо праіснавала нядоўга. Пасля яе зусім разабралі. З’ехала ў свае Верацеі і наша першая настаўніца. Праз многа часу, можа ў 2000 годзе, я, калі быў у мамы, рашыў наведаць Соф’ю Ігнацьеўну. Неяк дабраўся па вясеннім бездарожжы да Верацеяў. Мяне там чакала расчараванне, бо не знайшоў ні сваёй першай настаўніцы, ні нават яе магілы.

Сустрэчны мужчына расказаў мне, што тая паехала да дачкі некуды ў Расію. Дачка была геолагам, маці там памерла і пахаваная.

# Юрачка

Напэўна, кожны з нашага пакалення памятае, якія тады былі цацкі: пластмасавыя звяркі, лялькі, жалезныя машыны. Плюшавых цацак у наш час не было. Затое былі тады яшчэ гумавыя цацкі-пішчалкі. Націснеш на яе – і праз адтуліну, у якую ўстаўлены свісток, выходзіць паветра, і цацка пішчыць. Была і ў нас дома такая цацка. Не памятаю, каму з нас траіх яе куплялі, але мне яна яшчэ дасталася спраўнай і добра пішчала. Гэта быў цудоўны ружовы хлопчык у сіненькай шапачцы. Звалі мы яго "Юрачка". І назва гэта вельмі сімвалічная. Якое ў той час было наша найвялікшае дасягненне, пра што гаварыла радыё, і пісалі газеты? Першы, хто паляцеў у космас, быў савецкі чалавек Юрый Гагарын. І да такога ідэала павінны былі імкнуцца падрастаючыя камсамольцы, піянеры, акцябраты і дашкаляты. Вось таму і мая першая цацка звалася "Юрачка".

Да нас у госці даволі часта прыязджалі мая матулька, цётка Гунэфа, яна ж маміна сястра, са сваім мужам дзядзькам Юзафам. Жылі яны за восем кіламетраў у Пятровічах і наведвалі нас, тым больш, што яшчэ жыла цёткі Гунэфы мама, мая бабка Міхалінка. Мы заўсёды чакалі гасцей, бо цётка Гунэфа заўсёды прывозіла нам, дзецям, пачастункі. Не менш яе чакаў і бацька, бо ў стол яна прывозіла добрага свайго закальцу (моцнай самагонкі). Дзядзька Юзаф піў слаба, толькі прыгубляў, а бацьку гэта было на руку. А бачылі б вы, як ён моршчыўся і крыўляўся пасля кожнай чаркі, ну няйначай піў палын або жоўць. Хто не ведаў, то

сказаў бы, што вось дзе пакутуе чалавек, так яна яму не ідзе, брыдкая. Во камадыян быў, бо любіў жа гэту заразу, як ніхто! І вось памятаю, як цётка Гунэфа расказвала ў нас дома свой сон. Яна прысніла мяне ў незвычайным адзенні і казала: ”Быў ён укручаны ў нешта, як касмыль (касманаўт), і на галаве, як шлём.”

Бабка з мамай адразу “разабралі” (разгадалі) гэты сон. Яны сказалі, што сон гэты добры, што, як Гагарын, і я павінен стаць нейкім важным чалавекам. Ці памятаюць мае блізкія пра гэта прароцтва? Наўрад, бо я дажыў да пяцідзесяці, ужо займеў унукаў, загруз у віры паўсядзённых спраў і не падаў ім ніякай надзеі на іх высокія спадзяванні пра свайго “Юрачку”. А мой дзіцячы “Юрачка” з цягам часу парваўся і быў выкінуты на сметнік, патрапіў у гной, а з ім на поле за хлеў, дзе мы заўсёды садзілі бульбу. І кожны год ён то заворваўся, то адкопваўся і ўсё трапляў мне на вочы датуль, пакуль я быў дома. Пакінуўшы родны дом, я пра яго амаль не згадваў. І вось зараз ён са мной, як дарагі дзіцячы ўспамін, і не толькі. Ён пазірае на мяне блакітнымі даверлівымі вочкамі і як бы нагадвае: “Калі не апраўдаў высокіх спадзяванняў, дык хоць у жыцці простага чалавека рабі Божы выбар на сваім жыццёвым шляху.”

# Аэліта

Дакладна памятаю, я яшчэ тады не хадзіў у школу, як ў нас з’явіўся тэлевізар. Бадай, адзін з першых ва ўсёй вёсцы. У нашым канцы то дакладна, бо першыя часы збіралася шмат суседзяў паглядзець на блакітны экран. А з’явіўся ён у нас неяк ранняй вясной. Бацька цягнуў яго на спіне аж з Карабоў, бо толькі туды даехаў на папутцы. А бабка ўсё выпраўляла

мяне на асфальт паглядзець, ці не ідзе бацька. І я яго заўважыў аж пад самымі Карабамі. Так мне тады здавалася. Тэлевізар быў невялічкі, яшчэ першых выпускаў. Называўся ён "Аэліта". Пакуль наладзілі антэну, у сяле тады не было спецыялістаў, і дапамагаў нейкі Шчасны з Гінек. Запомнілася першае кіно. Яно было пра Леніна. Як бы Ленін ішоў з чайнікам, і нейкі чырвонаармеец папрасіў у яго вару. І Ленін, вядома ж, "добрая душа" падзяліўся з простым салдатам. А мог бы, як у тым анекдоце, і "паслаць падальшэ".

Бабы асабліва любілі "кіны" любоўныя, а мы, дзеці, і мужыкі – ваенныя. Самы лепшы баявік для нас, канечне ж, быў "Чатыры танкісты і сабака". Яшчэ ўсе вельмі любілі глядзець "Збянтэжанага Саўку." І я таксама. П’еса ішла не доўга, і я пытаў, а ці будзе яшчэ працяг. На гэта мне старэйшыя казалі: "Заўтра другая серыя, называецца "Раз’юшаны Саўка". І я верыў, што ёсць Саўка яшчэ і раз’юшаны, хаця так і не пабачыў яго на экране, а толькі спрабаваў яго паказаць ужо дарослы, выконваючы пастаноўку разам з Лонскай Тамарай.

Азіраючыся з цяперашняга часу, хачу зазначыць, што тэлеперадачы тады былі вельмі ідэалагізаваныя, наскрозь прасякнутыя камуністычнымі мітамі. Гэта бясспрэчны мінус. Але фільмы былі пра дабро, пра перамогу яго над злом, пра высокія чалавечыя пачуцці, пра абавязак чалавека, пра патрыятызм. Не было надаедлівай рэкламы і бясконцых шоу – праграм з крыўляннямі, з пахабнымі жартамі ды насмешкамі.

# Школа ў Тумашах і Карабах

Пра вучобу ў Тумашах і Карабах я магу меркаваць толькі па ўспамінах маіх старэйшых братоў. Да Тумашаў было ад нас кіламетраў каля пяці. Хадзілі заўсёды пешшу. Ні пра якія аўтобусы тады не было і мовы. Уявіце, якая была добрая фіззарадка кожны дзень. Якраз гэтым часам будавалі нашу шашу (асфальт), і гэта давала магчымасць хаця не боўтацца па гразі. Затое на асфальце хапала смалы, і я памятаю паліто старэйшага брата Толі, крысо ў якім было ўкулэгана (запэцкана) ў смалу.

Калі пабудавалі новую школу ў Карабах, то лягчэй не стала, як, дарэчы, і бліжэй таксама. А асабліва, што ісці трэба было па бездарожжы, дзе гразі не было толькі летам і зімой. А начамі ж яшчэ і цёмна! І я памятаю, як старэйшыя з вечара майстравалі з анучак факел, замочвалі на ноч яго ў керасін і назаўтра з ім, нібы з паходняй, цугам валакліся па бездаражы, выбіраючы сушэйшую сцяжынку. А яшчэ ж трэба было пераходзіць рэчку. Трэба было зрабіць кладку. Для гэтага мужыкі адзін дзень сабраліся талакой. Вацюк на трактары прыцягнуў з лесу два доўгія яловыя бервяны, і па іх зладзілі пераправу. Пасля арганізавалі падвоз дзяцей да школы на калгаснай лятучцы. І рамантыкі начных паходаў не стала.

# Ваўкоўская школа

Пасля Квачоў у нас было права выбіраць паміж дзвюма школамі: паміж Ваўкоўскай і Карабоўскай. Ваўкоўская была за шэсць кіламетраў, Карабоўская дзесьці за чатыры з паловай, і там была толькі васьмігодка, у Ваўкі можна было дае-

хаць на маршрутных аўтобусах. У Карабы дабіраліся па-рознаму. Я выбраў Ваўкі. Нейкі час туды хадзілі і мае некаторыя аднакласнікі, але пасля яны пайшлі ў Карабы, Ваўкі ж закончыў я адзін. Тут было шмат новага і незвычайнага: і сама вялікая новая двухпавярховая школа, і аднакласнікі, і настаўнікі. Вучоба і тут у мяне ішла добра. З лёгкай падачы майго аднакласніка Кадушкевіча Юры мяне за старанную вучобу часам звалі “Леніным”. Тады гэта мяне вельмі не бянтэжыла. Закончыў я школу з залатым медалём.

Часта прыходзілася бываць у Паставах на спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, лыжах, біятлоне. Вышэйшым сваім дасягненнем лічу, калі, будучы ў восьмым класе, я выступаў за зборную школы, і мы занялі другое места па біятлоне.

Вучэбны працэс, напэўна, нічым не адрозніваўся ад іншых школ. Варта ўспомніць незвычайных настаўнікаў. Да іх можна аднесці фізіка, Асяненку Сцяпана Юльянавіча. Дарэчы, у 9 і 10 класах ён быў маім класным. Гэта стары, закаранелы халасцяк і гуляка, які нават мог дазволіць сабе і на ўроках бываць пад хмяльком. Тады сядзеў, запёршыся ў сваёй лабаранцкай, і стараўся не паказвацца на вочы дырэктару – Касяку Мяфодзію Уладзіміравічу, які вёў у нас нямецкую. Той быў строгі, яго баяліся ўсе, мог нават і па галаве настукаць непаслухмяным, і Сцяпана, канечне ж, ставіў на месца.

Цікавая была настаўніца геаграфіі Ніна Сцяпанаўна Храпавіцкая, або Старая, як мы яе называлі. Яна была з 1928 года, прайшла польскую школу, і часам мы чулі ад яе дзіўныя словы накшталт “кандуіт”, што азначала дзённік, “кает” або сшытак, “бібула” ці прамакашка і інш. Хаця па адукацыі яна была філолаг, але на геаграфіі была памешаная. І калі ў нейкім класе не было настаўніка, а ў яе

фортка, то яна ірвалася туды, слатой лезла і казала, што у нас вялікае адставанне. І кожны дзень ездзіла на аўтобусе аж за нейкія сорак кіламетраў, бо жыла ў Манькавічах.

Заняткі ў нас пачыналіся а дзевятай гадзіне, а мы ў школу прыязджалі дзесьці каля паловы восьмай. Памятаю, трэба было ўстаць каля паловы сёмай, апрануцца, паесці. Добра, што прыпынак аўтобуса быў каля самай хаты. Зімой, калі было холадна, то мы чакалі аўтобус у нашай лазні, што стаяла пры дарозе. Дзяўчаты ў цемнату да хлопцаў заходзіць баяліся, ды і накурвалі яны там здорава. Быў цікавы выпадак, зноў жа з маім суседам Антусём. Некуды па справах ехаў Януля Вінцучкоў і зайшоў таксама да нас ў лазню ад ветру. Зайшоў і закурыў. Прыляцеў Антусь, бачыць чырвоны аганёк і чуе прыемны пах.

– Мальцы, дайце закурыць!

Усе:

– Га-га-га!

А той:

– Ну х…я вы вы…..ся, дайця закурыць.

Януля таксама толькі пасмяяўся і мараль не чытаў.

У вольны час ў школе хто гуляў у тэніс, хто вучыў або спісваў дамашнія заданні, меншыя проста дурэлі і свавольнічалі, старэйшыя заігрывалі з дзяўчатамі. Нейкі час было распаўсюджана гуляць на грошы ў “клапа”. Ставілі кожны на кон некалькі капеек. Хто ставіў больш за ўсіх, той стараўся капейкай або якім ключом перавярнуць банк. Капейкі, якія перавярнуліся, забіраў , і так ішлі па крузе, пакуль не скончыцца банк. Часам, бывала, што на банку”зрэжысся” г.зн. нічога не перавернеш, тады за табой дабівалі наступныя. Вялікія грошы тут не круціліся, а дзесьці ў межах аднаго рубля. Гулялі, канечне, хаваючыся, бо настаўнікі за гэта ганялі.

Дамоў ехалі таксама аўтобусам. Бывала і такое, што

аўтобус не хадзіў. Тады ў школу можна было заехаць на 10.15, але патрапіш ужо на трэці ўрок, а можна было вярнуцца і пагуляць дома. У летні час ездзілі ў школу часам на веласіпедах, матацыклах. Горш было тады, калі не было аўтобуса дамоў. Трэба было або чакаць да шасці вечара, або ісці пехатой. Часам пад'язджалі на папутках.

Я хоць і быў прыкладным вучнем у школе, але мала чым адрозніваўся ад іншых на волі, адзінае – гэта тое, што я не курыў. А так нават адзін раз "забаставаў". Хадзіў я тады, можа, у клас дзявяты. Не пайшоў аўтобус, і я рашыў: трэба "забаставаць", хоць будзе што ўспомніць. Бабцы сказаў, што еду ў школу на лыжах, і накіраваўся паўз асфальт на Ваўкі. Потым звярнуў на Слясаршчыну, недзе на Стафанішыным хутары закапаў у снег сумку і паехаў катацца. Часу было і на Шыбільніцу з'ездзіць, пакатацца з гэтай гары і па кустах паганяць зайцоў. Дамоў прыехаў, як бы пасля заняткаў, ніхто нічога не западозрыў, і мне гэта вылазка сышла з рук.

Часам у школе бывалі і нязначныя бойкі, якія ўстанаўлівалі пэўную іерархію. Запомнілася адна з іх на аўтобусным прыпынку. На нас тады, падышоўшы, "наехалі" ваўкоўскія мясцовыя хлопцы. Сярод іх дакладна памятаю двух Мацяёнкаў, Алега і Янука, Філіповіча (Рыжага), Эдзіка Сварцэвіча, далучыўся да іх яшчэ задзірысты Турчыновіч з Хрыстова, або Турчок, як яго ўсе празывалі. У нас былі дакладна я (напэўна, у пятым класе), Сашка Кабылінскі, Антусь, Эдзік Ермаковіч (Белы), Паўлік Кабылінскі, нехта яшчэ. Мы адчувалі, што так не абыдзецца, але вельмі не пасавалі перад мясцовымі, бо на прыпынку быў Жэнька Машніч (Цімох) з Беляўцаў, які хадзіў ўжо ў дзясяты клас і адзін мог вырашыць усё. Першыя палезлі Ваўкі, мы таксама як адзін кінуліся ў бойку. Ну і давай тузацца ды лупіцца. І вось, калі мы ўжо

сталі здаваць, то Паўлік крыкнуў: “Цімох, умешвайся!” А той ані з месца. Толькі пасля мы здагадаліся, што ён баяўся старэйшых ваўкоўскіх хлопцаў, што яны яму гэтага ўмяшання не даруюць. Усё скончылася неяк хутка, як і пачалося, падышоў аўтобус, і мы такія гарачыя паехалі дамоў непераможаныя. Усё прайшло ўдала, не было ні ў каго нават крыві. Толькі пасля выхваляліся, хто пад чыю руку патрапіў і як удала адбіваліся.

Пасля пятага класа мяне хацелі адправіць летам у “Артэк”. Прыязджаў дамоў гаварыць з бацькамі дырэктар Бортнік. Але я, нідзе не быўшы да гэтага часу, не прамяняў сваю летнюю вольніцу ні на які “Артэк”.

Выпускныя з “сустрэчай усходу сонца” ў наш час ніхто не забараняў. А можа і дарэмна, бо кожны раз было чуваць, што нейдзе адбываліся трагедыі з выпускнікамі. То патонуць недзе, купаючыся п’яныя, то разаб’юца на матацыклах, то яшчэ што. Як звычайна, і ў нас выпускны быў ужо пасля ўручэння атэстатаў. Адзначалі яго ў Норыцы ў доме Сініцы Галі. Паднялі з Хрыстова і прывезлі нашага класнага Сцяпана. І вядома ж, з гарэлкай, з танцамі ў начным парку. Дзякаваць Богу, у нас прайшло без трагедый.

А вось выпускны пасля васьмі класаў, дзе вучыўся мой брат Коля Шавура, адзначылі больш запамінальна. На Колаўскім возеры яны так панапіваліся, што пасля Рослаў (Малец Расціслаў Вільгельмавіч) на сваёй машыне развозіў іх па дамах.

# Вясковы быт

Жылі ў мае гады на вёсцы па-простаму, як дазваляў прыбытак сям'і. А ён складаўся з палучкі, пенсій, нейкіх заробкаў за здадзенае малако або жывёлу.

Палучкі, асабліва ў калгасе на той час, скажам так, былі мізэрныя. Летам паляводы атрымоўвалі рублёў недзе 60, а зімой каля 30. Я памятаю гэта добра, бо перад палучкай на рукі даваў брыгадзір табель уліку. Звычайна даваў маёй маме, як самай "вушлай" (граматнай), да яе прыходзілі бабы і выпісвалі свае працадні. Часам гэту работу па просьбе выконвала мама, а то і я. Часта выхады былі "скручаны" (губляліся). Тады бабы ўказвалі на гэта брыгадзіру, і ён перадаваў на наступны месяц. Найбольшыя заробкі ў паляводстве былі на ільне. Яшчэ памятаю, калі памагаў маме ірваць лён уручную. Сотка тады каштавала адзін рубель. За дзень з мамай мы сотак пяць вырывалі і больш. Калі лён у калгасе даваў добры прыбытак, то давалі яшчэ за яго даплату на кожны зароблены ільняны рубель (льняныя).

Даяркі і цялятніцы ў калгасе атрымлівалі больш на адсоткаў 50. Аналагічна і механізатары. У час пільніцы (пасяўной ці ўборкі) і таго больш. Пенсіі былі зусім нікчэмныя. Памятаю, мая бабка атрымлівала спачатку 20 рублёў, а затым 28. Трэба адзначыць, што тады за такія грошы можна было купіць. Буханка хлеба каштавала 16 капеек, булка-вітушка – 25 капеек, пачак пячэння – 12, вафляў – 21-24, сто грамаў халвы – 12, кілаграм цукру – 70, солі – 6, мукі – 28, дзясятак яек – 80, кілаграм варанай каўбасы – 1р.65 к., кансервы рыбныя ў тамаце 33 кап., у алеі – 70 кап., кілаграм масла каля 3,5 руб., 0,5 літра алею 80 капеек, цукеркі-смактылі каля 1,5 руб., ша-

каладныя каля 3 рублёў, камса – 20 капеек, сялёдка 1,5–3 руб. за кг., рыба марская марожаная 50-70 капеек., касцюм мужчынскі 70-120 руб., білет на аўтобус у Глыбокае (13км) 20 капеек, мінскі матацыкл 400 рублёў, веласіпед 50 руб, бутылка віна (0.5 літра) каля 1,2 руб., бутылка гарэлкі 3,62 руб., літар бензіну 15-20 капеек, салярка 7 капеек і г. д.

Малако здавалі па 20 капеек, цялят і кароў у залежнасці ад укормленасці ад 1,6 да 2,5 руб., свініна была даражэй. Карабок запалак каштаваў 1 капейку, папяросы ад 10 да 28 капеек, махорка 6. Вось і мяркуйце, як можна было ў наш час шыкаваць на такія грошы, калі ў сям'і працавалі двое калгаснікаў, была якая-небудзь бабка-пенсіянерка і трое дзяцей. Неяк абходзіліся. Куплялі ў наш час толькі самае неабходнае з таго, што я пералічыў. Абыходзіліся сваім. Тут перш за ўсё гародніна: бульба, капуста, морква, агуркі, буракі, цыбуля, фасоль, боб. Кожная сям'я трымала курэй, свіней і, канечне ж, карміцельку-кароўку. Не было кароў, бадай, што толькі ў адзінокіх старых. На аснове ўсяго гэтага і складаўся наш рацыён харчавання. Раскажу, як было ў нас, дзе гаспадыняй ля печы, пакуль мы былі малыя, і мела сілу, была наша бабка Міхаліна. Памятаю, як яна яшчэ ўручную нажом шаткавала капусту і накладала яе поўную бочку, была бочка агуркоў, квашанага бацвіння. Яблыкі звычайна зімой захоўвалі на гарышчы ў мялінні, накрыўшы кажухамі.

Трэба засяродзіць увагу на мясных нарыхтоўках. Памятаю, нам вельмі хацелася дачакацца свежыны. Гэты час наступаў з надыходам халадоў. Калолі кабана або ў суботу, у выхадны, або вечарам, ці додня (вельмі рана), бо трэба было кожны дзень ісці на работу. Звычайна бацька калоў або з Клёфусам, або з Федзем. Я вельм баяўся свінячага піску і хаваў галаву ў падушку. Мужыкі,

спарадкаваўшы кабана, часталіся свежынай і абавязкова з выпіўкай. Бабка ў першы дзень перабірала кішкі, аддзяляла з іх кішкавое (тлушч, што быў ля кішок) і вымывала ўсе кішкі. Сала, як цяпер, у слоікі не складалі, а салілі вялікімі кускамі ў скрынцы з соллю. Косці салілі ў цабэраку і елі ўсю зіму. Кішкавы тлушчператаплівалі. А заставаліся ажэміры, на іх смажылі бульбу. Нутраное сала (здор) салілі, скручвалі і потым на працягу года кідалі ў капусту, рабілі з яго падмазку. Кумбякі засольвалі або ў солі, або ў расоле, дзе яны знаходзіліся да вясны. А затым на сонцы севярылі (падсушвалі) і вешалі на гарышчы. Асабліва цікава было рабіць кілбасы. Бабка нажом рэзала для іх мяса і сала, дапраўлялі і напіхалі спачатку пальцам праз рыла (адсюль і пальцам пханая кілбаса), потым ўжо былі і машынкі, на якія начынялі кішкі. Усё мяса ішло ў кілбасы, а па-гэтаму выкарыстоўвалі і тонкія кішкі, частку тоўстых, куток і нават мачавы пухір. Рабілі вантрабянку з лёгкіх, нырак, касы, печані, сала і дабаўлялі шмат цыбулі. Яе потым варылі ў капусце. Кілбасы потым крыпалі (вешалі на шост) і сушылі ля печы .

Цяпер пра вясковыя стравы і чым мы харчаваліся. Разнастайнасцю яны не вызначаліся. Калі, каму і з чаго іх было рабіць? Памятаю, што, калі я прыходзіў са школы, бабка даставала амаль заўсёды з печы вараную капусту, часам з косткай. Падабалася яна мне не вельмі, а, па праўдзе, надаела. Яшчэ адзін год усю зіму елі булён з гароху. У печы ён добра ўправаў, і страва была больш уежная і музычная, чым капуста. На ранак часцей за ўсё елі падсмажанае сала з яйкамі, мучныя бліны ці бліны драныя (з бульбы). Калі бліны ад ранку заставаліся, то іх ставілі ў каструлю у печ, заправіўшы салам і смятанай. Як упрэюць – вось было аб’ядзэнне, як казала бабка, цымус (смаката). Часам начынялі салам бульбяную дранку,

і яна даходзіла ў патэльні ў печы. Летам, памятаю, елі часцей за ўсё халаднік, крышаную і запраўленую смятанай цыбулю або агуркі. Часта пякліся сухары. У час паста заўсёды былі раўгеня, кісель з аўсянага хлоп'я, кіслы, запараны боб, камса, рыба або селядцы. На гарышчы на шасце віселі кілбасы і кумпякі, часам вэнджаныя, у скрынцы ляжала салёнае сала. І за гэтым мы самі лазілі і рабілі перакуску. Часам варылі квашаніну (халадзец), галубцы або пельмені. Ну і круглы год у розных відах елі бульбу, якая ніколі не прыядалася.

Небагата выглядаў і інтэр'ер хаты, якая часцей дзялілася на дзве паловы: кухню і залу, дзе была і агульная спальня. Сцены ў пакоях былі або паклееныя шпалерамі, або атынкаваныя, або абабітыя сухой шчыкатуркай (гіпсакардон). Ложкі былі жалезныя, са спружыннымі матрацамі. А я яшчэ спаў на драўляным з сеннікам, набітым саломай. Помню, калі яна саб'ецца, то мы з бабкай насыпалі матрац новай саломай, і на ім было спачату спаць вельмі высока, пакуль салома не саб'ецца. Звычайна ў зале стаяла яшчэ даўнейшая самаробная, памаляваная ўзорамі шафа, вісела люстэрка, на куце пад абразамі стол і некалькі крэслаў ды табурэтак. На кухні таксама стол, лава, услон для вёдзер з вадой, суднікі (палічкі для посуду). Амаль на паўхаты вялікая руская печ. У качарэжніку рознае начынне да печы. Яшчэ ўвосень у хату прыносілі калаўрот для прання, а раней і кросны, на якіх працавалі аж да вясны. Усё атапленне на кухні ад печы, а ў зале ад цаглянага, або кафельнага шчытка, або бляшанай трохпавярховай печкі.

Каля хаты ў кожнага былі гароды, дзе расло ўсё неабходнае. З гародніны звычайна нічога не куплялі, стараліся вырасціць усё сваё. Займалі гароды пару сотак, яшчэ столькі ж адводзілі пад сад. Усяго ў людзей было па 20-

30 сотак зямлі. Ільвіную долю, амаль усё, адводзілі пад бульбу. Елі яе і самі шмат, і яна была асноўным кормам для свіней.

Хлявы ва ўсіх былі невялікія, з праварынай (зыгарадкай) для кароў, хляўцом, часам з дзенніком (надворная зыгарадка) для свіней, куратнікам і асобнай адхожай (уборнай).

Лазні былі агульныя і тапіліся па-чорнаму. У нашай, напрыклад, мыліся тры сям'і: наша 6 чалавек, Вінцуські 4 чалавекі і дзедавы 8 чалавек. Спачатку нам, малым, даводзілася мыцца ў "бабскім батальёне", да мужчын мы пераходзілі ўжо недзе ў гадоў сем.

Што тычыцца транспартных сродкаў, то тады ў асноўным даступным быў веласіпед. Напомню, што каштаваў ён каля 50 рублёў. Часам у сям'і было іх некалькі, а часам і ніводнага. Асвойваць ровар мы пачыналі ўжо з пачатковай школы. Спачатку каталіся на педальцы, затым пад раму, а потым і на раму. Найбольш небяспечнай была язда пад рамку, бо тут даставалася нашым штанам. Яны звісалі якраз на ланцуг і ўкрыпаваліся ў вядучую звёздачку. Часам без дапамогі малому цяжка было і выкрыпацца. Помніцца, нашага Антуся выкручаваў з ровара дзед Паўла. Пасля гэтага на штанах заставаўся салідол і дзюркі ад звёздачкі. Пазней у некаторых старэйшых школьнікаў сталі з'яўляцца газавыя мапеды. У нашай сям'і з'ездзілі такіх ажно два. Матацыклы было можна пералічыць на пальцах. У асноўным былі "Іжы" ды "Мінскія", часам "Васход", "Ява" ці "Панонія". На іх мужчыны ездзілі на працу, часам вазілі ў Глыбокае па нейкіх патрэбах сваіх родных ці суседзяў. Помню, у майго таты быў "Іж-Юпіцер". Зімой ён стаяў у хаце пад акном, і я садзіўся на яго. Быў такі выпадак. Неяк на Вяліканне папрасіла баба Анэта прывезці яе з касцёла на матацыкле. Але строга

наказала: “Глядзі ж, каб не ляцеў крэпка!” Бацька не стаў пярэчыць, але рашыў з бабы троху паздзеквацца, як ён потым расказваў. З Глыбокага выехалі павольна, а ўжо на асфальце бацька ўлупіў добра пад хвост свайму каню. З Мядзвёдкаўскай гары сотню і нават за сотню, баба ўчапілася і сядзіць ззаду не дыхаючы. Хаця і асфальт быў, але гэта ж не на сучаснай машыне, а на сядле савецкага матацыкла. Дома баба злезла з матацыкла, а бацька пытаецца ў яе:

– Ну як?

– Ну, яшчэ ж гэтак яно сабе (нядрэнна)?

Бацька быў у недаўменні, ён чакаў зусім не такой рэакцыі ад старой. А яна хоць бы сабе што, забрала свае манаткі (рэчы) і пасунулася дамоў. А я цяпер у тым нічога дзіўнага і не бачу. Проста трэба было добра ведаць нашу бабу Анэту. Нездарма яна была са шляхецкага роду Піскуновічаў. Для яе ўсё было не так, яна была пакрыўджана лёсам, як, дарэчы, і большасць жанок, напэўна, у нечым лічыла сябе вышэйшай за простых чаляднікаў. І рэакцыя яе на ўсе няшчасці, якія зваліліся на яе шыю, былі, як нешта прадвызначанае лёсам, фатальнае. І яна пабожна цягнула сваю лямку жыцця. І цяпер мне яе паводзіны зразумелыя, але пасмяяцца не грэх. Часам яна прыходзіла і да нас на сяло. І вядома ж, бабы “наракаюць” (крыўдзяцца) на сваю “долю чубатую”, на зяцёў, мужоў, дзяцей, нявестак, суседак. Бабка Міхаліна:

– Матачка Найсвенша, дай нам цярпення!

Баба Вінцуська:

– Матачка Найсвенша, дай ім навруцэння (навяртанне да лепшага)!

А баба Анэта ўсё сядзіць і маўчыць. Не ўмешваецца, слухае і ў канцы дадае з крыўдай:

– А як жа я!

І мне цяпер яе шкада, бо ёй “найбольш балюча і цяжэй за ўсіх сабраных на сяле разам”.

Што тычыцца легкавых аўтамабіляў, то першыя “Жыгулі” ў Квачах з’явіліся ў Яся Абламавага. Але я б не лічыў іх Квачоўскімі, бо Ясь недзе праз год выехаў у Глыбокае. Па-сапраўднаму першым легкавіком у нашай вёсцы я лічыў бы, Пачкоўскага Ванькі “Масквіч” з нумарам 51-00 ВТЩ. Нумар я памятаю дакладна, бо і самому даводзілася на ім ездзіць. І калі былі ў некага вельмі пільныя патрэбы, то звярталіся да Ванічкі, і ён, маладзец, не адказваў. Бензіну тады было мора, і быў ён даступны па цане, а тым больш, што Ванька працаваў на “Калхідзе”.

Прыгадваю, што старыя часта бавілі свой час за гульнёй ў карты, асабліва летам. Часцей за ўсё гулялі ў падкіднога дурня. Збіраліся ў майго дзеда Ігналі (бо ён быў карцёжнік заядлы), часам у Аблама. Прыходзілі Янэчык, часам яго Юзюк, Паўла, Бронічка крывы, Ігнась, далучаліся свае. Збіраліся ўжо пасля абеду, калі ў касцеле адбудзецца імша. Жарсці разгараліся не на жарт, асабліва, калі Янэчык у канцы вешаў некаму “пагоны”. Заседжваліся, аж пакуль не трэба было ісці па кароў.

## Дзіцячыя забавы

Нельга ніякім чынам параўнаць дзяцінства наша з цяперашнім. Я не маю на ўвазе матэрыяльны дастатак. Цяпер жывём мы значна лепш. Непараўнальнае жыццё цяперашняга пакалення ў параўнанні з нашым у дзіцячых гульнях і забавах. Помню, яшчэ малым, як толькі сыходзіў снег, малявалі на сухім месцы класікі, кідалі камянёк і скікалі да “Неба”. Вечарамі аж да цямна забегваліся, гуляючы то ў “Пікара”,

то ў "Замарозку". Шмат ў якіх месцах гулялі ў дзіцячы футбол па спрошчаных правілах. Безумоўна, весела было гуляць у "Хаванкі". Памятаю нашы лічылкі. "Кацілася торба з высокага горба, у тэй торбе хлеб, соль, пшаніца. З кім ты будзеш дзяліцца (жаніцца)." Або такая: "Карыля-барыля замуж ляцела, траўку рвала, на лаўку клала. Чыжык, буш, бушмак, барада."

Падрастаючы, гулялі з ножыкам у "Рэпку". Большым дзецям можна было выпрасіцца ў бацькоў і схадзіць "у вёску" (на цэнтр калгаснай сядзібы) – там ужо футбол быў больш грунтоўны. А як станавілася ўжо зусім цёпла, то гулялі часцей у валейбол. У конскай зыгарадцы была пляцоўка з укапанымі слупамі і сеткай для гульні. Мяч часцей за ўсё "стараліся" (дабывалі ) недзе ў школе. "Бесперастанку" (увесь час) ганялі на веласіпедах.

Нам пашанцавала з рэчкай. Гэта рака Маргва. Яна цячэ са Стураўскага балота праз Дзеркаўшчыну, Альховікі, паўз Квачы (дзесь за кіламетр), праз Канстанцінава, Верхняе, Мосар. Далей упадае ў Бярозаўку, якая далей нясе яе воды ў Дзісенку, Заходнюю Дзвіну і ў Балтыйскае мора. А пашанцавала вось ў якім сэнсе. Сама прырода стварыла выдатныя месцы для купання. Мы называлі іх Купальня і Цюшка. Былі яны памерамі дзесьці з хату. Купальня была глыбінёй каля метра, а Цюшка крыху глыбейшая. У першай забаўляліся самыя малыя, а ў другой старэйшыя. Часам збіралася чалавек да трыццаці, напэўна. Бацькі з намі не мелі часу хадзіць, і мы былі пад апекай старэйшых. Ад іх жа вучыліся і плаваць, і ныраць, і ныраць з берага. Боўталіся часам да пасінення, вылазілі на бераг, калаціліся. Калі былі дзяўчаты, то мы тады беглі за кусты выкручаваць трусы, каб хутчэй абсохнуць. У дзяўчат былі свае кусты. Адзін раз я на гэтым даў маху. Залазіў у ваду – дзяўчат не было. Выскачыў на бераг і давай вы-

кручвацца, хлопцы зарагаталі, а тут ужо на беразе сядзелі дзяўчаты. Я як даў лататы ў свае кусты. А пасля вярнуўся, як ні ў чым не бывала, не зганьбаваны. Дзякаваць Богу, ніхто тут, на рэчцы, не ўтапіўся і не скалечыўся, ныраючы з берага.

А што ўжо да таго, каб кідацца чым-небудзь, то гэта мы не пераставалі рабіць. Зімой – гэта была гульня ў снежкі. Біліся мы імі ў школе, ідучы са школы, рабілі крэпасці і кідаліся снежкамі праз іх. Летам ў ход ішлі камяні, грузвалі, гліна. Помню, я быў на сваім баку асфальта, каля хлява, а Мішка Чэсікаў на другім, каля Вінцуські. І так пуляем адзін па адным гуляючы, а бывала, і па злосці “б’ёмся”. Тут лавіць варон было некалі, а трэба было пільна глядзець, каб не прапусціць “гол”. Прапускалі рэдка.

Даўней выкошваліся ўсе няўдобіцы, у тым ліку і лужыны. Восенню яны напаўняліся вадой. Затым удараў мароз, і нам было раздолле проста пакоўзацца або пагуляць ў хакей. Дзяцей тады было многа, і ў вёсцы гулялі ў некалькі месцах. Я гуляў або на Юлісевай лужыне, або на Чэсікавай. Канькоў у нас не было. На ўсю вёску былі толькі ў Рысіка Бародзічавага і ў Данака Вацюковага. І калі яны з’яўляліся на полі, то маглі супернічаць бадай што не з цэлай камандай. А мы ў звычайным абутку былі непаваротлівыя, асабліва ў керзачах. Пакуль набярэш ход, а тады не можаш спыніцца. Шайбы таксама былі не заўсёды. Часам іх замяняў адпілаваны круглячок ад нейкага палена, запятак, або проста грудка зямлі. Хакей быў да тых пор, пакуль не выпадала шмат снегу. Тады пачыналіся лыжы і санкі. Мне мама, калі я быў у першым класе, купіла новыя лыжы без чаравікаў, але мы зрабілі крапленне з гумак на звычайны абутак. Лыжы былі з слаба загнутымі насамі, але досыць трывалыя. Гадоў з пяць

я на іх адкатаўся. Як толькі прыйдзеш са школы, паеў – і на лыжы. Каталіся то са Сташковай гары, то з асфальта. Рабілі скачкі, аб'язджалі на спусках лыжныя кійкі. Часам ездзілі аж на вялікую гару. У нас гэта была Шыбільніца. Там быў круты і доўгі спуск, але да яе было далекавата, недзе каля двух кіламетраў. Адзін раз прыехалі, а там нехта пабудаваў высокі, пэўна каля метра, трамплін. Другія неяк пабойваліся скакаць. А я рызыкнуў, і тут мая лыжына, якая мне верна служыла год пяць, не вытрымала і зламалася напалам. Яшчэ на лыжах мы ездзілі па Слясаршчыне ганяць зайцаў, цецерукоў. Тады яны былі не такія рэдкія, як зараз, і іх часта можна было бачыць на бярозах або падняць з глыбокага снегу. А курапатак! Катаючыся каля вёскі, можна было падняць статкі тры, а то і больш.

Асабліва ўспамінаецца калаўрот! Яго зрабіў у выхадныя нам бацька на Юлісевай лужыне. Прынёс з кузні ад Фульгента Яхімавага вось і кола. Вось на ноч умарозілі ў палонцы. Наверх на вось надзявалася кола, і да яго мацавалася доўгая жардзіна. На жардзіну перадком надзяваліся санкі і прывязваліся. Круцілі калаўрот двума каламі. Калі тым, хто круціць, было вельмі слізка, то падсыпалі пяску. Хуткасць на санках была тым большая, чым даўжэйшая жардзіна, і чым больш людзей круціць. Пры добрай раскладцы ўтрымацца не было шанцаў, і пасля двух-трох кругоў наезнік адлятаў далёка ў кусты. Эх, вясёлая была забава!

Я расказаў пра свае дзіцячыя забавы. У другіх , можа, было штосьці іншае, але моцна не адрознівалася, бо мы варыліся ў адной стыхіі на прасторах родных Квачоў. Такая загартоўка ў гульнях, у працы далі тое, што мы добра бегалі, былі лоўкімі, хто больш, а хто менш, умелі плаваць, добра кідалі мяч, што не скажаш пра сучасных дзяцей, якія нішчаць свой час за камп'ютарамі ды мабільнікамі.

# Што Бог паслаў

Няхітрыя свае харчовыя запасы вяскоўцы папаўнялі прыроднымі дарамі, тымі, што паслаў Бог, якія самі аднаўляліся ў прыродзе, і чалавеку пра іх не трэба было клапаціцца. Я ўжо згадаваў пра паходы за шчаўем. Але куды больш прыемным было збіранне ягад, бо, збіраючы іх, можна было добра паласавацца. Найперш паспявалі паземкі. Я са сваім старэйшым братам Пецькам хадзіў па іх у бярэзнік, што рос каля Мікалаіхі, а таксама па канавах каля дарогі, што ішла да Яніны Ігнашкавай. Збіралі мы не больш за стаграмовік кожны. Але якое гэта было задавальненне, як смачна яны пахлі! Мы прыносілі іх дадому, таўклі з цукрам, дабаўлялі ў іх малака і макалі туды мучныя бліны. Эх, смаката! Нават зараз у мяне “пацяклі слінькі”. Потым выспявалі чарніцы. Паблізу іх не было. Старэйшыя ездзілі за імі аж у Каліты. А я зноў жа са сваім Пецькам у Пятровічы, дзе жыла наша цётка Гунэфа. Яна завядзе нас, пакажа дзе, мы і збіраем: то ў Ксенінай амшары, то на замку, а то аж пад Даравое. Тут мы ўжо ягад пацінал (паелі) ўдосталь, але ж і камары нас пацінал не менш! Звычайна мы набіралі па трохлітроваму бітончыку і вярталіся назад. Цётка нас хваліла, варыла нам “філюмені” (пельмені), таўкла з цукрам чарніцы. Наеўшыся такога “цымусу” (смакаты), астатак дня мы забаўляліся, лавілі на лужыне галавачоў. За чарніцамі паспявалі маліны. Іх было многа і ў нашай Слісаршчыне, асабліва, калі там раскарчавалі кусты, згарнулі іх у валы. І вось па гэтых валах вельмі добра раслі маліны. Туды ўжо вадзіў нас мой старэйшы брат Толік.

Ішлі мы на Мікалаіху каля Мугарэты, па кладцы праз роў каля Ермака, а тут ўжо хутка і ягады. Запомніліся

маліны таму, што часам мы пападалі пад дождж і добра прамакалі. Часам заходзіліся на хутар да Ермака (Зэнька і Анэта Ермаковічы). У іх быў добры касматы сабака, і тут я першы раз у жыцці пабачыў індыка. Для мяне, малога, ён здаваўся агромністым. Ён сіпеў, надзімаўся, кідаўся на чырвонае. Тут быў калодзеж з жураўлём і драўляным зрубам. Мы пілі ваду, адпачывалі, Ермачыха частавала нас яблыкамі, і мы, радасныя, з ягадамі вярталіся дамоў.

У Слісаршчыну мы таксама хадзілі і ў арэхі. Як вядома, ураджай на іх здараўся не кожны год, але калі была ўрода, то арэхаў мы набіралі ўдосталь. На іх, я памятаю, і сапсаваў свае першыя зубы.

Першыя грыбы я стаў збіраць таксама ў сваім бярэзніку, што пад Альховікі, а таксама па равах ля Яніны Ігнашкавай. Тут я смела хадзіў, не баючыся заблудзіцца, і, магу сказаць, што ўсе грыбы былі мае. Праўда, раслі тут толькі сыраежкі, сушонікі (падбярозавікі) ды падасінавікі. Баравікі ды лісічкі тут не раслі. За імі мы ездзілі ў Горкі. Памятаю, першы час мы з братам на аўтобусе ездзілі туды за маслякамі ў пасаджаны сасоннік. Мы яго звалі Хрыстоўскі. Лісічкі мы збіралі ў Горках па пагурках. На баравікі быў найбольш багаты Войтаў лес. Памятаю, быў адзін вельмі мокры год. Ельнік там быў не стары, і баравікі ў той год цягалі адтуль кашамі, хоць і народу ж тады было шмат. Яшчэ па баравікі хадзілі аж у Леснічоўку, або ў Хмялінец. За першымі апенькамі, памятаю, вазіў мяне Толік на мапедзе ў лес пад Рашкова. Нарэзалі мы тады на месцы цэлы мех. Потым апенак вельмі многа расло па тых жа раскарчаваных валах, дзе і малін. Адзін раз мы знайшлі шмат апенак, іх было, як казала мая цётка Гунэфа, “роць Божа” – гэта значыць так многа, што раслі яны “мостам”(адзін ля аднаго). Набралі колькі хацелі. Але ж шкада, каб прападала дабро. Паказалі Юзіні Адасёвай і

Ядзечцы Юзюковай. Тыя прыехалі на гнядым Марынчыным кані ў панарадзе і набралі цэлы воз, за што былі нам вельмі ўдзячны.

Мушу расказаць пра "ўлёты" (абтрасанне чужых садоў), бо і сам гэтым грашыў. Наша з Мішкам вотчына – сад Ігнашкавай Яніны. Жыла яна на хутары. Мы ведалі, калі яна была на рабоце, што ў яе ёсць дзве бялянкі, і яшчэ я запомніў даўнейшы гатунак, які у нас называлі мундэры. Працавалі мы без "памарак", і ніколі яна нас не паганяла. Праўда, адзін раз нас адчысціла яе пляменніца Светка Сарокава, якая пасля стала маёй братавай. Спакуслівыя былі ранэткі ў Аблама, але раслі яны пад самым ганкам, да таго ж мы ў іх двары пастаянна гулялі, і рука ў нас на іх не падымалася. А часам маглі вечарам паласавацца траскаўкамі ў Паўліны Адамовіч ці зусім ў другой вёсцы, едучы на веласіпедах з Лапішак з Купала. Улятаў я, уляталі і да нас. Каля самага асфальта ў нас расла добрая груша, і мы сталі заўважаць, што пладоў менее. А тады вечарамі моладзь збіралася на вячоркі ў нас на астаноўцы, і гэта была справа іх рук. Бацька ўзяўся пілнаваць (сцерагчы). І вось ішла купка моладзі, а самы круты з хлопцаў быў з прыёмнікам "Акіян". Усе падаліся ў грушы, і ён таксама, пакінуўшы свой транзістар. Бацька іх як папёр, то разбегліся хто куды. Транзістар жа ў той вечар весяліў нас да паўначы, а назаўтра прыйшла бабка яго ўладальніка, каб забраць дарагую на той час рэч. Канечне ж, унук яе быў не вінаваты.

Асабліва хочацца расказаць пра рыбу. Безумоўна, калі мы былі яшчэ малыя, то яе было больш ды і здавалася яна нам тады большаю. Помніцца, калі я сам быў яшчэ малы для лоўлі рыбы, то чакаў, што прынясуць бацька з Федзем ці яшчэ з кім, ловячы недзе броднем. Звычайна прыязджалі з рыбалкі да нас і дзялілі рыбу. І тут у нас была перава-

га, бо бацька меў свой бродзень. Рыбу высыпалі з торбы на траву, дзялілі на кучы па колькасці рыбакоў. Нехта адварочваўся і прызначаў, каму тая ці іншая куча рыбы. Часам мужчыны добрую рыбалку адзначалі бутэлечкай вінца. Бо, як казаў адзін стары: “Гэта ж очынь палезна выпіць вінца на свежым воздуху!” Броднем рыбу лавілі на нашай Маргве, ездзілі на Турчынскую раку на балоце, на Ермаковым раве, на Стафанішынай сажалцы. Мой такі першы вопыт быў, калі бацька з Пецькам лавілі броднем і ўзялі з сабой мяне насіць рыбу. О, які я тады быў гарачы! Помню, у Альховіцкай купальні ў бродзень папалі дзве добрыя плоткі і я з гарачкі, каб тыя не выскачылі, у чым быў, ускочыў па шыю ў ваду. Помню, рыбу насіў я ў разносцы. Так называлася сумка з керзавага матэрыялу. Ловячы броднем, мы застаўлялі наперадзе трыгубіцу (сетку з рэддзю). У яе часцей за ўсё траплялі плоткі, бо яны ўцякалі наперад. А ў бродзень траплялі шчупакі, акуні, часам “вягілы” (ментузы). У той раз мы добра налавілі, а маё хрышчэнне вадой я памятаю і цяпер, а тады аж дух захапіла. Калі я яшчэ быў слабаваты для бродня, то мы хадзілі на рыбу сумесна з Абламчыкамі (Янакам, які быў на год старэйшы за нашага Пецьку, і Стасікам, на годам маладзейшым). Звычайна хадзілі ў нядзелю і заўсёды пасля абеду, калі ў касцеле закончыцца імша, бо раней бабка нас не пускала. Трэба было абавязкова ў абед змовіць з ёй Ружанец, а мама тым часам ездзіла ў Глыбокае ў касцёл. На той час, па нашых мерках, мы налоўлівалі даволі прыстойна рыбы. Але, калі паглядзець на нашы ўловы цяпер, то большая за паўкілаграма рыба траплялася рэдка. Адзін толькі раз тыя ж Абламчыкі з хлопцамі Калюся Маскалёнка (Славакам і Зютакам) злавілі язя на тры кілаграмы. Тады было размоў! А я і цяпер добра памятаю, пад якім кустом хаваўся той язь. Своеасаблівай была

рыбалка на Стафанішынай сажалцы. Тут было шмат бузы (гразі), і лавіліся там выключна карасі. Сажалка была даволі вялікая, напэўна, сотак з пяць, густа заросшая аерам. Толькі пасярэдзіне было невялічкае як бы рэчышча. Калі сажалка падсыхала, у тое рэчышча і збіраліся карасі. Адзін раз мы былі ткнуліся ў вялікую ваду. Вядома ж, нічога не злавілі.

Лавілі рукамі вягілаў у норах. Ідзеш ля берага і шукаеш у глеі норы. Абмацваеш іх і, калі там нешта ёсць, памаленьку зацiскаеш, выкідваеш на бераг слізкую рыбіну. Дзе глыбока, то так не дастанеш, і прыходзілася даставаць здабычу, ныраючы пад ваду, і часам не адзін раз. Вадзіліся вягілы і ў пераплёце на грэблі (так мы называлі роў, што ішоў ад Ралаўскага возера і ўпадаў з правага боку ў нашу рэчку за метраў 150 пасля моста). Цяпер яе ўжо зусім няма. Ды і рэчка наша любімая здзічэла. А ў свой час яна была даволі паўнаводная, абкошаная і без карчоў.

Першае маё знаёмства з вудачкай было незвычайным, можна сказаць, як у казцы. Рашылі мы з братам самі змайстраваць вудачку з падручных матэрыялаў. Ён быў старэйшы на чатыры гады і нешта цяміў. Замест жылкі раздабылі капронавых нітак, на паплавок знайшлі добрае пяро. Цяжэй аказалася з кручком. Пакуль мы спрабавалі змайстраваць яго з нейкага дроту, прыехаў з работы наш тата і прывёз нам куплёную вудачку. Як ён адгадаў наша жаданне – не ведаем, але шчаслівыя мы былі непамерна. Назаўтра ж пайшлі з Пецькам лавіць пад мост. Мы лавілі на шыціка. Закідвалі па чарзе то я, то ён. І клявала, але мы, мусіць, не ведалі, як трэба было падсякаць, таму нічога не маглі злавіць. Толькі мне адзін раз пашанцавала. Калі паплавок даў у дно, я так смыкануў, што здабыча, выскачыўшы з вады і сарваўшыся ў паветры, затрапята-

лася далёка на беразе. Гэта была мацёрая ўклейка і ўвесь наш першы ўлоў. Але я быў задаволены, як ніколі потым, бо гэта было маё першае рыбацкае шчасце. Потым, калі для нас гэта ўжо было забавай, то на вудачку на рацэ мы часцей за ўсё лавілі фарэль (курмялёў), часам плотак ды шаракоў. А карасёў лавілі на Іванавым катлаване, у сажалках пад Беляўцы ды на Ралаўскім возеры. Яно было вельмі зарослым , і падысці да яго было даволі небяспечна, бо кругом была дрыгва, якая, як студзень, калацілася пад нашымі нагамі.

Бывалі мы на рыбалцы і на Карабоўскім возеры. І часцей за ўсё лавілі тут на вуду на жыўца. Пачыналі рана, як толькі раставаў лёд. Замест жыўца чаплялі часцей за ўсё верхаводку. На іх браліся часцей за ўсё акуні, а часам і шчупакі. Спінінгаў тады ў нас амаль не было, толькі ў Бародзіча. І ён часта на сваім мапедзе вазіў з азёраў добрых шчупакоў.

А яшчэ нашай дзіцячай забавай была рыбалка з відэльцамі. Так, са звычайнымі відэльцамі, якімі елі. Часцей за ўсё мы гэтым займаліся пад мостом, бо там было многа камянёў. Бродаеш (ходзіш) па вадзе з закасанымі штанамі і падымаеш камяні, каб не нарабляць муці. Убачыўшы шарака, а часам і вягіла, ціхенька падводзіш відэлец і рэзка колеш. Ва ўсім патрэбна практыка!

Вельмі чакалі вясны, каб хутчэй прайшло разводдзе і пайшла на нераст рыба. Тут мы ўжывалі на яе восці, часам і добрыя, бацькоўскія, а часам і простыя, самапальныя з цвікоў. Помню, мяне так цягнула на рыбалку, што я кожны дзень пасля школы стараўся абляцець рэчку, канаву з Карабоўскага возера і на балоце месца, дзе быў шлюз. Удалай лічылася ўжо тая рыбалка, калі давялося хаця б пабачыць шчупака, не тое што злавіць. Праўда, некаторым і шанцавала. Помню, адзін раз Паўлік Гжэсеў

і Стасік Абламаў неслі вялікага, на пяць кілаграмаў, шчупака. Злавіў яго Стасік, а нёс і выхваляўся перад намі і Янэчкам Паўлік. А Янэчык не паддаваўся і казаў, што каб быў маладзейшы, то прынёс бы не меншага, бо ведае, дзе яны яго злавілі. І, я думаю, ён ведаў тое месца. Вось такая была рыбалка. А колькі яна прыносіла нам радасці! Больш чым наедку, бясспрэчна.

Яшчэ са сваім стрыечным братам Мішкам Чэсікавым спрабавалі лавіць зайца. І аднагао разу нам пашанцавала. Мы наставілі петляў з дроту ад электрапастуха ў садзе Янінкі Ігнашкавай і на зімовых канікулах кожную раніцу хадзілі правяраць. А было нам тады гадоў па 12-13 . І вось аднаго разу папаў у пятлю заяц. Мы аж задрыжэлі, хаця б не ўпусціць. Укруцілі яго ў паліто і прынеслі да Мішкі дамоў. Тут рашылі яго гадаваць, а мне ўсё ж хацелася яго асвежаваць ды пакаштаваць. І так я ўсё казаў пра яго Мішку аж да вясны, а потым зайца не стала. Мішка казаў, што той збег, а я яму не верыў, і мы з ім добра пабіліся.

А яшчэ мы дралі лазу. Хадзілі ў бліжэйшыя кусты на нашу старыцу або недзе бліжэй. Для нас гэта было таксама цікава. Мы бралі з сабой туды ножыкі і на прыродзе не толькі займаліся справай, але і забаўляліся. У канцы складалі кару ў пукі і неслі дамоў. Там яе сушылі, а потым здавалі. Не памятаю, колькі яна тады каштавала, але адзін раз мама, завёзшы яе на кані ў Глыбокае, прывезла назад драўляную бочку ды яшчэ нешта.

## Шалы і штукі

Добра, што наша дзяцінства прайшло ўжо праз досыць доўгі адрэзак пасля вайны. Я маю на ўвазе празмерную цікавасць мальцаў да рознага рода стрэлаў. Мой бацька казаў, што пасля вай-

ны меў атразанку, але потым яна знікла з рук Зыфрыка Дзіваковага.

У наш час такога дабра ўжо не было, але “голь на выдумкі хітрая”. І тут чаго мы толькі не прыдумвалі. Ну самае простае – гэта было заматаць ў фальгу запалку і кінуць у печку, дзе яна пшыкне. Куды гучней было, калі на дзюбцы цвіка замацаваць пластылінам капсуль ад патрона і проста кінуць яго дзюбкай у падлогу. Быў і выбух, і прыемны пах ад капсуля. Ну, гэта зусім для горкіх дзяцей. Хто троху падрос, бавіліся “прапірданкамі”. Гэта загнутая тонкая медная трубачка з заплаўленым волавам канцом. У яе нацярушваецца серкі з 2-3 запалак, утрамбоўваецца цвяком (цвіком). Цвек ціснецца гумкай ад веласіпеднай камеры. Натрамбаваў серкі, адцягнуў цвек на гумцы, каб ён трымаўся на зломе, і вось ужо ўсё ўзведзена. Засталося толькі прывесці ў дзеянне механізм, націснуўшы на цвек дзе-небудзь каля дзяўчат ці ў сябра над вухам. У старэйшых былі куды больш небяспечныя штукі – самапалы. Гэта загнутая і залітая волавам з аднаго канца трубка (найлепшая, што ідзе да газавага балона, бо яна без шва, а калі са швом, то гэта небяспечна, бо іх разрывала нават ад сярэдняга зараду), умацаваная на рукаятцы. Яна вельмі нагадвае пісталет з доўгім ствалом. Засыпаецца мерка пораху або надзёртая з 1-2 пачкі серка, забіваецца папяровы пыж, затым або баявая куля, або шрот і яшчэ адзін пыж. На ўзроўні, дзе порах, прапільваецца прарэз, а над ім мацуецца запалка. Усё гатова, засталося толькі шмаргануць карабком па запалцы – і адбудзецца выстрал. Стралялі звычайна або ў сцяну, або ў доску і глядзелі, ці глыбока заганяе набой. Пораху “стараліся” (дабывалі) у паляўнічых або дабывалі яго з баявых патронаў.

Адзін раз Эдзік Лавутаў капаў яму ля хаты і адкапаў скрынку з патронамі. Каб не расцягалі дома, то за-

нёс іх і выкінуў у катлаван. На першыя часы для нас то быў сапраўдны Кландайк. Дзеці лазілі па бузе і рукамі даставалі тыя патроны, а гэта было восенню, дзесьці ў верасні, і яшчэ не было вельмі холадна. Помню, у той год шмат патронаў кідалі ў "лом" (касцёр) каля кароў. Укінем, а самі хаваемся. Як стануць страляць! А бабы старыя тады на нас крычаць.

Асобна мушу адзначыць карбід. З яго забаў было не менш, і былі яны куды прасцейшыя і больш эфектныя. Карбід тады даставалі з калгаснай майстэрні, а мы, меншыя, і з мехтока, калі летам там браліся нешта рамантаваць і варылі ацэтыленам. Першы раз я толькі назіраў за тым, як Чэсікаў Коля ўдала майструе фугасы. Для гэтага былі патрэбныя бутэлечкі ад лякарства з двайной закруткай. Бо адна прапускала газ. Дзесьці трэцяя частка запаўнялася вадой, наверх пракладка з сена, а на сена кавалачкі карбіду. Бутэлечка шчыльна закручвалася і пераварталася, каб вада ўступіла ў рэакцыю. Мы, малыя, далёка залягалі і назіралі, а Коля адыходзіў павольна і іграў на нашых нервах. Часам бутэлечка і не ўзрывалася, бо не хапала моцы, часам доўга "думала", але тады ўзрыў быў мацнейшы, і шкло разляталася далёка навокал. А мы адразу беглі на месца ўзрыву разглядаць. Вялікія вінныя бутэлькі часам моцна забівалі калком, але яны часта прапускалі. А калі ўзрывалася бутэлька з-пад шампанскага, то гэта была сапраўдная бомба. Яшчэ карбідам стралялі з "кансеркі" (бляшаная банка з-пад кансерваў), пажадана з-пад згушчонкі. Уверсе цвячком прабівалася дзюрачка. На зямлю клалі кавалачак карбіду, палівалі яго вадой і накрывалі кансеркай. Калі газу набіралася дастаткова, падносілі да дзюрачкі запалку, уваткнутую ў сухое сцябло чарнобыльніка. Раздаваўся глухі выбух, і кансерка на метраў 5-7 падлятала ўгору. Тое ж практыкавалі і з

вялікімі вёдрамі. Рэзультат быў цудоўны, але вёдры доўга не вытрымлівалі, а за іх дома можна было атрымаць і па вушах ад бацькоў.

Усё гэта ў нас праходзіла неяк удала, без траўматызму. Я так мяркую, што ўсе строга выконвалі правілы бяспекі, і нявопытныя не браліся самастойна за такія доследы. А вось той жа Чэсікаў Коля пацярпеў з -за сваёй бяспечнасці. На штукі ён быў майстра, зрабіў сабе пісталет пад патрон ад мялкашкі (патронаў тады было ўволю). І неяк няўдала ці то перазараджаў, ці то разбіраў, паставіўшы сабе на сцягно. Прастрэліў сцягно і пашкодзіў артэрыю. Зрабілі аперацыю, уставілі трубку, але нагу так добра і не вылечылі.

# Лекі без аптэкі

У наш час нас лячылі нашы мамы і бабулі так, як, напэўна, і раней лячыліся нашы бабкі. Да дактароў звярталіся ў крайніх выпадках. Вырасшы ў такіх умовах, я таксама добра засвоіў бабчыну аптэку. Самае звычайнае захворванне ў дзяцей было – гэта “забалеў жывот”. У такім разе мне бабка давала жоўці, у якую дабаўлялі гарэлку. Дзіця так бы яе не выпіла, таму некалькі кропель налівалі ў лыжку з цукрам. Калі даймалі глісты, то давалі выпіць некалькі кропель “шпікунару” (скіпідару), або адвар піжмы. Калі жывот “пагнаў” (панос), то пяклі крута яйка і густа ў яго дамешвалі кміну або давалі адвар з кміну. Для апетыту і ад жывата давалі адвар палыну. Ад “падарвання” памагала цынтурыя. Я помню, як з бабкай яе збіралі на старыцы на палянцы, што была ля дарогі, як ісці да Лысых. Ад захворвання горла дапамагала гарлянка. Калі з’яўлялася нейкая высыпка, то абкурвалі ветрынкамі або змывалі іх

адварам. Корань старадуба дапамагаў ад страўніка, а настойка з каранёў валяр'янкі пры нервовых растройствах. Дарэчы, настойкі на каранях даводзілася маме добра хаваць, каб бацька імі не пахмяліўся. На хворы зуб давалі анальгін або зусім вырывалі. У дзяцей здараліся прастуды. Лячылі мёдам, параным малаком, адварам чабору, ліпы. А калі ўжо моцна забірала, то мама загадае – і п'еш "сікі" (мачу). Паспрабуй не выпі! Як напужаюць запаленнем, што можаш памерці, бальніцай ды ўколамі, вось і п'еш. І ведаеце, мне то дапамагала. Я доктара не ведаў. З лякарстваў пры прастудзе прызнавалі толькі аспірын. Вып'еш таблетку, добра ўпацееш і папраўляешся.

Была ў нас такая незвычайная хвароба, як "уроцы", або "з вока". Дык вось, калі каго-небудзь ураклі, то маці сцірала сваім падалом. Яшчэ лепш памагала ад уроцаў "чацвярговая соль". Яе растворам змывалі і давалі троху выпіць. Я яшчэ памятаю, як бабка ў "чысты чэцвір", калі ў хаце ўсё павінна быць як след прыбрана, строіла соль. Яна замотвала соль у нейкую рызінку (анучку), абмазвала яе глінай і клала ў пячурку. Да Вялікання яна там высыхала, і калі ўжо адбылася велікодная імша (рызурэкцыя), то соль вызвалялася ад усіх абгортак і станавілася "памоцная". Дапамагала ад усякай нячывілі (злых духаў) і свянцоная вада.

Калі ў каго прыкідвалася (з'яўлялася) рожа, то тады ішлі да Паўліны Адамовічавай, бо яна ўмела яе "замаўляць". Замаўляла яна аржаную муку, якой і пасыпалі балючае месца. У крайніх выпадках ад незнаёмай і невылечнай хваробы ехалі па дапамогу да Далмана, які жыў у Верацеях. Па тых часах – гэта быў адзіны вядомы на ўсю акругу знахар. Да яго ехалі не толькі з усёй Беларусі, але і з Саюза. Ён замаўляў ваду, якую трэба было піць і змывацца да ўсходу і па захадзе сонца. Па тым, на колькі ён

быў моцны знахар, гаворыць наступны факт. Неяк з Расіі прыехаў знатны генерал, у яго не магла разрадзіцца дачка. Далман замовіў яму вады, але той сказаў, што можа не паспець. Далман жа адказаў, што і па паветры паслаў сваю дапамогу. Усё абышлося добра, і ўдзячны генерал дабіўся, каб зрабілі прыпынак для цягніка ў Верацеях. А яшчэ аднавяскоўцы расказвалі, што да Далмана ішла па ваду нейкая баба і здалося ёй, што замнога яна нясе яму платы. Прыхавала пад кустом сыр. Далман даў ёй вады і ў канцы сказаў: “Глядзі ж, як будзеш ісці дамоў, то не забудзь пад кустом свой сыр.”

Вот, казала, і сорамна ж было ёй!

## Не хлебам адзіным…

Квачы праз усе нягоды і жыццёвыя ператрусы, такія, як войны ці камуністычная навала, пранеслі і захавалі жывую веру ў Бога. А носьбітамі яе ў першую чаргу былі жанчыны: нашы мамы і бабулі. У ёй яны знаходзілі падтрымку і сілы перажыць войны, рэвалюцыі, сямейныя нягоды і драмы. Самай большай небяспекай для яе захавання, лічу, была камуністычная навала. Бо ніякае ліха не зацягвалася так доўга (для большасці падначаленых Расеі аж на 70 гадоў). Дзякаваць Богу, што для нас, заходнікаў, гэты перыяд быў на 20 год карацейшы. Каталіцкая Польшча ў гэтым плане адыграла на нашых землях станоўчую ролю. Пры камуністах, я мяркую, гадоў праз 30, калі б яны яшчэ пратрымаліся, то і наша вера знікла б зусім. За прыкладамі не трэба далёка хадзіць. Паглядзіце на ўсходнюю Беларусь. Вёска Зембін Барысаўскага раёна. Стаяць ужо амаль руіны велічнага некалі касцёла. Звязваюся з настаяцелем Барысаўскай парафіі ксяндзом

Аляксеем Раманчуком, што “ўсім мірам” будуе касцёл у Барысаве. Пытаю ў яго:

– Ці нельга адбудаваць такую прыгажосць у Зембіне?

– Хто адбудуе, засталося адсюль толькі дзевяць прыхажан?

А ў нас жа, калі разваліўся Саюз, што тут рабілася! Пааднаўлялі і паадкрывалі ўсе цэрквы і касцёлы. А цяпер і тут ужо старых людзей мала, яны гавораць, што такую работу наўрад ці асілілі б.

Толькі блізу Квачоў былі адноўлены і дабудаваны наступныя касцёлы: Канстанцінава (Святой Тройцы), Дзеркаўшчына (Святога Міколы), Дунілавічы (Архангела Міхаіла), Удзела (Святога Антонія) і іншыя. Наш Канстанцінаўскі касцёл адбудавалі з былога магазіна. Паднялі з цэглы сцены, зрабілі хоры, павесілі звон з былога драўлянага касцёла, які нехта захаваў з мясцовых прыхажан. Аднавілі плябанію (дом для ксяндза) і пабудавалі новую. Усімі працамі кіраваў калгасны прараб Пётра Ралавец. Добрую пакінуў пасля сябе памяць чалавек. І зараз касцёл наш хоць і сціплы, але вельмі ўтульны. А самае галоўнае тое, што ён не пустуе. На святы, калі прыязджаю да мамы ў Квачы, то стараюся трапіць у касцёл на імшу. І радуюся за сваіх землякоў, бачу тут людзей розных узростаў. Шмат сярод іх і маладых, і дзяцей, і маіх родных з Квачоў. Ніколі не пераставалі дзейнічаць бліжэйшыя святыні ў Глыбокім, а таксама ў Мосары. Я яшчэ памятаю, як на Яна ездзілі на фэст у Масара на кані. Загадзя рыхтавалі калёсы, вупраж і месцы, каб сядзець. Помню, не было салідолу, каб памазаць калёсы, і Вінцулёк прынес звычайнага топленага нутранога сала. На калёсы садзіліся чалавекі чатыры. Мама кіравала канём. Заўсёды была Яніна Ігнашкава, Вінцуська, часам яе Зоська або Анэта Янэчкава. Мама казала, што адзін раз з

імі нават ездзіў Ясь і іграў на гармоніку.

А вось адну ўнікальную святыню за часы камуністаў зберагчы не ўдалося. Гэта Беразвецкі кляштар і касцёл, пабудаваныя ў 1760 годзе, яны амаль 180 гадоў знаходзіліся на службе ў Бога, а затым былі ператвораны савецкімі камуністамі і нямецкімі нацыстамі ў лагер знішчэння мясцовага насельніцтва, “палякаў, савецкіх і іншаземных палонных. Моц дэманаў і зараз праследуе гэта месца, бо тут размешчана турма УЖ15-13 (ПК-13). Аб гэтым больш падрабязна будзе гаварыцца далей.

А зараз пра тое, як нас прывучалі да Бога. Не буду адказваць за ўсіх, а раскажу пра сябе. Спачатку вывучылі “мовіць” (маліцца) пацеры, куды ўваходзілі малітвы “Ойча наш..”, “Здровась…”, “Вежань…”. Па тым часе, натуральна, яны былі на польскай мове, і мы іх слаба разумелі. Іх мы мовілі перад сном кожную нядзелю. У час, калі ў касцёле ішла імша, з бабкай мовілі “Ружанец”, “Малітву да Маткі Боскай”, “Анёл Панскі”. Затым мама мяне часам брала ў Глыбокае ў касцёл. Бывалі выпадкі, што каля касцёла дзяжурылі настаўнікі і дзяцей туды не пускалі. Потым мяне рыхтавалі да першай споведзі. Для гэтага, акрамя пацер, трэба было вывучыць недзе з пяць “Катэхізмаў” (асноўных хрысціянскіх запаведзяў). Тады мама заводзіла мяне ў закрыстую і ксёндз пытаў малітвы ды “Катэхізмы”. Калі я яму ўсё адтарабаньваў, “як бобам” (бойка, без запінкі), можна было прыступаць да першай споведзі. Я тады быў, можа, у другім класе. Шчыра прызнаюся, у школьным ўзросце ўдзел ва ўсіх набажэнствах і рэлігійных святах для мяне было хутчэй данінай павагі да традыцый старэйшых, чым унутранай патрэбай. Мы былі вельмі заідэялагізаваныя і ў большай ступені былі матэрыялістамі, чым вернікамі. Але час паставіў усё на належнае месца. А тады мне асабліва падабалася “маё-

вае” (малітвы ў гонар Маці Божай Маёвай). Яны заўсёды праходзілі ў нашай хаце, а потым, калі стала вольна, то на вуліцы ля крыжа. Збіралася ў нас чалавек 15, пераважна суседскія жанчыны і дзеці. Мы ўпрыгожвалі Матку Боскую букетамі. Спачатку гэта была маці-мачаха, затым “лопух”, чаромха, бэз і іншыя кветкі. У гонар Маёвай тут спявалі ў асноўным песні, і былі яны вясёлыя, чым мне і падабаліся. Мама мая была “завадатар” ва ўсіх касцельных справах, а таксама і завадзіла песні. А бывалі часы, што такі “рацівы”(адважны) заводзіў песню і я. Зусім другі настрой быў падчас малення ў велікодны пост. Збіраліся заўсёды па пятніцах вечарам. Таксама прыхадзілі старэйшыя суседкі: Вінцулёк, Віля, Анэта Янэчкава, Паўліна Адамовічава. Мае мама і бабка прысутнічалі заўсёды. Тут спевы былі жалосныя, асабліва “Дрога кшыжова”, бабулі “сморгалі насамі” (усхліпвалі), і я пад гэта засынаў, бо зімой рана клаўся спаць.

З рэлігійных святаў найбольш радаснае для ўсіх нас, а для дзяцей асабліва, было Вялiканне. Чакалі, калі прыедзе мама з касцёла са свянцонкай. Збіраліся ўсёй сям’ёй, маліліся і сядалі за стол. Спачатку абавязкова з’ядалі ўсё пасвенчанае (яйка, хлеб, соль, мяса, кілбасу), а затым елі ўсё, што Бог падаў. Пастаянным атрыбутам на Вялiканне быў надраны і запраўлены смятанай хрэн, а таксама адвараныя свіныя “санкі” (шчакавіна). Потым мы, малыя, бегалі па хатах па яйка. Абавязкова тройчы віталіся “Хрыстус з мартвых устаў!”. Ужо са школы недзе з другога класа мы збіраліся спяваць “Васолы”. О, якая гэтаму папярэднічала падрыхтоўка! На вясеннія канікулы ўсе збіраліся да Вілі, і яна нам з кантычкі дыктавала, а мы выпісвалі “Васолы”. Адамовічава Паўліна давала нам словы Хрыстоса для паненкі, якія мы спявалі дзяўчатам старэйшага ўзросту і дзеўкам на выданні. Для іх гэта быў

вялікі гонар. Яшчэ б, такія добрыя словы і пажаданні:

*Хрыстос для паненкі (ад Паўкі)*
*Вельканоцна ноч забавы*
*Пр. чырвона ружа, сад зялёны вішнёвы*
*А мы прышлі пад акенца. Пр.*
*Хочам пазнаць, хто паненка. Пр*
*Алёначка, паненачка. Пр*
*Прош адамкнуць акеначка. Пр*
*Выбер сабе крулявіча. Пр*
*Крулявіча невяліча. Пр*
*Што ў Варшаве зямлю мерыць. Пр*
*Па сто рублеў у дзень берыць. Пр*
*На коніку паізджаіць. Пр*
*З стрэмен ножак не вымаіць. Пр*
*Конік сівы, сам красівы. Пр*
*Конь з Альбова. Сам з Кракова. Пр*
*А ты слічна, ты ружова. Пр.*
*Да вяселля ты гатова. Пр*

А ў канцы яшчэ дадаваліся віншаванні.

Каб паненка вялікая расла, каб увосень замуж пайшла. Каб намі не гардзіла, у вяселле папрасіла, мы не будзем дуракамі, каб класці пятакамі, а мы будзем малайцамі, будзем класці чырванцамі.

Недзе на працягу месяца мы трэніраваліся. Рабілі спеўкі. Часам мы сварыліся, і наш гурт распадаўся, потым аднаўляўся ўжо ў другім складзе, але касцяк захоўваўся. Гэта былі Мішка Квач, Антусь, Зютак, Пачкоўскія Эдзік і Валодзя, Алег Радзевіч, Эдзік Ермаковіч (Белы). Мы праходзілі з “Васоламі” ўсю вёску ад пачатку і да канца. А гэта недзе каля 70 гаспадароў, а некалькі гадоў былі яшчэ і ў Альховіках. Той, хто насіў кошык з яйкамі, называўся ў нас “дрыстун”. Каб нікога не абражаць, мы насілі кошык

па чарзе. Пакуль пройдзем усю вёску, так напяёмся, што заўтра не можам гаварыць, бо “Васолы” вялікія, ажно 16 слупкоў і часам мы хітравалі, прапускаючы некаторыя слупкі. А былі некаторыя гаспадыні, што сядзелі з кантычкай і правяралі, але мы, каб не было сорамна, такіх ведалі і спявалі ім усё. Часам да нас далучаліся памагчы старэйшыя, асабліва ўзгадваю Броньку Анцюцінага, з яго сіпаватым, але прыгожым голасам (Душы яго неба). Праз пару гадоў мы ўжо спявалі пад гармонік. Добра ігралі Алег, Белы, я таксама дапамагаў неяк “склыгаючы” (слаба іграючы). Заканчвалі мы ўжо прыцемкам. Дзялілі свой набытак і атрымлівалі недзе па 40 яек і па тры рублі грошай (на той час для нас гэта было не мала). Бывалі часы, што праходзілі тры групы валачобнікаў. Мы – самыя першыя, за намі старэйшыя хлопцы, такія, як мае браты. Тут маглі іграць Коля Чэсікаў, наш Толік, Янак Маскалёнак, затым мужчыны, у якіх часцей за ўсё іграў Ясь Абламаў, маглі таксама Калюсь Маскалёнкаў, Шкіль. Вось якія моцныя некалі былі Квачы. У старэйшых часам у кошыку ўжо з’яўлялася і віно, а мужчыны дык дзеля таго і хадзілі. І калі хутка “набіраліся” (напіваліся), то “Васолы” для іх заканчваліся. Помню такі выпадак. Юзюк Янэчкаў ўжо добра нападдаў, Вандзя яго цягне дамоў, а ён ей так далікатна кажа: “Ну, Вандачка, Вандулёк, ну хоць адну хатку!” Трэба ведаць іх абоіх, каб уявіць гэту “карціну”.

Яшчэ добра памятаю куццю. На стол клалі духмянае сена, засцілалі яго белым ільняным абрусам і ставілі стравы. Перад усім маліліся, ламалі і дзяліліся аплаткай. На стале абавязкова прысутнічала поліўка з сушонымі грыбамі, хлебам для закваскі і крупамі, селядцы, кісель, булкі з макам, кісель з журавін. Калядаваць у нас не хадзілі.

Пахаванні ў нас заўсёды праходзілі з адпяваннем па-

мерлых. Недахопу ў спявачках у Квачах не было. Тут быў добра зладжаны квартэт у складзе Вырусі (маёй мамы), Герці, Альфрэды, Паўліны. А раней “ўспівалі” Зося Дзівакова (Тадорка), Руфіна Мікалаешына, Каця Рублеўскага. Дарэчы ад яе захаваліся і такія сакральныя рэчы, як крыж, што неслі перад нябожчыкам і комжа (белая накідка для таго, хто нёс крыж). А крыж гэты яшчэ з Дзеркаўскага касцёла. Годна памінаюць Квачы і сваіх памерлых “дзядоў” на ўсе Святыя. Апошні год быў і я на гэтым малебне. Ксёндз зачытваў спісы памерлых па “родзінах” (сем’ях). Гэтыя спісы падавалі родныя памерлых, тыя, што яшчэ жывуць. У некаторых сем’ях спісы памерлых значна большыя за тыя, што засталіся пры жыцці. І у мяне ва ўяўленні ўзнікла такая карціна. Стаім на магілках мы, жывыя, сем’ямі, і недзе вакол нас нябачныя нашы “дзяды”. І яны чакаюць і радуюцца, калі каго з іх назаве ксёндз па спіску. І стаяць засмучаныя тыя нябожчыкі, каго ў спісах няма. Стаяць і з дакорам пазіраюць на нас і сваіх родных, што не прыйшлі да іх на сустрэчу і не памаліліся за памерлых. І вось з такімі пачуццямі ў мяне нарадзіўся верш “Дзядам”.

**Дзядам**

Малы лічыў, што будзем разам вечна:
Бабуля, мама, тата і трое нас.
А ўжо цяпер нас тут толькі палова –
Старэйшых пазабраў няўмольны час.

Цяпер, зважаю, меў тады я рацыю,
Хацеўшы вечна быць каля сваіх.
Мы госці тут, а хутка будзем разам,
Для вечнасці зямное – толькі міг.

Нябожчыкі сустрэчы не даждуцца,
Пільнуюць нас, ці прыйдзем мы сюды:
Бацькі, браты, сябры, найдаражэйшыя суседзі
Да нас прыходзяць толькі на дзяды.

А ксёндз чытае паіменна іх па спіску.
Не чуем, а з іх кожны адказаў.
Стаяць панура і глядзяць твае з дакорам,
Як ты не быў і сваіх родных ў спісы не падаў.

А каб з табою не было такога –
Шануй дзядоў, што на пагост ідуць.
Настане час і яны будуць стрэчы рады,
І ўнукі цябе ў спісы пададуць!

*Язэп Братка*
*21.11.15*

Яшчэ мушу згадаць пра паездкі нашых квачоўцаў у Вільню на Кальварыю. Ездзілі туды на Актавы. Гэта летам ужо пасля Тройцы. Наведвалі Кальварыю, Вострую браму, ілюстраваную "Крыжовую дарогу". Раней яшчэ рабілі пешае паломніцтва туды Стэпка (Адамовічава), Віктора (Гені Петрусёвай баба, трацiярка накшталт законніцы) і Людвічыха (Юзіка Фэлінага маці). А ўжо на маёй памяці туды ездзілі на поездзе. Бывалі там мая мама, Віля, Вінцуська, Анэта Янэчкава. Ішлі або нехта падвозіў на поезд у Канстанцінава вечарам у пятніцу. У суботу раніцай прыбывалі, хадзілі па святых месцах. Пераначаваць бралі да сябе мясцовыя наведвальнікі касцёла. У нядзелю таксама хадзілі на імшу, а што заставаўся час, хадзілі па магазінах. Помню, мы не маглі дачакацца, калі мама прыедзе з Вільні. Адтуль прывозілі першыя ліхтарыкі, што падзараджаліся з разеткі, а таксама дзе-

шавую вараную каўбасу і розакаляровыя коржыкі.

Вельмі дарэчы трэба тут апісаць адзін выпадак, пра які распавяла мне мама. Меліся паставіць у Квачах каля асфальта на скрыжаванні крыж. Ляжаў ён гатовы і чакаў свайго дня ўстаноўкі. Прыйшоў да мамы Гжэсь Казючышын і просіць: “Выруся, ты знаеш, што я не здаровы і мне ўжо не многа засталося, я так бы хацеў, каб крыж паставілі каля мяне на перакростку!...” Мая мама не змагла адказаць у такой просьбе. І зараз у вёсцы два крыжы. А чалавеку ж было так прыемна, што выканалі яго просьбу і ён стаў бліжэй да Ўсявышняга...

Шмат дзе па свеце раз’ехаліся Квачы, нашчадкі тых, хто праз вякі ў складаных умовах захавалі жывую веру продкаў. У нас зараз поўная свабода, але найперш – гэта свабода нашага сумлення. Ці апраўдаюць надзею продкаў нашы дзеці? Сёння залежыць ад нас з вамі, Квачы!

## Роды і мянушкі

Здаўна, ніхто з Квачоў не можа сказаць ад якога часу, толькі нарадзіўшыся, кожны ў нашай вёсцы разам з імем і прозвішчам атрымліваў ў спадчыну і другі тытул – нейкую мянушку, што распаўсюджвалася на цэлы род. Можа, дакладна ўсе не пералічу, але паспрабую спыніцца на больш распаўсюджаных, што былі на слыху. Пачну з сябе. Па маме я паходжу з роду Патапавых. Гэта мой нават не прадзед, бо яго звалі Фелікс. Гэта нашчадкі майго дзеда Ганарука і яго братоў Язэпа, Стафана, Антона і сясцёр Анэты і Мальвіны. Казалі, што жыў ён не бедна і была такая пагаворка, што “ў Патапа бела папа (хлеб)”. Па бацькавай лініі я – Гайдук. Сюды адносіліся мой дзед Ігналя, яго брат Владзюк і сястра Аміля. Былі ў нашай вёсцы і такія роды, як Карманы (Хвэлічка, Сцяпан,

Адоль, Юзэфа), Дзівакі (Бронька і Адоль, Каці Рублеўскай першы мужык), Пяхотамі (па матцы Фульгента Пархвенавага і Пётры) звалі баб, Баранчыкавы (Рудака Чэся), Лавутавы (Барыла Люцюка), Войтавы (Антон, Гуня, Аміля), Жыдкі (Ігналя і Юзафка), Кавалёвы (Стафанавы і Габрусёвы Коля і Рэнька). Ніжэйшым, калі можна так назваць, узроўнем, былі назовы па “дзядах”. Называю ўсіх, пачынаючы з нашага канца: Ігнашкавы, Мікалаешыны, Янэчкавы, Адамовічавы, Людвічышыны, Юлісявы, Цішкіны, Вацлаўкаў (Янэчык), Вінцучковы (Аня, Януля і Мальвінка), Ганаруковы (Вырусіны), Каітанавы (Аніказы і Юзюк), Абламавы (Ясь, Монька,), Ігналі Француза (Лёнюсь і Монька), Фульгента Яўхімавага (Альфрэд, Чэсь, Марыся, Тарэса), Юстынавы (Пётра), Грыцыянішыны (Вэрцька і Антон), Вацявы (Ігналя і Юзафка), Віліны (Вандзя), Баляськовы (Чэсь і Булеся), Рублеўскага (Галя), Адэліны (Гунэфа, Анэта), Анцюціны (Бронька, Вацюня, Альфрэда), Міхасёвы (Вацюк, Адась, Юзючок), Казючышыны (Янусь, Гжэсь, Балясёк, Марыля), Адамавы (Юзюня і Аліна), Рафалавы (Антон і Юзэфка), Бронічкавы (Геня, Мар’ян, Юзік, Янка, Марыся, Рэнька, Франя), Драздовы (Ядзя, Стася, Манюся, Фрося, Владзька), Мартулёвы (Янка, Крыся, Аліна), Савэравы (Зося), Тумашковы (Вандзя, Ягуся), Францішкавы (Зымон, Альжуня, Франя, Яніна), Маскалёвы (Калюсь і Юзік), Хвэлічкавы (Аня, Калюсь, Мікоды, Юзюк…), Букавы (Анэтка, Юзік), Каралёвы (Франак).

Акрамя таго, амаль ў кожнага ў сяле была мянушка. Апішу сваю сям’ю. Тату Лёнюся звалі Курносы, а маму Вырусю – Бацян, мяне, Зютака, – Зюс. Астатніх, каб не пакрыўдзіліся, не буду называць пайменна, а толькі па мянушках. Квачы зразумеюць, да каго яны адносяцца. Мянушкі самыя незвычайныя, але трапныя. Сярод іх Совы, Вялікае Вока, Бежонцы, Грамафон, Русланава,

Харытон, Хлуса, Пчала, Взу, Клос, Крывы, Начынне Паважнае, Потла я ўзо, Бліць, Плішкуны, Авечка, Чурыла, БРВ, Жыдок, Джык, Кароценькі, Хы-хы-тфу-тфу, Кіндэс, Кілбаса, Васямнасця, Рыжы, Белы, Каста, Чапля, Шчэрба, Юлач, Бурдус, Заяц, Нявестка, Шапка-боты, Кветка, Пася, Бадзіня, Смыль-дуга, Біч, Алгапаўсцік, Мардасава, Ежэлі, Калпачок, Вух-спірт, Цісь-цісь, Габлюк, Хам, Чарнавік, Янот, Піхата і іншыя. Мянушкі даваліся часам за знешні выгляд, за ўжываемыя словы, за звычкі, за паходжанне. Але яны настолькі поўна і ярка перадавалі сутнасць чалавека, што каб і хацеў, то лепшае нешта не прыдумаеш. Ну вось, напрыклад, Калпачок. Гэта – Гуня Войтава (прабач мне і душы яе неба). Прыгожая, відная, на выданні, так бы мовіць, красуня, заседзелася ў дзеўках. Ну, а каб не траціць сваю прывабнасць і ў 40 і ў 50 вымушана выкарыстоўваць самую сучасную на той час касметыку: пудры ды памады з калпачкамі. Вось і прызвалі калпачок. Ды яшчэ склалі прыпеўку:

*Калпачок, калпачок,*
*Табе замуж врэмя.*
*Многа, многа табе лет.*
*Ты ўсім надаела!*

Ну і яшчэ пра адну зусім бяскрыўдную мянушку. Радзевіч Мільку звалі Васямнасця. Чаму менавіта так, а не па-другому? Тлумачу. Выбіралі бабы бульбу з-пад капалкі. Мой брат Толік быў на практыцы ў калгасе і пісаў ім кошыкі. Баб было больш за дваццаць, і кожная, высыпаючы свой кошык выкрыквала адпаведны нумар. Крычаў кожны, але так прыгожа, напеўна, па-літоўску расцягнута магла толькі цёця Мілька. Я і сам на той час бываў на бульбе і не дам зманіць, што нібы мянушка не к месту. Ужо тады, пасля яе выкрыкаў “Васямнасця”, жанчыны падтрун带вали над ёй.

# Вяселлі

Вяселле – адметная падзея не толькі для сям'і і родных, але і для ўсіх, амаль без выключэння, аднавяскоўцаў. Не сказаць, што я шмат на якіх пагуляў, але добра памятаю вяселле Лёні Кавалёвай, Янака Фэлінага, свайго брата Толіка і Клёфусавых Анькі з Ірай ды Гэлькі Вандзінай, на якіх і сам гуляў. Першыя два запомніліся таму, што яны былі амаль што па-суседству. Лёніна адбывалася летам, і мы, малыя, праціскаліся ў хату. Яно мне запомнілася шумным, з песнямі і Ясевай ігрой на акардэоне. Ён іграў марш, а яго сястра Монька дапамагала і торкала яму ў кішэнь падораныя грошы. Дарэчы, тады на марш усіх сватоў віншаваў гарманіст і іграў усім аднолькавую мелодыю. З тых часоў я яе запомніў і цяпер сам магу яе сыграць на гармоніку, канечне ж, са сваімі варыяцыямі. Вяселле Янака запомнілася тым, што ўжо было холадна, мароз, але без снегу, і ў Квачах у адзін дзень было яшчэ вяселле Юзафкавага Янушкі. Янак быў старым кавалерам, на багата старэйшым за Лільку. Яна была вельмі пекная, як дарэчы і цяпер. Я таксама прайшоў у хату. І тут мне запомнілася Геня Петрусёва. Яна была за афіцыянта, падносіла стравы і выконвала гэту адказную работу з гонарам і форсам, высока трымаючы галаву (бо і сама яшчэ была на выданні і, напэўна, не траціла нейкую надзею). На кожнае вяселле збіраліся мужчыны і строілі браму. Для гэтага перад уваходам у дом укапвалі ў зямлю дзве бярозкі, вярхі ў іх злучалі, як маладых, да пары. Ставіўся столік, а на ім пачастунак для маладых (звычайна па чарцы віна). Калі маладыя прыязджалі з ЗАГСа, то яны мусілі былі прайсці праз браму. Тут іх віншавалі. Помню, у нас звычайна гэта рабіў Федзя, прыгожы падцягнуты з Карабоў муж Зоські Ан-

тончыкавай, былы дэсантнік. Мог прыгожа па-руску сказаць словы віншавання. Маладым крычалі “Горка!”, пры гэтым, бывала, Казік Янэчкаў страляў з ружжа. Астатнім брамнікам, такім, напрыклад, як мой бацька або Пётра Юстынаў, даставалася не такая адказная, але не менш прыемная місія – напіцца за здароўе маладых. Дарылі шчодра і самагонкі па звычаю выносілі вядро. А перад гэтым яшчэ маладым мы, малыя, закладвалі “рагатку”. Перацягвалі дарогу вяровачкай і затрымлівалі вяселле. Звычайна нам даставалася пара жмень цукеркаў, для нас тады і гэта была вялікая радасць.

А ўвогуле вяселлю папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа. Спачатку раіліся са сватамі, колькі будзе гасцей. Затым дамаўляліся са сваякамі, хто дапаможа гнаць самагонку, каго запрасіць за кухарак. Вянчаліся ў той час не ўрачыста, а хаваючыся, бо за гэта праследвалі, таму выконвалі гэты абрад заранне. А некаторыя нават і не вянчаліся. Памятаю, як жаніўся наш Толік, то якраз тады падаражэла гарэлка. Раней яна каштавала 3р.62к., а стала можа 4р.20к. Тады гэта было дорага, і купілі, знайшоўшы недзе па 3р.62к. “Зуброўкі”. Але потым шкадавалі, бо пілі яе не ахвотна. Самагонку Толік заказваў недзе аж у Докшыцкім раёне, для чаго вазіў туды жыта. Частку мы гналі дома. Бабка заварвала, а мы з татам гналі на нашай старыцы. Там было спецыяльнае места, дзе гналі спрадвеку. Для халадзільніка была выкапана спецыяльная копанка, адкуль бралі ваду. Дровы ў амшары былі на месцы. Мы таксама дапамагалі бацьку. Трэба было падліваць халодную ваду, сачыць, каб быў адпаведны агонь, каб не папёрла ў трубку брагу, зліваць у адно месца гатовы прадукт. Ніхто нас там не трывожыў, толькі адзін раз забрыў, не ведаю адкуль, Валодзя Вілін. Хаця яму тады было ўсяго 13 год, але бацька не пабаяўся наліць яму сто

грам, каб мацней трымаў язык за зубамі. Напярэдадні вяселля зарэзалі з калгаса бычка, закалолі кабана, што трэба дакупілі (дэфіцыт быў на зялёны гарошак). Строілі (гатавалі) на вяселле, акрамя сваіх, Рэнька і Гунэфа.

Вяселлі раней былі часцей на два канцы, а ў нас было на адзін, бо нявестка (Светка Сарокава са Стураўшчыны) на той час жыла з маткай ў Рызе. Госці збіраліся недзе на часоў 12. Сталы былі ўжо накрытыя. Маладыя сядзелі за сталом. Госці падыходзілі і дарылі маладых (звычайна па 5-10 рублёў у залежнасці ад заможнасці сватоў). Бацькі і хросныя клалі на талерку больш. Садзіліся за першы стол і, даволі добра падсілкаваўшыся, ехалі ў сельсавет запісвацца. Пасля прыезду гулянка працягвалася. Гадзін да 8-10-ці.

Нас, хто быў на вяселлі, хлопцы прасілі вынесці чаго-небудзь выпіць, і мы стараліся выканаць іх просьбу, ціхенька заткнуўшы сабе за пояс пачатую паўлітроўку. Вяселле суправаджалася бясконцымі вясельнымі песнямі (былі і народныя, такія, як “Касіў Ясь канюшыну” і сучасныя), жартамі. У парозе тоўпіліся бабы, што прыйшлі паглядзець на вяселле. Іх таксама частавалі. Помню, на Толікавым вяселлі была Клаўдзя Кавалёва, сядзела ля печкі і спявала даўнейшыя вясельныя песні. Ёй нехта дапамагаў. Спявала яна прыгожа, але песня была невясёлая, пра нялёгкую долю маладой, якой трэба жыць у чужой сям’і. Шкадую, што тады мне яна была не цікавая, як і ўся старына. А больш нідзе потым я падобных песень не слухаў. Затым ішлі на танцы. Танцы заўсёды бывалі ў канторцы (прасторная хата, дзе збіраліся на нарад). Перад гэтым прасілі Зымонаву Вацюню, каб яна там прыбрала і дала ключ. На танцы сыходзіліся не толькі сваты з вяселля, але і мноства аднавяскоўцаў. У паўзмроку з адзінай лямпачкай Ясь ці іншы гарманіст іграў полькі ды вальсы,

а сваты танцавалі. Гэта была добрая нагода патанцаваць усім жадаючым, што яны і рабілі. Старыя бабы займалі ўсе лаўкі ў памяшканні і павінны былі ўсё выгледзець і ўсіх абмеркаваць. Моладзь соўгалася то ў памяшканне, то вон (пакурыць, глынуць, пасвіданчыць, пабіцца), дарэчы, для апошняга было шмат нагод, бо на вяселле прыходзіла моладзь з другіх вёсак. Маладыя хутка сыходзілі цешыцца сваёй першай шлюбнай ноччу, а мо для каго і не першай. А танцы працягваліся далёка за поўнач, недзе гадзін да трох. Пасля сватоў разводзілі па хатах спаць, каму не хапіла выпіўкі, заходзілі ў вясельную хату дабавіць (там былі гатовы да парыёму такіх гасцей). На другі дзень за стол сядалі недзе пад абед. Сваты пілі, спявалі, нешта расказвалі адзін аднаму.

На другі дзень вяселля маладая адорвала блізкіх свайго нарачонага. Бацьку, хроснаму, а таксама братам маладога дарыліся кашулі, а матцы, хроснай і іншым жанчынам, як тады было ў модзе, адрэз тканіны на сукенку. Пры гэтым свацці, што круціліся вакол дарэння выхаплівалі падарунак, раскручвалі яго і танчылі разам з адораным. Такі звычай. Малады адорваў родных маладой грашыма.

Добра паддаўшы, пачыналі чмурыць (вырабляцца). У нас Федзя пераапрануўся ў цыгана, яго падмалявалі, узяў заслонку ад печы і падыграваў на ёй, як на барабане. Затым ігралі традыцыйны марш, і к вечару госці разыходзіліся. Калі вяселле было на два канцы, то ў адрозненні ад вышэй апісанага, былі некаторыя змены. Сваты маладога прыязджалі перад запіссю да маладой і выкуплівалі яе. Гэта гульня часам зацягвалася надоўга, і калі дружкі (сяброўкі) маладой былі вельмі патрабавальныя (прасілі замнога грошай за маладую, а час да ЗАГСа падЖымаў), то сваты маладога маглі ўзяць непрыступны бастыён і штурмам. І яшчэ ў такім вяселлі на другі дзень,

дзесьці пад абед, вяселле пераязджала гуляць да маладога. І там гулянка працягвалася ўсю нядзелю, а часам і ў панядзелак. Канечне, не ўсе вытрымлівалі такую "нагрузку" на вантробы (унутраныя органы). На панядзелак заставаліся толькі самыя стойкія гулякі ды лайдакі.

## На Купала ночка мала

Ноччу з 23 на 24 чэрвеня ў нас моладзь святкавала, як мы называлі, Ян. Больш у гэтым святце было, канечне, ад Купалы, бо скаканне праз агонь і іншыя магічныя дзеянні хрысціянства не адабрае. Нам жа гэта было цікава. Праводзілася яно ў нас каля ракі, каля купальні. Старэйшыя хлопцы стараліся прывезці адкуль-небудзь гумавых пакрышак. Складалі іх ў высокую піраміду і з надыходам цемнаты падпальвалі. Тады пра экалогію не думалі, і паліць пакрышкі ніхто не забараняў. Калі агонь спадаў, то знаходзіліся смельчакі, што пачыналі прыгаць праз касцёр. Помню, адзін раз Базыль (Вася Працук) скакаў, калі касцёр быў яшчэ досыць высокі, ну і ён жа быў у нас "вухар". Разагнаўся і прыгнуў "шчучкай", а пры прызямленні яшчэ хацеў перакуліцца. Прыгаючы, зачапіўся за гарачы дрот, прапаліў не толькі штаны, але і на сцёгнах засталіся добрыя палосы. Папараць-кветку шукаць імкнуліся хіба вельмі закаханыя, каб далей ад вачэй пазажымацца, бо навокал не было нават кустоў.

А вось на сапраўднае Купала мы ездзілі ў Лапішкі. Яно было 6 ліпеня. Там касцёр рыхтавалі з дрэў, галля, было старое кола. Свята праходзіла за вёскай, каля лесу. Прыходзілі жанчыны і спявалі сапраўдныя купальскія песні. Сярод іх такая:

*Сягоння Купала – заўтра Ян,*
*На святога Купала дзеўкі зёлкі капалі,*
*Яны капалі і не зналі,*
*Да караля паслалі,*
*Кароль зёлак не пазнаў,*
*Да каралевы паслаў.*
*Каралева пазнала,*
*І ўсім дзевачкам сказала,*
*Гэта, дзевачкі, не зёлкі,*
*Гэта, дзевачкі, Купена,*
*Гэта дзявочая красата,*
*А хлапечая любата.*

Гэта свята ў Лапішках было больш насычана старадаўняй абраднасцю і збірала шмат людзей з навакольных вёсак.

## Танцы

На танцы моладзь у наш час звычайна хадзіла па выхадных і святах у клуб у Дзеркаўшчыну. Туды было недзе каля шасці кіламетраў. Дабіраліся туды, хто як мог: часам пры добрай дарозе маглі пад’ехаць на калгаснай лятучцы, на веласіпедах, але найбольш папулярнымі былі матацыклы або пехатой. “Гаісты” тады наязджалі рэдка, і здаралася, што матацыклісты насіліся п’яныя і нават забіваліся насмерць. Дарога праз Альховікі тады была нікчэмная, і часцей за ўсё даводзілася хадзіць туды пешшу. Але калі ідзеш гуртом, то весела і дарога здаецца карацейшая. Іншая справа, калі вяртаешся дамоў адзін пасля “поводзэння” (провадаў дзяўчыны) з якіх-небудзь Лапішак ці Латыгала! Прыйдзеш дамоў – аж пяты гарэць!

Танцавалі звычайна медленны, шэйк, часам, але рэдка факстрот або вальс. Усё гэта пад пласцінкі, а потым пад магнітафон. Моладзі звычайна збіралася шмат, часам яшчэ прыязджалі на працу студэнты. Гэта было добрай падставай завесці знаёмствы з новымі дзяўчатамі ці пабіцца з іх калегамі. Дарэчы, пра бойкі. Біліся звычайна з чужымі. Са сваімі рэдка. Сваімі для нас былі Альховікі і Стураўшчына. Дзеркаўшчына – гэта чужыя, і асабліва варагавалі з "партызанамі" (Латыгала, Завараты і ўся тая старана). Мне ў бойках асабліва ўдзельнічаць не даводзілася, а вось за Квачамі цягнулася дрэнная слава. Я не бачыў у справе, але казалі, што добрымі біткамі ў нас былі Янка Мартуль і Алік Рудак, Аблам Стась, а ў Стураўшчыне вызначаліся браты Сарокі (Казік і Рысік). З партызан называлі нейкага даўгога, метры са два ростам. Цяпер мы жывём з ім у суседніх вёсках і маем добрыя стасункі. Гэта Гігола Сцяпан з Ласкаўшчыны. Бойкі праходзілі без панажоўшчыны і да калецтва не даходзіла, хаця ўзяць нешта ў руку ахвочых было не мала. А такога, як даўней, каб з каламі ды нажамі не было чуваць.

# А каб кароўка не прапала!

Кароў у нас трымалі ў кожнай сям'і і па адной. Дзве маглі быць толькі ў таго, хто хацеў памяняць карову. Ва ўсіх рагулі былі ў вялікай пашане, бо былі сапраўднымі карміцелькамі. А вось самім ім кармоў у наш час вельмі не хапала. Касілі толькі па лугах ды няўдобіцах. Але і тое спачатку добра абразалася. А якім чынам? Усім адшчапенцам (хто працаваў не ў калгасе) даводзілася заданне выкасіць па тры гектары. Такім быў і мой бацька. Што касіў сам, што дапамагалі мы, некага наймалі. Але трэба было абавязкова выкасіць,

бо не дадуць укосу (дзялкі). А такіх адшчапенцаў у Квачах было не адзін, а можа з чатыры. Яны выкошвалі самыя лепшыя лугі ў калгас. Што заставалася, дзялілі між сабой, а гэта не мала, а прыблізна на 65 гаспадароў. Стваралі камісію. У яе звычайна "выдзвігалі" маю маму, Эдзіка Лавутавага ад механізатараў, Рублеўскага, Паўлу. Яны абыходзілі ўсе сенакосы і вызначалі, колькі ў якім месцы можна накасіць сена, запісвалі гэта. Напрыклад, вызначылі, што ўсяго сена на 65 вазоў. Значыць, на карову па возе. І глядзелі па спіску. Ну, напрыклад, на Хвашчоўцы 6 вазоў. Па парадку па спісе яе аддавалі шасці суседзям і г. д. Ужо гэтыя суседзі і ішлі дзяліць тую Хвашчоўку на дзялкі. Іх магло быць і па пяць, і па дзесяць, бо гэта ж не было роўнае поле, а розныя ўзмежкі, канаўкі, акрамускі (тое, што засталося). За дзяльбу членам камісіі выдзялялі па нейкім возе сенажаці дадаткова. З дзялак накошвалі не больш двух вазоў. А на зіму ж трэба вунь колькі, і з калгаса, як цяпер, рулонаў не давалі, і так смела не ўкрадзеш. Займалі бабы, дзе больш з травой лён, рвалі яго і касілі ллянішча, касілі іржышча, дзялілі атаву. Давалі з калгаса па пару капніцеляў саломы. Мама купляла ў рачніка ўчастак ракі, каб можна было скасіць на сена. Вось так нялёгка дабываліся кармы. Я памятаю, калі яшчэ малако не прымалі, а трэба было здаваць план маслам. А дзе яго столькі возьмеш? Маці ехала ў Глыбокае або Паставы і купляла там масла на рынку ці ў магазіне. Затым фармавала яго ў формачках і здавала, як ад сваёй каровы. Калі пачалі прымаць малако, то помню, што ў нас заўсёды гэту работу рабіла Юзюня Адамава. Спачатку трэба было малако да яе насіць самім здатчыкам. Потым ёй далі каня Марынчынага, і яна сама збірала малако па хатах, а летам ехала туды, дзе стаялі каровы ў абед. А каровы ў нас пасвіліся то ў Хмялінцы, то на Балоце. Гэта летам, а ўжо восен-

ню там, дзе прыдзецца, дзе ёсць трава (і ў Навінках, і па Слісаршчыне – ўсюды). Электрапастуха тады не было, і адбывалі радоўку па чарзе па трое суседзяў. Часам пасвіў і я. Старэйшыя, напрыклад, Янэчык, ці Вінцуська камандуюць, ну а я стараюся і бегаю, адганяючы кароў ад шкоды. Выводзілі кароў рана, недзе каля пяці гадзін, і кожны вёў на гужыку сваю карову. Часам будзілі і мяне завесці карову, калі бацькам не выходзіла. Ой, як тады хацелася спаць! Разбіраць кароў (забіраць з поля) таксама трэба было кожнаму, і тут было ўжо весялей. Часу было і ў нас, і ў старых, і мы выходзілі па кароў зарання, за гадзіну ці нават больш. Старыя часам гулялі ў карты, абмяркоўвалі навіны, пагаварыць ім было пра што. Мы, дзеці, таксама не марнавалі часу. Каля Альжбеткі пад Хмялінцам бегалі па кустах, кідаліся коп’ямі, гулялі ў карты, у рэпку, курылі, палілі вогнішча. Летам кароў прыводзілі недзе каля дзевяці гадзін. Глядзелі праграму “Время” і пілі цёплае, з-пад каровы малако.

# У чарзе за… калам

Так, не здзіўляйцеся, у эпоху татальнага дэфіцыту прыходзілася адстойваць і такую ганебную чаргу. Справа ў тым, што ў наш час кармоў для свіней, як цяпер, не хапала. Зерня на сваіх 20-30 сотках колькі ты пасееш? Мукі ці камбікорму не дакупішся з-за дарагоўлі. Выкормлівалі кабаноў бульбай, буракамі, ахрап’ем, хлебам ды конскім калам. Так, на гэту справу ішоў хлеб, бо ім было карміць выгадней, чым купляць муку. Бралі на рубель шэсць буханак хлеба, размочвалі і ўмешвалі ў корм свінням. Кал быў не толькі, як напаўняльнік. Казалі, што ён для свіней і здарова, і сытна. Дык вось пра чаргу за гэтым дабром.

Коней у нас на брыгадзе было недзе каля дваццаці. Прыязджаем зімой за калам у канюшню на саначках, а там чалавекі чатыры ўжо стаяць таксама з кошыкамі ў чаканні, калі ж які конь”разродзіцца дабром”. Прыходзіш, а коні ўжо падзеленыя, з-пад якіх каму збіраць. Выдзяляюць і табе штук са трох. І колькі ж так трэба выстаяць, каб набраць поўны кошык? Мы, дзеці, знаходзім сабе нейкія гульні-забавы, старым таксама, у каго хапае часу, пагаварыць у радасць. А хто хітрэйшы ды спяшаецца, то залезе ў стойла ды набярэ ўтаптанага даўнейшага калу. Мы ж чакалі толькі свежага, а часам прыходзілася вяртацца дамоў амаль ні з чым. Летам было яшчэ цікавей. Калі коні пасвіліся на брыгадзе, то адшукаць іх было не цяжка, а вось калі на нашай старыцы або пад Беляўцамі, то часам яны і добра зашываліся дзе-небудзь ад аваднёў у кусты. Летам з братам Пецькам за калам мы ездзілі на веліку. Кошык ушчэмлены ў багажніку, я сяджу на раме, а ён круціць. Гэта ўлегцы (без грузу). А вось назад, ды калі яшчэ дрэнная дарога, то я бягу ззаду і падтрымліваю кош, а калі пад горку, то часам і падпіхаю. Вось так і навучыўся добра бегаць і не вельмі грэбаваць сабраць той кал голай рукой. Хаця і ў наш час былі такія чысцюлі , што бралі для гэтай патрэбы з сабой савок. Старыя падсмейвалі, што такому далікатнаму не працаваць ля скаціны.

## Працадзень мой, працадзень, зноў у сра..у цэлы дзень!

Не, калі мы ўжо падрасталі, то нашы бацькі за работу ў калгасе атрымлівалі не толькі палачкі ды па некалікі грамаў зярна на працадзень, а іх ужо перавялі на грашовую аплату. Хаця якая гэта была аплата. Атрымлівалі нейкіх 30 -60 рублёў у месяц за цяж-

кую ручную работу на холадзе, спёцы, ветры, пад дажджом. На працу хадзілі на брыгаду. Збіраліся каля дзевяці гадзін у канторку. Прыязджаў брыгадзір (Аляксандра, а пасля Мурашка) і даваў нарад. На нарад прыходзілі ў асноўным жанчыны, з мужчын у паляводстве быў, мусіць, толькі Пётра Юстынаў, астатнія, хто на трактары, хто падвозчыкам, хто па арганізацыях у Глыбокім. У канторцы стаяў тэлефон, адзіны на ўсю вёску. Брыгадзір узгадняў па тэлефоне нейкія пытанні са старшынёй і пасля гэтага даваў нарад на месцы. Работы хапала ўсім і заўсёды, бо амаль усё рабілася ўручную, вырошчвалася шмат працаёмкіх культур, такіх, як буракі і лён. Зімой вазілі гной ад фермы, секлі лапкі на муку, ачышчалі і пратраўлівалі зерне. Вясной падсявалі сялітру, збіралі па палях камяні, сеялі канюшыну і засявалі нізкія месцы, дзе не ішла тэхніка. Летам убіралі сена і звазілі яго на конях, палолі буракі, рвалі лён, малацілі яго, рассцілалі, а калі вылежваўся, звозілі на такі для далейшай сарціроўкі. Восенню выбіралі бульбу, капалі буракі, сарціравалі лён.

Мы, дзеці, у час летніх канікул таксама працавалі ў калгасе. Нам было не толькі цікава зарабіць некалькі грошы, а тое, што разам было весялей, чым нешта рабіць дома. Пачыналі хадзіць на работу мы дзесьці з класа пятага-шостага. Нас спачатку пасылалі ўкладаць сена, якое старэйшыя прывозілі ў такі да фермы. Тут было раздолле. Мы скакалі з перарубаў, рабілі сальта і так як нас было шмат, то мы паспявалі і сена укласці, і нагуляцца. Помню, прыходзіць Антон Заяц (ён быў загадчык фермы) і кажа: “Мальцы, толькі не курыце на сене!” Мы і не курылі, а выходзілі за ток. Калі мы ўжо падужэлі, то нам і самім сталі давяраць коней. Мы збіралі па полі каменне, часам нейкія пагробкі, а мой брат Пецька працаваў і на грабілцы. Коні тады былі спакойныя, і мы з імі добра

ўпраўляліся. Папярэдне падзялілі іх між сабой, і кожны меў свайго каня. Коні я помню і цяпер і, напэўна, моцна не памылюся, калі назаву іх клічкі. Гэта былі Сівы, Сівая Малая і Сівая з Булдавой, Гняды і Марынчын, Красаўка, Карабоўская, Гінькаўская, Чорненькая, Каштан і Бочачка, Лысы і Лысы з даўгімі заднімі капытамі, Брыгадзірава.

Канюхом тады быў Юзафка Вацяў. Ён выдаваў нам вупраж у залежнасці ад таго, на якім кані хто працаваў і абавязкова казаў, каб мазалі калёсы. У абед мы прыязджалі на конях дамоў, распрагалі іх і навязвалі недзе ў кустах, каб тыя адпачылі ды паелі. Мы таксама адпачывалі, а то яшчэ паспявалі і на рэчку з'ездзіць ды скупнуцца. Часам ездзілі нешта рабіць на конях у Беляўцы, бо гэта была адна наша брыгада. Назад едзем, пяём песні (дарэчы, песні ў час адпачынку спявалі і жанчыны), а часамі нешта творым. Прычэпім да калёс вялізны сук, нехта на яго сядзе ды па кані. І такога пылу дадзём па Беляўцах, што дарогі не відаць.

Асабліва любілі мы хадзіць на работу, калі ўбіралі зярно. Нас замацоўвалі за машынамі, і мы павінны былі разраўноўваць зярно ў кузаве, а так, як многа было не самазвалаў, то яшчэ і высыпаць зярно на мехтаку. Цікава было каля тэхнікі, цікава было ехаць наверсе на зярне (цяпер бы ніхто такога не дапусціў па тэхніцы бяспекі), але тады ўсё неяк абыходзілася ў нас без ЧП. Яшчэ, калі кармілі камбайнёраў, то давалі нешта і нам. Часам, як задажджыцца, то і мы сядзім, чакаем пагоды, лазім па камбайнах і машынах, асвойваем невядомы нам свет тэхнікі.

За работу атрымлівалі за лета мы, можа, па рублёў пяцьдзясят. Хто больш, хто менш, у залежнасці ад таго, як хадзілі на работу. А калі ў верасні ішлі ўжо ў школу, то калгас уручаў нам нейкія падарункі за аказаную дапамогу.

# Небяспечны асфальт

Будаўніцтва шашы Полацк-Вільнюс, што праходзіць у 20 метрах ад нашай хаты, мела як плюсы, так і мінусы. Са станоўчых момантаў можна назваць тое, што ўсталявалася трывалая і зручная сувязь з Глыбокім, Дунілавічамі, Варапаевам, Паставамі. За дзень аўтобус шэсць разоў ішоў у адзін і ў другі бок. У той час сваіх машын не было, а ў Глыбокае ў буднія дні на працу ды вучобу ў СПТВ з Квачоў ездзіла чалавек па дваццаць ці нават больш. У нядзелю набіваліся поўныя аўтобусы для паездкі ў касцёл. У Глыбокае білет каштаваў 20 капеек, а ў Паставы недзе каля сямідзесяці. Акрамя таго, можна было пад’ехаць на папутцы. Па новай дарозе вазілі розныя грузы, і нешта можна было прыкупіць. Так мы куплялі торфабрыкет, часам муку, дошкі і інш.

Разам з тым дарога прынесла і шмат нязручнасці і небяспекі. Ну, па-першае, і дзень і ноч стаяў шум ад машын, ад цяжкіх аж трэсліся вокны. На дарозе гінулі свойскія жывёлы: каты, сабакі і асабліва ў час ўборкі куры, бо машыны, перавозячы, растрасалі зерне. Здараліся і аварыі. Памятаю, была вельмі снежная зіма. З’ехала ў канаву і перавярнула прычэп машына з брыкетам. Яе выцягнулі, а брыкет кідалі ўручную, дапамагаў і мой старэйшы брат Толя. Адзін раз неяк ранняй вясной мужчыны з Дзеркаўшчыны ехалі ў Квачы за віном на “Беларусу”. І праз скрыжаванне паехалі не па дарозе, а прама да нас ў агарод, зламаўшы плот. Прызямліліся ўдала, нават трактар не перакуліўся. Выехалі і паехалі здаровыя далей за віном.

А вось і вельмі страшны выпадак. Ізноў жа з Дзеркаўшчыны ехала машына “ГАЗ-53” і не прапусціла, едучы па галоўнай дарозе з Наваполацка, смалавоз. Абед-

зве машыны зноў жа апынуліся ў нашай канаве. І ўсё гэта якраз на маіх вачах. “ГАЗ-53” пацярпеў моцна. Шафёра дасталі пабітага, але жывога. Бочка смалавоза перавярнулася і смала пацякла ў нашу канаву, далей праз дарогу па трубе і ў канаву да Янэчыка. Гэта было зімой, і смала хутка застыла. А вось летам, як растаяла смала! Помню, іду я аднекуль і бачу: сядзяць уліпшыя нашы дзве курыцы. Нейк выдралі іх ледзь жывых, паабразалі пер’е, а смалу як не засыпалі, яна праступала ізноў. Не адзін раз і Янэчык выцягваў са смалы ўжо нежывых сваіх галандскіх пісклят. Гэта яму настолькі надакучыла, што пасля ён выдзёўбваў смалу і некуды закопваў.

На маёй памяці трагічных выпадкаў на асфальце, дзякаваць Богу, не было. А вось потым, калі я ўжо з’ехаў, як згадвала мама, то загінуў на скрыжаванні матацыкліст, ізноў жа не прапусціўшы па галоўнай дарозе машыну. Была аварыя і каля глыбоцкай астаноўкі, дзе загінулі ў аварыі ажно два чалавекі пры сутычцы двух аўтамабіляў. Адным словам, вялікая дарога – гэта і вялікая небяспека.

## Нявыдуманыя гісторыі, або шафа з “перацанёнага”

Напэўна, у кожным сяле былі і ёсць людзі, якіх хлебам не кармі, а дай ім толькі выгаварыцца, а яны табе такога набаяць, што і самі ў гэта павераць. Такім ў Квачах быў Антон Мацкевіч. Я яго баек не слухаў, бо ледзьве яго памятаю, аднак жа слава манюкі замацавалася за ім трывала і, напэўна, не без падстаў. Нездарма, калі нехта з расказчыкаў пачынаў хлусіць, то гаварылі, што вось” залівае”, як той Мацкевіч.

Аднаго разу ішоў з рыбалкі Фульгент Пархвенаў, а

рыбак ён быў сярод нас прызнаны і аўтарытэтны. Злавіў толькі аднаго шчупачка, шкада яму стала рыбіны, вось і выпусціў яго Мацкевічу ў калодзеж. А Стася, яго дачка, неяк і выцягнула таго шчупака ды і прынесла гэта дзіва паказаць бацьку. А той пусціў послаўку, што раней бывала такое разводдзе, што рыба з гулідаўскага возера да яго заплывала аж у калодзеж, і як той абмялее, чэрпаў яе аддтуль, нібы селядцоў з бочкі. Прыдумваў Антон, напэўна, і не такое, ды я пра ўсё не ведаю.

А вось гэта гісторыя нявыдуманая і тым не менш вельмі яскравая і паказвае разнастайныя вясковыя вобразы і характары. Неяк купіла Мілька новую шафу і прывезла яе на кані дамоў, вядома ж у разабраным выглядзе. Даўнейшыя былі неразборныя. Прывёз, паставіў у належным месцы і любуйся ды карыстайся. А тут жа яшчэ трэба складаць. І пакуль да справы, занеслі яе ў хату, распакавалі.На кардон рашылі, як заб'юць кабана, складваць сала з мясам, пакуль астыне. Былі яшчэ нейкія тры "дыхціны". На дошкі яны былі тонкія ды і гнуліся, як для кардону, то занадта цвёрдыя. Рашылі выкарыстаць іх пасвойму. Адзін ліст паклалі перад парогам, каб выціраць аб яго ногі, бо шмат гразі нясецца ў хату, другі ліст гаспадыня падаравала на такія ж патрэбы сваёй суседцы Сарафінцы, ну а трэці выкарыстаў меншы сын Алег: гуляючы, цягаў на ім пясок. Як "каснулася " да справы, давай жа складаць шафу. Круцілі, круцілі, перад неяк скруцілі, а задняй сценкі няма. Думалі ўжо, што можа трэба задам да сцяны прыстаўляць, што цяпер так эканомяць. Але як жа так! Павінна быць усё належным чынам. І так і так давадзілі – нічога не атрымліваецца. Рашылі пазваць каго больш спрактыкаванага і "вушлага" (дасведчанага) ў гэтай справе. Прывялі Броньку Анцюцінага. Той таксама доўга разглядаў, і так, і так мергаваў (раіў). А ў канцы

замест парады запытаў: “Мілька, а дзе ты гэту шафу купляла, можа ў перацанёным?” На што тая ў расстройстве выругалася: “Пя…да ты, у мэбальным!”

Шафу зляжылі потым, калі паглядзелі ў некага падобную, ужо купленую раней. Добра, што лісты ДВП не паспелі размокнуць ад дажджу. І новая шафа заняла свой пачэсны пасад побач са старой, але яшчэ даволі дыхтоўнай (моцнай) дзедаўскай.

# Усубынскі з’езд

Упершыню гэта выслоўе я пачуў у Ваўкоўскай школе ад Кабылінскага Паўліка. Ён хлопец быў цямкі (дасведчаны ва ўсіх пытаннях), мог каго хочаш перадражніць і асабліва падтруньваў над старымі і іх мудрагелістымі словамі. Часам ён мог сказаць нешта такое, што мы першы раз чулі. Але ж, давяраючыся ягонаму інтэлекту, прымалі безагаворачна, як кажуць, на веру. Вось і мне ён расказаў пра нейкую сходку бабулек, што збіраліся летам на лаўцы каля Вацюка, дзе жыла яго цешча Тумашкова Сабіна. Проста я тады не разабраў добра. Як мне потым сказала яе ўнучка Вандзіна Ленка, называлася гэта збюрка (сходка) “У Сабінкі з’езд”. Параўнайце дзве гэтыя назвы. Першая, канечне ж, выйграе і перш за ўсё сваёй таямнічасцю і ад яе павявае нейкай блізка – ўсходняй веліччу і загадкавасцю. Яшчэ б, тут жа збіраліся, так бы мовіць, аксакалы, мэтры, старажылы Квачоў. Сярод іх гаспадыня лаўкі даўгавязая і худая Сабіна, карчкаватая невялічкая Юста, грузная, з задышкай Казючыха, даволі бойкая і выгляднейшая проці ўсіх Юзэфка Рафалава і самая пакрыўджаная лёсам, згорбленая ў тры пагібелі Марылька. Дарэчы, я толькі нядаўна даведаўся, што яна была сястрой Фульгента Яўхімавага. У яе была самая ад-

метная хата. Адметная сваёй непрыгляднасцю і тым, што на ёй вывешвалі кінаафішы. Гэта крыху адступленне ад тэмы. Дык аб чым жа гукалі(гаварылі), што ўспаміналі, на што спадзяваліся гэтыя яшчэ мікалаеўскія (народжаныя пры Мікалаі Другім) бабкі, што рашаў “Усубынскі з’езд”. У кожнай сваё жыццё, свая сям’я, адпаведна і свае болькі. У Юсты ўсе размовы пра сына Вілюся і шматлікіх унукаў, што жывуць у Карабах, часам успамінае свайго Адолю. Сабіна больш расказвае пра сваю дачку Ягусю, што жыве ў Полацку, што зяць Вацюк, выпіўшы, назаўтра шукае пахмяліцца, пра нядаўна памёрлага Тумашка. У Казючыхі, каб не задышка, то ўсё куды ўжо і лепей. Усе дзеці ў Квачах і жывуць добра. Марыля за Люцюком Лавутавым, а той “ежэле” і крыкне калі на жонку, то, можа, і трэба ёй. У Баляська жонка спраўная, да работы гарачая, праўда, на язык досыць вострая, бывае, што і сыкне на свякроўку, але ж мусіць цярпець, бо на яе хлебе. У Гжэся таксама хорошая баба – Паўліна Ермакова. У сына, праўда, здароўе не зайздроснае. Трэці сын Янусь мае добрую работу ў Канстантынове, там ён пры нейкім начальніку ў майстэрні. А Юзэфка, поўная аптымізму, не мае на каго паскардзіцца, бо жыве адна, па-гэтаму бесперастанку і хуценька лапоча пра тое, дзе і што чула. Менш за ўсіх гаворыць, а больш слухае Марылька. Яе кароткія босыя ногі далёка не дастаюць з лаўкі да зямлі, а калі што-небудзь і скажа, то такім па-дзіцячы пісклявым галаском. Усё больш уздыхае. Па тым, што не склалася жыццё, бо каму ты патрэбна, калека, па нязбыўшыхся марах і спадзяваннях.

Часам у сваіх успамінах яны пераносяцца ў сваю маладосць. Тады твары іх праясняюцца. Яны абуджаюцца і як бы маладзеюць. Успамінаюць вечарыны, сваіх дзецюкоў, сяброў, якіх так далёка параскідала па свеце, ці

тых, што адышлі ў нябыт. Шмат знаёмых засталіся пасля вайны або потым з’ехалі ў Польшчу. Каму і пра што яны пішуць? Кажуць, што там, у Польшчы, зямлі па 2-3 гектары ў людзей, а не так, як у нас. А Казючыха кажа: “Вось ужо нажылася і паміраць не страшна, ды і што ўжо хворай мучацца? Але вось хацелася б знаць гадоў праз трыццаць, ці аддадуць людзям іх зямлю?” Не, дарагія мае бабулькі. Зямля ваша пазарастала кустамі, і вашы праўнукі права на яе не атрымалі. А калі б і атрымалі, то ці ўзялі б яе? Тую, якая такой дарагой цаной вам дасталася, якая густа паліта вашым потам, што давала працу і кавалак хлеба не аднаму пакаленню шчырых і руплівых гаспадароў!

## На сяло

Раней людзі былі нейкія больш адкрытыя, і, калі так можна сказаць, напэўна, больш душэўныя. Што б ні было ў іх: гора-бяда ці шчаслівая навіна – яны спяшылі падзяліцца гэтым са сваімі суседзямі, а для гэтага, як у нас казалі, ішлі на сяло. І часцей за ўсё гэта было прывілеяй для жанчын сталага веку. Былі, канечне ж, і выключэнні. Ну, напрыклад, часцяком заходзіў да нас Аніказы, дзядзька надзвычай паважны. Ды і як не быць яму паважным, калі ўся яго мажная фігура, павольная гутарка настройвалі кожнага субяседніка на адпаведны лад. Памятаю, калі ён прыходзіў, то заўсёды закураваў махорку, у хаце ў нас станавілася сіне, хоць тапор вешай, а паветра рабілася надзвычай пахучым – такая добрая тады была махорка. А якія цудоўная словы ён ужываў! Маю бабку называў такім ёмкім і мілагучным словам “дзядзіна“. Тады я не ўсведамляў яго значэння. Дзядзька Аніказы так велічаў жонку матчынага ( Анэты) брата (Ганарука) і маю бабку Міхалінку. Дзядзька Аніказы

прайшоў вайну, меў пашкоджаную нагу і хадзіў даволі цяжка, бо быў унушальнай камплекцыі. Памятаю, як ён не аднойчы гаварыў пра свайго няўрымслівага тады ўнука Андрэя: “Эх, майму б унучыку ды дзедушкіны мускулы!” Часам заходзіў да нас і яго родны брат Юзюк і не толькі, каб прывітаць сваю дзядзіну, ён быў хросны бацька майго брата Толі. Знешне вельмі нагадваў свайго брата: тая ж лысіна на ўсю галаву, такі ж каржакаваты, ад усмешкі заўсёды свяціўся, нібы сонца. Жыў ён на хутары ў Слісаршчыне з такой жа добрай і хлебасольнай Марусяй, і была ў іх дачка Марыся. Дзядзька Юзюк быў добры пчаляр. Памятаю, як перад Калядамі пойдзем, бывала, з татам за ёлкай і завітаем да іх на хутар. А для гэтага была добрая нагода. Мы, дзеці,частаваліся мёдам з чаем, якога можна было есці ўволю, ну і бацьку без добрай чаркі дамоў былыя суседзі не адпускалі. Яшчэ помню, што ката цётка Маруся звала Дудар. Потым яны пераехалі жыць у Альховікі і памерлі амаль што ў адзін дзень. Вось, дзе сапраўды людзі жылі душа ў душу і не змаглі застацца тут без пары. Пра такіх кажуць: светлыя Боскія людзі.

Прыходзіў часам Паўла (Начынне паважнае). Мянушка лепшай не прыдумаеш, бо ішоў так, што яйка з галавы не скоціцца, гаварыў толкам і разважліва. Малому запомніліся словы, хоць тады не разумеў іх сэнс : “Не пары да пары, прыйдзе пара – напорышся!” А вось другое яго развражанне тычылася таго, што нібы Анюта Ванькі Цішкінага радзіла свайго Эдзіка ад Антона Зайца не па “абаюднай” згодзе. Паўла казаў: “Ну ніхай бы не хацела яна! Ну вот дам табе нітку, а сам вазьму іголку з вялікім вушкам і буду памаленьку яе вадзіць. Увядзеш ты нітку мне ў іголку? Канечне ж не! Ну вот і ўся тут згода!” Вось такая жыццёвая мудрасць была ў чалавека. А яшчэ Паўла быў добры сталяр, а нам, малым, паказваў розныя штукі.

Казаў, як даўней можна было выйграць нейкую манету. Кладзешся на спіну, а ўверсе галавы на падлозе манета, і так трэба было выгнуць шыю, каб ротам забраць капейку. Я ж прама перад ім з такой задачай спраўляўся.

Не было вечара, каб не прыходзіла да нас на сяло Вінцуська Антончыкава. Родам яна была з Альховікаў, вось і ўспаміны ўсе яе пра Альховікі. І толькі чуеш ад яе:

– А якая вясна даўней была, хіба такая, як цяпер! Выйдзеш на вуліцу, цёпла, ручайкі хлё-хлё-хлё, птушачкі пяюць, вот добра було!

– Бывала, возьме тата ў Канстантынова ў двор. Ну мне ж усюды інцірэсна. Пойдзім у "раждэрню"(аранжарэю), якіх толькі квят там німа, а на дворы зіма. Вот паны добра жылі! Умелі! А каровы якія ў іх галанкі, а коні!

– Маладых мальцаў у нас ўсіх бацькі вучылі касіць на добрым полі і падаўкой (што лёгка косіцца) траве. Помню, Зэнька, брат мой, малы яшчэ, а глядзім –ужо з бацькам косіць. Была ў яго воспа, а я яму абдзіраю гэтыя струпы, і вот жа ка мне не прыстала!

– У-у-у-у, якія цяпер лужы! Вот у нас было! Помню, як зрабілі калаўрот і мяне пасадзілі, а нехта з мальцаў падрэзаў вяроўку. Як раскруцілі ж мяне, як атарвалася, як паляцела, дык добра, што ні ў якая дрэва, а ў снег, алі так далёка заляцела!

# Сілачом стаяў дуб разложысты і здалёк віднеў пышны верх яго

На пагурку, дзе раней жылі Лысыя, рос велічэзны дуб. Не ведаю, колькі метраў ён быў у вышыню, але нам ён здаваўся наймагутнейшым дрэвам, якое толькі можа быць на свеце. У камлі яго дыя-

метр быў недзе каля паўтара метра, а крона сягала аж да неба. Калі мы хадзілі ў Слісаршчыну ў грыбы або ягады, то ніколі не міналі гэтага дрэва. Ён быў яшчэ і добрым арыенцірам, каб не заблудзіцца. Вяртаючыся з лес, мы заўсёды пад ім адпачывалі, бо былі натомленыя дарогай і грузам ягад ці грыбоў. Яшчэ тады паблізу можна было бачыць некалькі даволі вялікіх пнёў ад дубоў, напэўна, малодшых братоў нашага волата.

Мама расказвала, што расло паблізу, на пагурку, недзе каля дзесятка дубоў, і Лысыя іх берaглі, як дбайныя гаспадары. А Лысымі іх называлі таму, што Юзюк Ралавец, так звалі гаспадара, быў лысы, як калена. А калі зямля стала калгаснай і гаспадары выехалі, хто куды (сын Юзаф ў Дзеркаўшчыну, Фэля ажно ў Амерыку, малодшы брат Вінцусь утапіўся), то дубы сталі памаленьку зразаць. Каторы ў калгас на патрэбы, каторы, можа, на бочкі. Рэзалі найбольш падаўкія (танейшыя). Застаўся толькі адзін, як сірата. Застаўся, бо ведалі, што ніхто не дасць яму рады. Я мяркую, што недзе сотні дзве з паловай гадоў гуляў у яго верхавіне вецер, цягнулі з зямлі карані жыццёвыя сокі. І мог бы ён яшчэ стаяць стагоддзі, бо ніякіх хібаў і хвароб, накшталт дуплаў, ён не меў.

Дык не, знайшоўся “герой”, што падняў на яго руку. Казалі, што гэта быў Юзафкаў Янушак. Прыйшоў з бензапілой і не паваліў, а толькі смяртэльна скалечыў дрэва. Напэўна, ён не ўсведамляў, на што замахнуўся і які вялікі прыняў на сябе грэх. Яшчэ гадоў пяць дуб стаяў, вытрымліваючы навалу вятроў. А неяк пасля вялікай буры паваліўся. Яго сталі рэзаць на дровы. Працавалі над ім і мы з бацькам. З дрывамі тады было цяжка, і мы падбіралі сукі, рэзалі ствол на часткі. І ўсё гэта ручной пілой. Добра памятаю кіслы пах пілавіння і дрэва. Нездарма ж у дзежку ўстаўлялі для закісання хлеба дубовыя клёпкі.

Помню, прыязджаў да нас на кані Фульгент Яўхімаў. Яму патрэбен быў матэрыял для бочак, і мы дапамаглі адрэзаць яму калоду. Частку калод у нас украў крывы Альбэрт з Альховік (па мянушцы Чорт), перацягнуўшы іх дамоў на трактары. Бацька хацеў паскачваць іх у раку, але не стаў гэтага рабіць. Самы таўсты камель, даўжынёй метры з чатыры, так і застаўся ляжаць, бо ніхто не мог яму даць рады. А бацьку ўсё ж хацелася прыбраць яго да рук. І вось праз гады тры на сваім “ЭС-100” ён працаваў на дарозе каля Квачоў. Рашыў прыцягнуць той камель. Я паехаў разам з ім, і мы лёгка прыкацілі бульдозерам калоду дадому. Было туды недзе з кіламетр. Пасля і шкадавалі троху. Так цяжка ён нам паддаваўся. Хоць наша піла была і даўжэйшая за звычайную, але яе ўсё роўна не хапала. Уразаліся і клінамі адшчэплівалі плашкі, падыходзілі з розных бакоў. Але ўсё ж за зіму неяк спарадкавалі. А ў пліце аднымі дубовымі дрывамі не палілі, а дабаўлялі слабейшых.

Цяпер, калі іду праз тое места, дзе рос дуб, то бачу толькі пень ад яго. Навокал кусты, растуць і маладыя дубкі, напэўна, нашчадкі нашага велікана. І хочацца мне пасадзіць на тым месцы дубок. Але, каб ён захаваўся і вырас, спатрэбіцца з дзясятак пакаленняў. І ці зберагуць яны мой дубок? А мо знойдуцца бяздумныя, гатовыя падняць сякеру на такую мясцовую рэліквію. Дарэчы, той Янушак згарэў у сваёй кватэры.

# Персаналіі

## Янэчык

У кожным сяле ёсць адметныя людзі, што сваім выглядам, паводзінамі, мовай надаюць ёй своеасаблівасць і непаўторны каларыт. Не выключэнне і Квачы. Перш за ўсё – гэта мой сусед Янэчык (Кабылінскі Іван Вацлававіч, 1913-1985 гг.) Чалавек па сваім веку вельмі дасведчаны і граматны. Быў ён невысокага росту, заўсёды акуратна пастрыжаны, валасы зачасаныя назад. А бачылі б вы яго фотаздымак у маладосці! Якая то была шавялюра, які чуб! Ды не гэта галоўнае. Заўсёды адметнае, што я ў ім вызначаў, – гэта яго пальшчызна. Праяўлялася гэта не толькі ў тым, што ён ужываў польскія словы, а часам, выпіўшы, увогуле пераходзіў на польскую, а перш за ўсё, усхваляючы жыццё пры Польшчы.

А я бачу цяпер гэтаму дзве прычыны. Першая – гэта тое, што той час (1921-1939гг.) – гэта яго маладосць. Другая – у той час яго бацька і ён былі гаспадарамі на зямлі, якую потым Саветы аднялі. Хаця зямлі сваёй было і не вельмі многа, у гаспадароў па 4-8 гектараў, але падаткі былі невялікія, і хто працаваў на сваім ды наймаўся, то не галадалі. На камуністаў у яго была ну проста “алергія”. Вядома, што у нас прачытаць, пачуць па радыё ці ўбачыць па тэлевізары праўду жыцця было немагчыма. Дзед Янэчык паставіў сабе задачу: купіць добры прыёмнік “Акіян”. Помню, усю восень і зіму цягаў сукі і рабіў мётлы. Кудысьці іх прадаваў і ўрэшце займеў добры прымач. Ну і не разлучаўся з ім . І на сяло прыносіў, і кілбасы вэндзіў, а ўсё з ім. Ну і вядома ж выслухаваў і Ватыкан, і ўсе, што былі “галасы”, а тады расказваў, дзе

што робіцца. Быў вельмі рад, калі пачала дзейнічаць у Польшчы “Салідарнасць”. Пра жыццё пад Польшчай я чуў шмат.

Прыгадваюцца эпізоды падчас “вызваленчага” паходу Чырвонай Арміі пры далучэнні Заходняй Беларусі. Расказваў мой бацька, што чырвонаармейцаў раскватаравалі па хутарах. Адзін быў і ў іх. Маці пакарміла і з сабой дала бохан хлеба. Узрадваўся і сказаў, што панясе дамоў, калі вернецца, бо ў Расеі з хлебам цяжка. А калі ён вернецца дамоў – невядома! Стаялі чырвонаармейцы і ў Дзеркаўшчыне. Нядзеля. Пасля імшы выходзяць людзі з касцёла, не спяшаюцца. І моладзь, і пажылыя, і дзеці. Хто далейшы, тыя раз’язджаюцца на конях. Усе прыбраныя, акуратныя, не да працы ж, а ў касцеле людзі былі. Тут жа і рускія ратазеюць. І вось адзін з іх, напэўна, нейкі палітрук, пытаецца, згледзеўшы ўсё гэта: “А дзе ваш нізшы клас?” “А нет у нас такога класа!” – адказвае яму здзіўленая такім пытаннем маладзіца. Добра, напэўна, задумаўся пасля такога адказу рускі ваенны…

Расказвалі, што панаехала “саветаў” і ў Глыбокае, камандзіры і жонак сваіх папрыцягвалі. А ў Глыбокім жа было шмат лавак жыдоўскіх, тавару, у баб гэтых аж вочы разбягаюцца, не ведаюць, што рабіць, за што хапацца. Адна прыйшла да трубкі з насыпачным (для пер’я) чырвоным матэрыялам і кажа: “Мерай мне на плацце адрэз!” ???!!!

Вакол усё пазагаджвалі, там жа не ведалі прыбіральняў. А ў нас пры Польшчы няхай толькі будзе ў цябе непачышчаны “ўстэмп”(прыбіральня), зараз жа паліцыянт выпіша штраф. На заўвагі пра неакуратнасць адказвалі так: “Ваш край – сарай. Гэты засяром – новы забяром!” Вось такія былі нашы “вызваліцелі” і такую “свабоду і культуру” прынеслі яны ў наш край.

Была ў Янэчкі адна слабасць, асабліва праяўлялася яна з маладосці. Ды, напэўна, у маладосці кожны з нас тым грашыў – вельмі любіў ён страляць. У трыццатыя гады яшчэ захаваліся вінтоўкі ад першай сусветнай вайны. Сваёй, мусіць, Янэчык не меў, але ж выхваляўся майму бацьку: “Як цябе малога маці з вакзала везла (1932 год), то я тады вот з Лепардавай вінтоўкі валіў!” І стралком быў адменным. Адзін час ён старажыў касцёл у Глыбокім, а можа, у Беразвеччы, было гэта пры Польшчы. У Беразвеччы тады стаялі польскія памежнікі, уланы. Вот ён хадзіў глядзець на іх “высцігі” (трэніроўкі). Наторкаюць вешак з сукоў па два бакі. На поўным скаку імчыць улан, сячэ шабляй направа і налева і ўсё ссек бы, каб каню вуха не адсек. А раз патрапіў у цір на стральбу. І не быў бы ён Янэчык, каб не выпрасіў у афіцэра стрэліць. Сумеў папольску да яго падысці. Выстраліў тры разы з карабіна. Дзве дзясяткі выбіў, а адна дзясятка на мяжы з дзявяткай. Нашто польскі камандзір сказаў: “Учце сень, офіцэжове, яко стшэле просты хлопец!” Вось якім быў дзед Янэчык.

А ўжо пасля апошняй вайны прыпасаў ён нацягнуў з канстантынаўскага бальшака ўволю. І не марнаваў яго напрасна. Расказваў, што на нейкім ставе, ля вадзяного млыну, як гракнаў, дык рыбы было аж бела. Рваў порахам вялікія камяні, расказваў старэйшы брат Толя. Дзяўбе, дзяўбе цэлы дзень гэтыт камень, засыпле добра пораху, а тады як грукне! Ажно шыбы ў вокнах барабаняць. Прадсказаў Янэчык, што камуністаў не будзе. Мы гэтаму не верылі. Асабліва я, яры тады камсамолец, прасякнуты камуністычнай прапагандай. Я часта ўступаў з ім у спрэчкі, абараняючы нашу “найлепшую” сістэму. А цяпер прашу ў яго за гэта даравання. Не дажыў ён да развалу Саюза, але яго спадзяванні на тое, што будзем жыць без камуністаў, спраўдзіліся.

Цяпер, са свайго вопыту бачу, што меў Янэчык рацыю, так ганьбячы камуністаў за ўсе здзекі, што яны тварылі з людзьмі. І хто ведае, каб не жылі мы пад Польшай нейкія 18 гадоў, колькі б маіх землякоў загінула ў лагерах Сібіры, у Курапатах, на сацыялістычных будоўлях. А яшчэ больш шкадую дзеда Янэчыка за яго страчаны архіў. Так, я не памыліўся ў яго быў сапраўдны архіў, бо ён быў фатограф і, я думаю, меў шмат цікавых здымкаў і не толькі здымкаў. А колькі ў яго было святых кніг, розных выпісак у звычайных сшытках! Пасля смерці ўсё гэта захоўвала яго жонка – баба Анэта. Дарэчы, чалавек таксама вельмі цікавы. Яна пражыла недзе каля 96 гадоў. Была яшчэ той бабкай, для якой мужаў аўтарытэт не падвяргаўся ніякаму сумневу. І мне запомнілася, што звычайны панашаму “чай”, яна называла гарбатай. Я бываў у бабы Анэты, распытваў пра даўнейшае, а паслухаць было што, бо перажыла шмат і мела добрую памяць. І вось, калі яна памерла, то хата некалькі год прастаяла пустая, а затым родзічы прадалі яе і не каму-небудзь, а цыганам. Што ім было да чужых фотаздымкаў ды хрысціянскай літаратуры? Я стараўся навесці з імі кантакт па гэтым пытанні, але – марна. Архіў страчаны, усё выкінута. Для мяне – гэта жах. Унукі пра гэта не паклапаціліся…

## Казюк

Жыў ён са сваёй маткай Драздовай Фросяй. Нямы ці то ад нараджэння, ці то з пужання. Казалі, што ў вайну прыходзілі партызаны і шукалі бацьку. Можа, хацелі ці ежы, ці адзення, ці каня, ды ці мала што ім было патрэбна. Бацька хаваўся пад падлогай ў яме. Матка сказала, што яго няма, а малы паказаў, нешта мыкнуўшы, на лаз пад падлогу. Бацьку на месцы

і расстралялі, а малы пасля такога пужання толкам і не загаварыў.

Далей Квачоў ён, напэўна, нідзе не быў. Працаваў з бабамі ў брыгадзе, яго наймалі пасваіць кароў. Плацілі яму пяць рублёў. Помню, прынясе яму Фрося абед, а паесці ён быў мастак. Літровы слоік булёну, каструльку бліноў драных, утушаных з жырам і смятанай. Усё з’есць ды так да смаку, аж па барадзе цячэ, а сам толькі пукчыць. Характарам ён быў добры, пакладзісты і працавіты. Толькі трэба было умець каля яго абыходзіцца, не дражніць, а часцей хваліць. А вось з Ядзяй са сваёй часта сварыўся. Яны адзін час чысцілі на ферме разам гной. Тая ж была гарачая, нешта “ўкваліць” (раззлуе) яго, ну тады ён і крычыць: “Ця!” Гэта значыць – сцеражыся, дам, і мог паганяць шуфлем сваю родную цётачку.

Мы ведалі яго няхітры слоўнікавы запас, а гэта было каля дзясятка слоў, якіх яму хапала. Вось яны. “Кы” – гэта брыгадзір, “іюсікі” – пляменнікі, Манюсіны дзеці з Карабоў, “ліля” – вяселле, “хы” – спаць, “ням-ня” – есці, “еэ” – непрыгожы, дрэнны. А такія выслоўі, як “чык баба” або “бя німа” ўвогуле перакладаць не зусім прыстойна, але Квачы абавязкова ўсё зразумеюць. І са спагадай успомняць нашага Казюка.

## Хам

Звычайна да яго мянушкі дабаўлялі яшчэ і сапраўднае імя Янка. І звычайна, але толькі за вочы, звалі яго Янка-Хам. Гэта быў сын Альжуні, Зымонавай сястры. На яе нешта найшло, і яна павесілася. Казалі, што гэта ў іх нешта было ў раду, бо і Янка пасля не мінуў Слабодкі. Волат і прыгажун, кучаравы, усё жыццё пражыў са сваімі цёткамі Франяй і Янінай, над

якімі апекаваўся іх брат Зымон. Часам працаваў нейкі час у Глыбокім, а так на брыгадзе ў калгасе. У дзяцінстве таксама быў моцны і заўсёды казаў: “Я хам(сам)”. Вось і пайшло з гэтага хам. А яшчэ часам яго называлі Юнаша. А чаму? Нехта з дзяцей неяк назваў яго дзядзькам. А ён ў адказ:

– Які я табе дзядзька, я ешчо юнаша!

Вось і пайшло з таго часу Юнаш ды Юнаша. Сілы Янка па тым часе быў непераўзыдзенай ні ў Квачах, ні ў бліжэйшым наваколлі. У работу ён вельмі не ўлягаў, бо быў без сям’і, таму больш палежваў ды чытаў. Памятаю, калі прывозіў на кладню нам, дзецям, калгаснае сена, то разгрузіць мог за пару абхватаў. Толькі вілы трашчалі. І быў начытаны, шмат пра што мог расказаць.

Убачыў я яго праз шмат гадоў у Слабодцы, а затым у Александрове. Ад былога Янкі засталася толькі цень. Вось што робіць з чалавекам хвароба і няўмольныя гады. Цяпер, некалі магутны наш Янка, дажывае свае гады ў шаркаўшчынскім Александрове. У дзяцінстве мне здавалася, што такіх багатыроў больш нідзе не пабачу. Памыліўся, бо яго стрыечны брат, а мой аднакласнік Зымонаў Сашка, яму ні ў якім разе не саступае. Неяк сустрэў я яго ў Наваполацку, дзе нашы дзеці здавалі тэсты. Вось гэта “машына”. Волат, з якім і Янку не па сілах было б цягацца. Адна кроў, квачоўская.

А зараз наш былы Квачоўскі волат дажывае свой век у доме для прыстарэлых у Александрове. Я захацеў з ім пабачыцца. На жаль, мяне ён не пазнаў, ды і нікога ён ужо не пазнае. Ад былога прыгажуна засталася, як кажуць, толькі аснова. Але і пад ёй прыгадаў я пышную і кудравую шавялюру, тонкія губы і прамы нос былога Юнашы. Вось што робіць жыццё з чалавекам!

Нядаўна атрымаў вестку, што Янка памёр. Пахавалі

яго на Квачоўскіх могілках. Малайцы дваюрныя (Сашка, Верка і Крыся), што паклапаціліся паяднаць яго з землякамі!

## Зымон

Кабылінскі Сымон Францавіч, 1918 года нараджэння, упаўнаважаны ад вёскі Квачы. Такія звесткі знайшоў я у Глыбоцкім занальным архіве, перакопваючы пратаколы пасяджэнняў Карабоўскага сельавета. Для нас жа ён быў перш-наперш Зымон, прадавец нашага магазіна. Гугніць у нос, пастаянна курыць і ў вольны час сядзіць і чытае газету, а затым у яе ж заварочвае табе халву, цукеркі або пранікі.

Спачатку магазін у нас быў у Рублеўскага хаце. У адной палове жылі Антон з Кацяй, а другая аддадзена пад магазін, дзе за тоўстым прылаўкам пастаянна стаяў Зымон. Зараз не магу сабе ўявіць, як у такой цеснаце ў яго месціліся і хлеб, і віно, і крупы, і цукеркі з пячэннем, і абавязкова бочка з камсой, і прамысловыя тавары, і адзенне. Але так было. Склад быў у хлеве пад замком. Пад вербамі стаяла бочка з керасінам. Куплялі яго даволі часта, бо былі праблемы са святлом. Часта даводзілася рабіць урокі пры лямпе.

Недзе ў 1975 годзе пабудавалі новы магазін. Ён размяшчаўся ўжо бліжэй да нас. О, тут была прастора для тавараў! Асобна склад. А вось з таварамі ў эпоху дэфіцыту было і не вельмі. Стаялі стэлажы з рыбнымі кансервамі, цэлая батарэя ячменнага напітку, можа, сямі гатункаў, нешта з адзення, цукеркі, цвікі… Адным словам, выбар не багаты. Затое віна і гарэлкі!

Памятаю, як адзін раз прывезлі цэлую "Калхіду" гарэлкі, заставілі ёй увесь магазін. Думалі, калі ж яна

кончыцца. Нічога падобнага. За лета лічы што разабралі, а каштавала тады гарэлка па 3р. 62 к.. на той час гэта не малыя грошы, а прыкладна дзённы заробак.

Мы, дзеці, хадзілі купляць хлеб. А яшчэ, як цяпер модна казаць, “здаваць пушніну”, а менавіта пустыя бутэлькі. Знаходзілі мы іх часцей за ўсё пасля зімы каля асфальту. Тады ішлі ўсе бутэлькі, бо загранічных не было. Бутэлькі цаніліся добра. Адна каштавала 12 капеек, а гэта 100 грамаў халвы, дзве – бутэлька ліманаду. Адзін раз, я, праўда, гэтага не памятаю, прывезлі ў магазін прэзервативы. І нехта з малых, убачыўшы іх на вітрыне, прыняў за надуўныя шарыкі. Рашыў іх купіць і кажа:

– Дзядзька Зымон, дайце мне вунь тых шарыкаў.

А той у адказ:

– Замал ты яшчэ да гэткіх шарыкаў!

Калі расказаў старэйшым, чаму не купіў, вось хахаталі!

## Віля

Сарока (Кабылінская) Вільгельміна Міхайлаўна (1914–2010 г.г.) – карэнная жыхарка нашай вёскі. Нічым асаблівым сярод вясковых жанчын яна не выдзялялася, колькі помню яе, была яна невялічкая, рухавая, голас быў своеасаблівы, нейкі грубаваты. Муж яе быў аднекуль з-пад Докшыц. З вайны не вярнуўся, як і многія іншыя землякі, а застаўся абжываць “Земён жуцонэ” (пераданыя пасля вайны Польшы яе былыя занятыя немцамі тэрыторыі).

А Віля засталася з дачкой Вандзяй, пры якой і дажыла свой немалы век.У яе была сястра Анцюта, ад якой пайшлі Бронька, Альфрэда і Вацюня. Быў таксам і брат, старэйшы за яе, можа, з 1907 года. Звалі яго Франак. Калі

яшчэ Віля была маладзейшая і па вечарах у пятніцу ў вялікі пост прыходзілі да нас маліцца, то я не раз чуў ад яе гісторыю пра свайго брата Франака. Адно запомніў, што расстралялі таго, па яе словах камуністы, недзе ў Катыні. Нам, савецкім піянерам, тады пра Катынь яшчэ ніякай праўды не гаварылі. Нават той “праўды”, што быццам бы гэта справа рук фашыстаў. Тады мы ведалі толькі пра Хатынь. І я думаў, што баба Віля нешта хутчэй за ўсё блытае. Яна і сапраўды блытала, бо не ведала месца пахавання, аднак жа з карнікамі, што ўчынілі гэты гвалт над нявіннымі людзьмі, яна не памылілася. Замучалі вязняў Беразвечча савецкія карнікі. А зараз пра гісторыю Беразвечча.

Беразвецкі праваслаўны манастыр пасля Рыжскіх перамоў пераехаў у Вільню, святыня была перададзена каталіцкаму касцёлу. Калі ў 1925 годзе стварылі Корпус Аховы Памежжа, то кляштар быў перададзены на патрэбы гэтай адзінкі. Калі камуністы занялі раён, то пачаўся так званы працэс устанаўлення савецкай улады. Ужо 17 верасня 1939 года супрацоўнікі НКУС, карыстаючыся паслугамі часткі пракамуністычна настроенага беларускага і яўрэйскага насельніцтва ў якасці інфарматараў і праваднікоў, прыступілі да арышту польскіх паліцыянтаў і вайскоўцаў, асобаў, якія выконвалі кіраўнічыя функцыі (бургамістраў, войтаў, солтысаў) і ў арганізацыях грамадзянскай абароны, а таксама ў “Стральцы” і моладзі сярэдніх школ, у якіх выкладалася ваенная падрыхтоўка, асобы з антысавецкімі поглядамі, “эксплуатататары” рабочага класа і проста заможныя асобы. Пад гэту марку патрапіў у Беразвечча і брат бабы Вілі Франак.

Для іх у Беразвецкім кляштары стварылі турму №32, а потым №28. З намінальнай колькасцю 530 месц яна была перагружана на 150 %. Падчас арыштаў, як правіла,

адбываліся вобыскі. Як выдуманай прычынай падавалася падазрэнне ў захаванні зброі ці прапагандыскіх матэрыялаў.

Дзень вязня пачынаўся з пад’ёму а 6-й гадзіне і заканчваўся вечаровай пераклічкай а 22 гадзіне. З ранку быў асабісты туалет, мыццё і сняданак. У прыбіральню поўным складам камеры два разы на дзень, у міжчасоўе фізіялагічную патрэбу спраўлялі ў парашу ў камеры. Па сведчанні Паўла Кожуха, што правёў у Беразвеччы паўтара года, у камеры 5x2 метры, прызначанай для адной асобы, утрымлівалі 48 вязняў. Нараў для сну не было, спалі на бетоне, за пасцель і коўдру служыла тое, што вязень меў на сабе. Не было спатканняў, карэспандэнцыі і пасылак. Нягледзячы на перапоўненасць турмы, следства пачыналася не адразу, і вязні па некалькі месяцаў без пракурорскай санкцыі, а часам і без пратаколу арышта трымаліся ў пастаяннай напрузе і няпэўнасці, назіраў, як здзекваліся на допытах з таварышаў, даходзіў да стану фізічнага і псіхічнага надлому. Потым, калі прыходзіла яго чарга, менш супраціўляўся, ахвотней прызнаваў абвінавачванні, якія яму прад’яўляліся, і выконваў мэту выканаўцаў: выяўленне саўдзельнікаў і нелаяльных да ўлады асоб.

Допыты адбываліся ў розныя гадзіны дня і ночы. За кожным разам нанова трэба было распавядаць сваю біяграфію – шукалі ў ёй супярэчнасці і непаслядоўнасці. Калі прытрымліваўся сваёй версіі і не прызнаваўся ў абвінаваўчых дзеяннях, пужалі больш суровым памерам кары, наступствам для сям’і. Ужываліся розныя хітрасці: напрыклад, чыталі фіктыўныя паказанні сведак ці абяцалі лагоднае абыходжанне, скарачэнне следства за прызнанне і выяўленне саўдзельнікаў. Звычайным былі абразы, насмешкі, біццё па твары, катаванне. У крайніх

выпадках прымянялі так званыя метады “активного следствия” (прыпальванне папяросай, калонне іголкамі, вырыванне валасоў, выбіванне зубоў, і прычыненне цяжкіх пашкоджванняў унутраных органаў). Існавалі спецыяльныя спосабы прычынення болю: вешалі за ногі галавой уніз, кара стаяннем ці побытам у карцэры – галоднаму, у цесным, халодным і цёмным памяшканні. Былі яго разнавіднасці: водны, гнойны, сабачая будка, абазначалі спецыяльныя віды пакутаў.

Не трэба здзіўляцца, што такія метады следства не раз прыводзілі да прызнання няздзейсненых злачынстваў і складання прызнанняў па густу выканаўцаў, каб толькі пазбегнуць катавання. У роспачы катаваныя здзяйснялі самазабойствы. Так, закатаваны ў Беразвеччы Яўген Мурашоў, уладальнік маёнтка каля Дзісны, не змог вытрымаць мукаў і ўчыніў самазабойства. Найперш кавалкам шкла паспрабаваў сабе парэзаць жылы на шыі, а калі яго забралі ў іншую камеру, усадзіў галаву ў палаючую печ. Апечаны, страціў зрок, а твар быў у пухірах. У крайняй роспачы намацаў сцяну і разбіў сабе аб яе чэрап.

Прысуды вязням выносіліся, як правіла, завочна, вагаліся ў межах ад 3 да 10 год прымусовых работ у лагерах. Пакаранне смерцю выносілі за шпіянаж, прыналежнасць да дыверсійных і трацкісцкіх арганізацый. Для адбыцця пакаранняў вязняў гналі канвоем у Глыбокае, а там везлі чыгункай далей.

Глыбачане бачылі, як вязняў праводзілі ў даўгіх калонах у вельмі раннія гадзіны. Параненых бачылі праз шчыліны ў акенцах. Ішлі доўгія калоны людзей, акружаныя салдатамі НКУС. Пераважалі мужчыны, якія выглядалі, нібы людзі-прывіды. Не ішлі, а сланяліся, дапамагаючы адзін аднаму. Адзенне было бруднае, некаторыя, нягледзячы на лета, былі ў зімовым адзенні.

Бачылі, што гэта былі палякі. Жыхарам не можна было ні набліжацца да іх, ні размаўляць з імі.

Драматычна склаўся лёс вязняў пасля нападу Гітлера на СССР. З-за маланкавага руху немцаў эвакуацыя турмаў на ўсход пачалася па загаду Берыі ўжо 23 чэрвеня. Частку вязняў Беразвечча, а гэта ў першую чаргу асуджаных да расстрэлу, падазроных у контрэвалюцыйнай дзейнасці і якім пагражалі вялікія тэрміны, катавалі і расстралялі. Акруговая Камісія вывучэння злачынстваў супраць польскага народа ў Лодзі на падставе ацэнкі ўстанавіла, што з 17.09.1939 да 24.06.1941 года на тэрыторыі турмы НКУС у Беразвеччы замарадавана ад 400 да 800 вязняў. Асуджаныя за простыя злачынствы, парушэнні дысцыпліны працы, крадзеж, хуліганства інваліды маглі быць выпушчаны дадому.

Рэшту пачалі эвакуяваць у глыб СССР. Пэўную колькасць (каля тысячы маладых і здольных да працы) эвакуіравалі чыгункай. І, як аказалася пазней, ім у большасці ўратавалі жыццё. Рэшту вязняў у пешых калонах пад узмоцненай аховай пагналі на ўсход. Пры гэтым бязлітасныя канваіры здзекваліся і мардавалі вязняў. Расказвае цудам ацалелы на гэтай дарозе смерці Павел Кожух *“…Ужо ледзь рухаемся. Нашы канваіры таксама ледзь ідуць... калона скарачаецца…ратуе мяне тое, што маю толькі 32 гады, жалезнае здароўе і моцную волю. Каторыя суткі маршыруем, бадай што на апошнім дыханні рухаемся, бедныя сабакі таксама ўжо вывеселі языкі і не вурчаць на нас… ніхто і нішто не можа прыспешыць нашага руху, а ні біццё, а ні аўчаркі. Калона складаецца ўжо толькі з нядаўна арыштаваных ці маладых вязняў, рэшта засталася на дарогах і ў прыдарожных равах. Ішоў у сярэдзіне калоны… далей ад пабояў, сабакі і чалавека, страшнейшага за ўсялякага сабаку… ішоў босы, бо*

*боты паранілі мне ногі, і я скінуў іх…*”

26 чэрвеня дайшлі да мястэчка Ула над Дзвіной. Пераходзячы Дзвіну, некалькі асобаў скочылі з моста. Нягледзячы на тое, што ўмелі плаваць, іх дагналі кулі… Жыхары таго мястэчка крычалі: “Таварышы, дакуль праводзіце гэтых бандытаў, польскіх свіней, біце іх на месцы!” Потым над калонай праляцела 15-17 нямецкіх самалётаў. Выстралілі чырвонай ракетай уверх (сігнал падаць, ахова за 30-50 метраў па баках у кустах). Самалёты адбамбіліся за 2-3 км. Гэта быў знак для катаў. Усе ахоўнікі выбеглі і пачалі страляць з галавы калоны.

Міхаіл Баговіч: *“І раптам жудасны гук, як сотня молатаў – секлі з кулямётаў. У галаве калоны,спераду пачуліся страшныя крыкі, паміж іншых чулася: браты, у нас страляюць!”*

Павел Кожух: *“Я, кіраваны інстынктам, не падаў на праезжую частку, а ўздоўж рову. Калі чарга з кулямётаў працяла паветра, скаціўся ў роў, і кулі ішлі нада мной. Ляжаў дагары, а нада мной свісталі хмары куль. Кулямёты, як раптам забрахалі, так раптам і змоўклі… Хто падаваў знакі жыцця, быў дабіты з рэвальвера або праткнуты штыком. Да мяне між камянямі тачылася чорная змейка крыві, ад якой ішла пара. Працягваю да яе руку, мажу шчаку і ляжу далей, прыслухоўваючыся, вакол мяне зрабілася ціха… Чуў, як калоціцца сэрца, ніхто да мяне не падыходзіў. Завалілі мяне кучай трупаў. Урэшце скінуў труп, які мне найбольш перашкаджаў, і пабег у бок сцяны лесу. З тылу пачуў стрэлы з карабіну, інстынкт падказаў мне, што гэта стралялі ў мяне.”* Паўлу Кожуху пашчасціла. Падобным чынам збеглі яшчэ некалькі чалавек. Ён праз некалькі дзён дабраўся дадому. Забітых загадалі сялянам перавезці ў Таклінова і пахаваць у капцах, дзе раней была бульба. Немцы потым

зрабілі эксгумацыю забітых і перазахавалі на краі лесу ў Мікалаёве. Злоўленых недабітых (каля 100 чалавек) змясцілі ў віцебскую турму, а затым адправілі невядома куды. Начальнікам Беразвецкай турмы, які і камандаваў расстрэлам, быў нейкі Прыёмышаў. Было расстраляна 714 вязняў.

Ваенны трыбунал разгледзеў гэту справу і "за злоўжыванні службовым становішчам, якія выразіліся ў расстрэлах без ніякіх падстаў 714 вязняў, што азначала здзяйсненне злачынства па арт.193-17, пункт "б" Крымінальнага Кодэкса РСФСР і кіруючыся артыкуламі 319і 329 Кодэкса, прыгаварыў (прысуд №121) да смяротнага пакарання праз расстрэл:

Абрама Хаймавіча Табера, яўрэя, члена ВКП(б), намесніка начальніка турмы НКУС у Глыбокім;

Васіля Андрэевіча Мохава, рускага, камсамольца, намесніка ўпаўнаважанага следчага турмы ў Глыбокім.

Акрамя таго, на 10 год турмы ў лагеры прымусовай працы:

Васіля Мікалаевіча Малініна, рускага, члена ВКП(б), дзяжурнага памочніка начальніка турмы ў Глыбокім;

Івана Якаўлевіча Баталава, рускага, беспартыйнага, дзяжурнага памочніка начальніка турмы ў Глыбокім;

Пятра Іванавіча Скрабнеўскага, беларуса, члена ВКП(б), сакратара турмы ў Глыбокім.

Прыёмышаў быў у той час пазбаўлены ад адказанасці сакратаром ЦК КПБ(б) Беларусі Панцеляймонам Панамарэнкам. У час вайны недзе схаваўся, і лёс яго невядомы.

3 ліпеня 1941 года нямецкія атрады занялі Глыбокае і ўступілі на тэрыторыю Беразвецкай турмы. Хутка разышлася вестка аб знойдзеных там парэштках вязняў. Брамы былі адчынены, і навакольнае насельніцтва ўваходзіла

без перашкод. Асабліва прыбылі сем'і арыштаваных, каб знайсці якія-небудзь сляды сваіх бліжніх. Немцы адкапалі свежыя зборныя магілы і даследавалі іх, аднак парэшткаў не эксгумавалі.

Сярод вядомых зараз паказанняў найбольш чэсным, якое датычылася лютасці савецкіх НКУСаўцаў у Беразвеччы,было паказанне К.К., жыхара фальварка Атвалоўшчызна Галубіцкай гміны. Па яго словах: *"Немцы ў Беразвеччы знайшлі вялікую колькасць забітых вязняў. Сам там пабываў з бацькам і калегай. Турэмныя будынкі былі адкрытыя. Мы прайшлі па трох памяшканнях аднаго будынка, і ў кожным ляжалі парэшткі мужчын, апранутых у цывільную вопратку і ў вайсковую польскай арміі, а таксама жанчын і дзяцей. У кожным памяшканні было шмат трупаў, у іншых будынках таксама, але мы іх не аглядалі. Тыя парэшткі, якія бачылі, мелі на шыі петлі з дроту ці шнурка. Апроч таго, бачылі, што некаторыя дарослыя людзі мелі цалкам паадразаныя вушы і насы. Іншыя мелі адрэзаныя пальцы, а ў некаторых мужчын бачылі ўбітыя пад пазногцям іголкі. Бачылі, што шмат людзей знаходзілі сваіх родных сярод трупаў. У памяшканнях, якія мы аглядалі, былі і свежыя парэшткі. Не былі ў гніенні і не смярдзелі. З падвалаў жа тых будынкаў таксама выносілі парэшткі, якія былі ў пачатковым разлажэнні і смярдзелі."*

У 1992 годзе былі апублікаваны ўспаміны жыхара вёскі Карабы Мікалая Міхалевіча. Яму ў той час было 18 гадоў, і ён з сябрамі таксама пабываў у Беразвеччы. Міхалевіч распавядаў: *"У манастыры сабралася шмат людзей, галоўным чынам радня вязняў. Грэбліся ў паперах, якімі быў засыпаны ўвесь панадворак, каб знайсці хоць нейкія звесткі пра сваіх… Людзі са свечкай спускаліся ў падвалы, мы за імі. У столі скляпенняў былі*

*ўманціраваны крукі, на іх, напэўна, падвешавалі катаваных. Пасля таго... цяжка яшчэ раз гэта ўспамінаць, мы знайшлі адсечаныя людскія языкі. Шмат. Асабіста бачыў – з вядро... Тым часам на панадворку раскопвалі свежыя зборныя магілы...колькі там у кожнай людзей – невядома. Твары нябожчыкаў ужо пацямнелі. Пах! Адны апранутыя, іншыя голыя. Звярнулі ўвагу, што шмат было з цалкам здзёртай скурай на ступнях. Можа, каб не ўцякалі? Тыя людзі катаваныя. Не маглі мы вытрымаць даўжэй. Адышліся.*

*Парэшткі, якія не забралі сваякі, нямецкія ўлады загадалі пахаваць на могілках у Беразвеччы.”*

Тыя зверствы НКВД, што ўбачылі людзі на ўласныя вочы ў Беразвеччы, канчаткова выкрывала савецкую сістэму, як крывадушны і нялюдскі лад, кароткае панаванне якога на Крэсах Усходніх Рэчы Паспалітай прынесла людзям невымерныя пакуты.

У глыбоцкім касцёле ўстаноўлена памятная табліца. На ёй змешчаны наступны тэкст:

***Ушанаванне тысячам палякаў нявінна зняволеных, замучаных і расстраляных органамі НКВД у 1939-1941 гады на тэрыторыі турмы ў Беразвеччы, на дарозе смерці ў Мікалаёве, гітлераўцамі ў 1941-1944 гады ў ваколіцах Глыбокага.***

***Няхай спачываюць у спакоі.***

У Мікалаёве на магіле помнік. На ім пліта з надпісам:

***Тут пахавана некалькі тысяч палякаў і асобаў іншых нацыянальнасцяў. Вязняў Беразвечча, замардаваных 26.VI.1941 годаў Мікалаёве. Памяць ахвярам Дарогі Смерці. Няхай спачываюць у спакоі.***

Вось што мне расказаў пра Вілінага брата яго пляменнік, Анцюцін сын Бронька (1927-2015). Запісаў

яго расказ я на Вяліканне 5 красавіка 2015 года ў яго дома, калі прыходзілі да дзядзькі Броні спяваць "Васолы." Вось што ён мне распавёў:

*"Дзядзька Франак быў кіраўніком "Стшэльцаў" у нашай вёсцы. Вучыліся маршыраваць, абыходзіцца з вінтоўкамі, але зброя была вучэбная. А як занялі Глыбокае Саветы, то ў скорым часе дзядзьку туды і забралі. Калі прыйшлі немцы, то пайшлі чуткі, што ў Беразвеччы знайшлі закатаваных людзей. Выправілі з дому і мяне, можа, знайду дзядзьку. А людзей многа прыйшло шукаць сваіх родных. Усюды енк, плач... Хадзіў каля свежых раскапаных магіл, заглядаў у камеры, дзе таксама былі трупы. Ва ўсіх на целе знакі ад катаванняў, і ў кожнага на шыі кавалак вяроўкі. Я не мог усяго гэтага вытрымаць. Яшчэ бачыў на сетцы для агароджы фотаздымкі. Можа, так давалі знаць аб сабе закатаўныя, ці то знак, што іх адправілі далей. Свайго дзядзьку Франака я не знайшоў. Казалі, што выратаваўся з усіх нейкі Крэміс з Хоцек, схаваўшыся ў нейкую бочку. Але калі мы ў яго хацелі нешта распытаць, то нічога не сказаў, а толькі прыціскаў скрыжаваныя пальцы да роту: "Маўчок!" Усё роўна баяўся пераследу, і як надарылася магчымасць, то выехаў у Польшчу."*

Баба Віля так і не дазналася, дзе пахаваны яе брат. І я не раскрыю гэту таямніцу да канца. Мне на гэта прыадкрыла вочы кніга Яўгеніюша Забелы "Беразвечча ў службе Богу і ў моцы дэманаў". Можа, ён загінуў па дарозе на Мікалаёва, можа, у самім Мікалаёве, а можа, неапазнаны апынуўся на Беразвецкіх могілках, на якіх зараз пабудаваныя дамы. Ёсць і яшчэ версія ад сына Броні Ермаковіча Лявона. Яго бабуля і будучая маці служылі ў вядомага доктара Гушчы, пра якога Даленга-Мастовіч напісаў кнігу "Знахар". Дык вось казалі, што Гушчу, якога таксама

бальшавікі забралі ў Беразвечча, бачылі ў другой калоне, што рухалася праз Докшыцы. Падобна і мікалаёўскай, яна была расстраляна кулямэтамі НКВДыстаў каля вёскі Таргуны, што ў 10 кіламетрах ад Докшыц у накірунку Лепеля. Пра існаванне другой калоны палонных з Беразвечча расказваў мне і Уладзімір Скарабатун. Яму распавёў пра калону былы пацыент доктара Гушчы, дзевяностагадовы дзед. Толькі месца расстрэлу калоны называецца другое. Той жа Докшыцкі раён. Толькі вёска Восава. Гэта ўжо ў накірунку на Бягомль.

І яшчэ адна цікавая інфармацыя, якую я знайшоў у кнізе "Глыбоччына: ад старажытнасці да сучаснасці". Тут прыводзіцца спіс грамадзян , якія падвергліся палітычным рэпрэсіям і пасля былі рэабілітаваны. Падрыхтаваны ён у камітэце пры архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Беларусі. Старонка 501. Чытаю: "Кабылінскі Франц Міхайлавіч, н. у 1907 у г. Томск, жыў у в. Квачы, селянін-аднаасобнік. Асуджаны12.5.1941 на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.11.1989."

Тое, што нарадзіўся Франц у Томску памылка. Згодна з гэтым запісам найбольш верагодна, што асуджанага паспелі вывезці ў лагер у Томску, дзе ён і загінуў. Асуджаны 12 мая, часу хапіла, каб вывезці яго ў лагер, пакуль не пачаліся масавыя забойствы ў Беразвеччы.

Эх, родныя мае Квачы, дзе толькі не параскіданыя вашы неаплаканыя, нявінна замучаныя сыны і браты! Дарагая баба Віля толькі на тым свеце сустрэлася з родным братам Франакам. Сямідзесяці зямных гадоў для гэтага ім не хапіла, каб па-Боску паяднацца! Цяпер ужо назаўсёды (душам іх неба).

# Геня – квачоўскі Мічурын

Яўгеній Браніслававіч Квач, дзядзька Геня, як мы яго называем, нарадзіўся ў 1937 годзе. На фотаздымку, што мне паказваў, яго квачоўскія аднакласнікі: Вацюк, Юзюк Янэчкаў, Зыфрык Дзівакоў. У маладосці вучыўся ў Ленінградзе на будаўніка- апалубшчыка, працаваў на будоўлі, а калі ажаніўся, то ўвесь час працаваў на трактары ў сваім калгасе.

Першыя ўрокі садаводства атрымаў ад Савэрага, які ці не адзіны ў вёсцы ўмеў прышчапляць яблыні. Расказваў, што другія дзеці гуляюць, а ён усё глядзеў, як працуе спрактыкаваны садавод. А хутка і сам асвоіў гэту справу. Далей болей, і так яго зацягнула гэта садаводства, што жыць без яго не мог. Хацелася, каб у кветніку ўвесь год цвіло і буяла, а ў садзе хацелася паспробаваць самых разнастайных гатункаў. А дзе ўзяць? Ну, тады ж быў адзіны Саюз і даехаць можна было паўсюль. Збіраў насенне, матэрыял для прышчэпкі, чаранкі, саджанцы ў батанічных садах Літвы, Латвіі, Беларусі. ”Ператрос”, як ён казаў, Маскву і Ленінград. Выпісваў шмат ад аматараў садаводства, дзяліўся з імі. На пачатку васьмідзясятых, памятаю, уся яго праца была ў самым росквіце. Хоць амаль увесь час займала работа ў калгасе, але дапамагала яго жонка, цёця Эдзя, а таксама чатыры дачкі. Яшчэ толькі сыходзіў снег, а ў яго ўжо расцвіталі родадэндроны, потым шматлікія крокусы, цюльпаны, півоны, больш за сто гатункаў бэзу ... і так да позняй восені. Пытаю:

– А ці многа сартоў яблыкаў мелі ў садзе?

– Ой, безліч! Не адну сотню, дакладна! Вот паспрабую, не падабаецца мне гэта, ліквідзірую, прышчэпліваю нешта новае.

Цяпер дзядзька Геня перайшоў на фундукі. Мае ў

калекцыі каля 200 гатункаў, з іх каля пяцідзесяці сваёй селекцыі. І назвы дае патрыятычныя: Квачоўскі-1, Квачоўскі-2 і г. д. А якія прыгожыя чырваналістыя фундукі! А колькі арэхаў у дзядзькі Гені! Завітайце на Каляды ў госці – абавязкова пачастуе.

Мяне дзядзька Геня навучыў рабіць прышчэпкі спосабам палепшанай капуліроўкі. Ад яго я завёў сартавых чорных парэчак, маліны, абляпіхі, фундукоў. Ён мне даў чаранкоў і паказаў, як на сасну прышчапіць кедр. Атрымалася, і цяпер у мяне на сядзібе растуць два кедры – добрая памяць пра добрага чалавека. А калі чалавек душэўны, то не трэба яго доўга і знаць. Заўсёды прывітае з аптымізмам, сябруе з гармонікам, настроіць вас на пазітыўны лад і дасць добрыя парады. Адно засмучае яго, як і мяне таксама. Дзядзьку Геню хутка 80, здароўе падводзіць. На каго пакінуць сад, у чые надзейныя рукі перадаць? Гэта такая дарагая і бясцэнная спадчына, якую, нібы грошы, не зберажэш у кашальку. Над ёй трэба працаваць, і быць такім апантаным аматарам, як дзядзька Геня!

## Няхай спачываюць у супакоі вечным

Чым даўжэй жывем на свеце, тым часцей задумваемся пра сэнс жыцця, пра марнасць зямных багаццяў, пра паяднанне з усімі роднымі недзе там, за пакуль што яшчэ ўяўна далёкай мяжой. Але, як кажуць, усе ходзім пад Богам, і толькі яму вядома тая мяжа, што ніяк не наблізіцца да сатарэлага і знямоглага або забірае дужага ў поўных сілах, або нават немаўля. Сумна, але такія думкі наведваюць усё часцей і асабліва, калі наведаеш могілкі. І найперш сваіх родных. 59 год пражыў дзед Ганарук (яго браты Язэп і Сцяпан і таго менш). Мой бацька Лявон – 62 гады, брат Толік – 54 гады. А колькі тут

маіх равеснікаў і аднавяскоўцаў, што заўчасна пакінулі нас яшчэ зусім маладымі, не атрымаўшы нават пенсіі. Канечне ж, многім дапамог ”зялёны змій”, але і на тое не наша воля. Заўчасна і трагічна пайшлі з жыцця тры мае стрыечныя браты (Мішка – 36 год, Коля – 41год, Віця – 39 год), іх бацька Чэсік – 49 год.

Зусім малады загінуў Валік Радзевіч (24 гады), яго бацька Франак (39 гадоў), Зютак Маскалёў (27 гадоў), Юлік Юзючкоў (44 гады), Паўлік Гжэсеў (31год), Паўлік Зымонаў (25 год), Зыфрык Язэпішын (46 год), Казік Янэчкаў (47 год), Алік Чэся Баляськова (34 гады), Марына Лёдзі Люцюковай (40 год), Янулеў Стасік (53 гады), Франак Адасёў (58 год), Адасёва Яся (50 год), Барыла Толік (49 год), Барыла Славак (49 год), Таня Ермаковіч (50 год), Рагоўскі Ігар (8 год), Кабылінскі Ваня (42 гады), Барыла Эдзік (58 год), Аблам Ян (9 год).

Вечны спачын усім памерлым жыхарам Квачоў. Трэба часцей наведваць і даглядаць іх магілы, каб пасля не сорамна было ўз’яднацца са сваімі роднымі Квачамі!

# Квачы Квачамі

Мушу згадаць яшчэ адну адметную асаблівасць Квачоў. Не ведаю, ці захавалася яна цяпер. Калі квачоўцы дзе-небудзь сябе праявілі ў добрым сэнсе ці не вельмі (пабіліся з чужымі хлопцамі, уцяклі ад міліцыі і г. д.), то, як пахвалу, як гонар, можна было пачуць “Квачы Квачамі”. Што азначае: а як жа, падругому не маго і быць, дзе Квачы – там і перамога!

У сваім далейшым жыцці мы стараліся не губляць значэння гэтага нашага так бы мовіць дэвізу. Хто дзе: хто ў працы, хто ў вучобе, хто у спартыўных спаборніцтвах, а хто ў змаганні з цяжкімі жыццёвымі абставінамі. Я хачу, каб

гэтыя словы дайшлі да нашых дзяцей, нашчадкаў Квачоў, раскіданых па ўсім свеце. Хочацца, каб яны ўспрынялі і неслі высока па жыцці наш "квачоўскі слаўны дух".

Позняй восенню 2013 года памёр (душы яго неба) Пётра Юстынаў. Пахавалі, як звычайна з ксяндзом, з адпяваннем. Крыж нёс Чэсь Баранчыкаў. Памянулі нябожчыка, успомніўшы добрым словам. Разышліся па дамах адпачываць. Пайшоў дадому і Чэсь. Якраз у гэты дзень трэба яму было вытапіць лазню, што была дабудавана да хаты. Падтапіў, а сам прыснуў і, напэўна, назаўсёды, каб… Першымі заўважылі пажар суседзі, выклікалі пажарную, нехта браўся тушыць сам, ды дзе там дапаможаш, калі ўжо гарыць страха. Прыбег і Сашка Ермаковіч, Лёнікаў сын, а Броньки Анцюцінага ўнук, і першае пытанне:

– А дзе Чэсь?

Нехта адказаў, пакаваючы на палаючую хату:

– Пэўна ж там!

Ніхто не палез у агонь, баяліся. Сашка хуценька накінуў нешта на сябе, накрыўся і кінуўся ў хату. За дымам было нічога не відаць, добра, што ведаў, дзе шукаць гаспадара. Той ляжаў на ложку амаль беспрытомны, а над ім ужо гарэла столь. Хвіліна – і ніхто б яму ўжо не дапамог. А Сашка справіўся, выратаваў чалавеку жыццё, рызыкуючы сваім. Думаеце, не баяўся, не рызыкаваў? Было і гэта. Але на першае месца ён паставіў жыццё іншага чалавека. Думаю пра гэта, а ў самога наварочваюцца слёзы, і да горла падкатвае горкі ком. Ад радасці, што ёсць такія людзі, і што яны з Квачоў. Не скажу, што я вельмі добра ведаю Сашку. Звычайны малады, спрытны мужчына. Можа, дзе лішняга і выпіць, можа, і не ўсё ў яго добра складаецца ў жыцці, але тое, што ён зрабіў, на не зводзіць усе яго недахопы. У маіх вачах робіць найвялікшы гонар не толькі яму, але бацькам і дзядам, што далучыліся да яго выхавання.

## Квачам

Хай кажуць, што ўсяк кулік балота сваё хваліць,
Я згодзен, з тым спрачацца не хачу.
Але, як не хваліць, што маці з малаком сваім нам далі,
Я пра свае Квачы сказаць хачу.

Пра вёску, дзе ўзрастаў ты чалавекам,
Дзе зведваў свет і страты пачуццё,
Пра дух змагарны нашае грамады,
Пра тую, што нас вывела ў жыццё.

Для нас “што Квач?” – зусім то не абраза,
Між прозвішчаў другіх – ярчэйшы след.
Яно для нас нароўні слоў высокіх.
Такіх, як бы Радзіма, маці, хлеб.

Каб заслужыць пахвал “Квачы Квачамі,”
З нас кожны пяўся ва ўсім лепшым стаць:
У рабоце, у вучобе, між людзямі,
І мы імкнуліся дэвіз свой апраўдаць.

Браты, сябры, знаёмыя, суседзі,
Прабачце, што вас мусіў пакідаць.
Такіх надзейных, дружных, шчырых,
Гатовых у бядзе мне спачуваць.

І сёння я даю наказ грунтоўны
Квачоўскім самавітым “уцекачам”:
Удзячны будзьце вы зямлі, што ўзгадавала,
У свеце між людзей нясіце славу вы Квачам!

*Пачата 2 студзеня 2016 г.*
*Закончана 11 лютага 2016 г.*

# Змест

*Прадмова* ....3
**Квачы Квачамі** ...............4
Першыя ўспаміны ............5
Чарцянё курносае .............7
Наш правадыр ................13
Юрачка ............................19
Аэліта ..............................20
Школа ў Тумашах
і Карабах .........................22
Ваўкоўская школа ..........22
Вясковы быт ...................27
Дзіцячыя забавы .............33
Што Бог паслаў ..............37
Шалы і штукі ..................43
Лекі без аптэкі ................46
Не хлебам адзіным… .....48
Роды і мянушкі ...............56
Вяселлі ............................59
На Купала ночка мала ....63
Танцы .............................64
А каб кароўка
не прапала! ......................65
У чарзе за… калам .........67
Працадзень мой,
працадзень, зноў у сра..у
цэлы дзень! .....................68
Небяспечны асфальт ......71
Нявыдуманыя гісторыі,
або шафа
з “пераценёнага” ............72
Усубынскі з’езд .............74
На сяло ............................76
Сілачом стаяў дуб
разложысты і здалёк віднеў
пышны верх яго ..............78
Персаналіі
Янэчык ........................81
Казюк ..........................84
Хам .............................85
Зымон .........................87
Віля .............................88
Геня – квачоўскі
Мічурын .....................99
Няхай спачываюць
у супакоі вечным ..........100
Квачы Квачамі .............101
Квачам ......................103